WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 КАСТРЫЧНІКА 2009 г.
СУБОТА
№ 192
(26550)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Сяргей СУШКО, намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

## «ПАВЫШЭННЕ ТАРЫФАЎ НЕАБХОДНА ЗВЯЗАЦЬ З ДАХОДАМІ НАСЕЛЬНІЦТВА»

**У Беларусі пачаўся чарговы ацяпляльны сезон. «Батарэйны» сезон сёлета пачаўся значна раней, чым летась, калі абагрэў у кватэрах уключылі толькі напрыканцы кастрычніка.**

Цяпер камунальнікі нават не сталі чакаць вызначаных па нарматыве пяці дзён, калі сярэднясутачная тэмпература на дварэ стабільна складае менш чым 8 градусаў. Аднак Мінжылкамгас усё ж узгадніў мясцовым уладам падключэнне ацяплення — спачатку на аб'ектах сацыяльнай сферы (для якіх нарматыў складае 10 градусаў), а пасля і ў жылфондзе. Як заўважыў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Сяргей Сушко, такое рашэнне звязана з тым, што ўжо ў найбліжэйшы час чакаецца рэзкае пахаладанне, у асобных рэгіёнах — нават начныя замаразкі.

СТАР. 5

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «КРАІНЫ СНД ПАВІННЫ ЗНЯЦЬ УСЕ БАР'ЕРЫ, ШТО ЗАСТАЛІСЯ ВА ЎЗАЕМНЫМ ГАНДЛІ»



Фота БЕЛТА.

**Краіны СНД павінны зняць усе бар'еры, што засталіся ва ўзаемным гандлі, выключыўшы прымяненне пратэкцыяніслцкіх мераў. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Кішынёве, выступаючы на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД.**

Беларусь ініцыявала разгляд на ўзроўні лідараў краін СНД пытання аб прыняцці сумесных мераў па пераадоленні наступстваў сусветнага крызісу. Негатыўныя тэндэнцыі ў сусветнай эканоміцы прывялі да значнага зніжэння тавараабароту паміж краінамі Садружнасці, падзення тэмпаў росту эканомік, скарачэння рабочых месцаў. «Мы не можам дазволіць сабе раскошу ігнараваць існуючую сітуацыю і марудзіць з прыняццем сумесных мераў», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Да таго ж у Садружнасці ўжо ёсць станоўчыя прыклады такога ўзаемадзеяння, але ў двухбаковым фармаце. Так, Беларусь разам з Расіяй і Украінай распрацавала і ўжо выконвае сумесныя антыкрызісныя праграмы. «Упэўнены, што наша першачарговая задача ў гэтай сітуацыі — зняць усе бар'еры, якія засталіся ва ўзаемным гандлі, выключыўшы прымяненне пратэкцыяніцкіх мераў», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

На думку беларускага боку, зацвярджэнне плана па рэалізацыі сумесных мераў па пераадоленні наступстваў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу на 2009—2010 гады будзе садзейнічаць вырашэнню гэтай задачы і запатрабуе ад усіх дзяржаў — удзельніц СНД — дзейсных крокаў у гэтым напрамку. Асабліва актуальныя такія меры, як устараненне міждзяржаўных бар'ераў ва ўзаемным гандлі і правядзенне скаардынаванай абароны ўнутраных рынкаў ад нядобрасумленнай канкурэнцыі з боку суб'ектаў гаспадарання трэціх краін.

Прэзідэнт таксама выказаў пазіцыю Беларусі па вынесеных на абмеркаванне кіраўнікоў дзяржаў пытаннях, якія датычацца 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і ветэранаў ВАВ. Аляксандр Лукашэнка выступае катэгарычна супраць спроб перапісаць гісторыю вайны, паставіць пад сумненне яе прычыны і вынікі, прынізіць подзвіг савецкага салдата. Ён выказаў надзею, што пры прыняцці рашэння па гэтых пытаннях не ўзнікне ніякіх рознагалоссяў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка чакае сур'ёзных зрухаў у адносінах з Украінай у найбліжэйшыя паўтара-два месяцы. Аб гэтым ён заявіў на сустрэчы ў Кішынёве з кіраўніком украінскай дзяржавы Віктарам Юшчанкам.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння не ўдасца прадметна пагутарыць па многіх тэмах, якія наспелі, і прапанаваў дамовіцца аб сустрэчы ў найбліжэйшы час, каб абмеркаваць усе пытанні.

Напярэдадні гэтай сустрэчы прэм'ер-міністры дзвюх краін дэталёва абмяркуюць усе праблемы ў двухбаковых адносінах, што, на думку кіраўніка беларускай дзяржавы, дасць магчымасць Беларусі і Украіне пайсці далей.

Аляксандр Лукашэнка перадаў цёплыя прывітанні ўкраінскаму народу і пажадаў яму лепшай долі. «Ні наш, ні ваш народ не заслугоўвае таго, што адбываецца цяпер, не мы ініцыятары таго бязладдзя і праблем, якія існуюць у свеце. Мы трапілі пад уплыў гэтага», — сказаў беларускі лідар. «Але вы правільна сказалі на саміце ў тым жорсткім кантэксце, у якім праходзіла размова, што мы выйдзем з крызісу, і выйдзем больш моцнымі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Віктара Юшчанкі.

СТАР. 2

## Пленэр на Юравай гары



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Карэнная жыхарка Крэва Ніна Юльянаўна ЯБЛОНСКАЯ.

Працяг тэмы на 3-й стар.

## ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ Ў ВЕРАСНІ ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ

Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі ў нацыянальным вызначэнні павялічыліся за дзевяць месяцаў гэтага года на 546,2 мільёна долараў ЗША да 4208,4 мільёна долараў, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч. У верасні міжнародныя рэзервовыя актывы краіны ў нацыянальным вызначэнні выраслі больш як на 7 працэнтаў, ці на 278,5 мільёна долараў. На пачатак кастрычніка найбольшую ўдзельную вагу ў структуры міжнародных рэзервовых актываў займалі рэзервовыя актывы ў замежнай валюце — 2516,7 мільёна долараў ЗША, а таксама каштоўныя металы і камяні — 1025,8 мільёна. Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, разлічаныя па методыцы МВФ, павялічыліся за дзевяць месяцаў на 816,4 мільёна долараў (на 26,7 працэнта) да 3877,5 мільёна долараў. За верасень яны ўзраслі на 11,7 працэнта, ці на 407,1 мільёна долараў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## БЕГ ПРАЦЯГЛАСЦЮ Ў 16 ГАДОЎ

**Воінскі абавязак для беларускага дэзерціра абярнуўся доўгімі і бессэнсоўнымі блуканнямі па лясах і хутарах.**

— На пачатку 90-х радавы Трэнькаў збег з адной з расфарміраваных вайсковых часцей Полацкага гарнізона, — паведаміў Віцебскі міжгарнізонны ваенны пракурор Уладзімір АЛІЗАРЧЫК. — На працягу пяці гадоў, ухіляючыся ад службы, ён хаваўся ў лясах паблізу горада Шчучына. У 1998 годзе работнікі міліцыі затрымалі яго ў доме ў роднай маці.

Малады чалавек заявіў, што ён па сваім псіхічным стане не можа служыць у арміі. А з часцей збег, бо не мог вытрымаць здзекаў ад саслужыўцаў. Падчас следства яго паказанні не пацвердзіліся. Дэзерціра прыгаварылі да трох гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання прысуду на 2 гады. Дазнаўшыся, што Віцебская ваенная пракуратура апратэставала прыгавор суда і дамагаецца перагляду справы, хлопец, спужаўшыся павышэння адказнасці, зноў збег. Паводле слоў Уладзіміра Алізарчыка, гульня ў кошкі-мышкі доўжылася яшчэ 10 гадоў. Затрымалі яго толькі сёлета напрыканцы жніўня ў вёсцы Мыта Лідскага раёна. Міжгарнізонны ваенны суд перагледзеў справу 35-гадовага дэзерціра і адпусціў яго, бо тэрмін даўнасці прыцягнення яго да крымінальнай адказнасці скончыўся.

— Я лічу, што Трэнькаў сам сябе пакараў тым, што лепшыя гады свайго жыцця пражыў у страху, — адзначыў Віцебскі ваенны пракурор. — Бегаць 16 гадоў па лесе, начаваць у зямлянках, замест таго, каб, як усе, выканаць свой, не такі ўжо і доўгі, грамадзянскі абавязак... Ці каштавала гэта таго?..

## Асуджаны мінчанін, які закапаў свайго крэдытора на тэрыторыі былога дзіцячага садка

**Пра гэта «Звяздзе» паведаміў старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей БАЛЫШАЎ.**

— Усё пачалося з таго, што ў 2001 годзе злачынца 1966 года нараджэння пазычыў у сваёй ахвяры 1725 долараў. Пры гэтым дагавор займу мужчыны засведчылі ў натарыуса. Так атрымалася, што даўжнік не змог у вызначаны тэрмін вярнуць усю суму. Ён вяртаў доўг па частках. Крэдытор жа настойліва тэлефанаваў яму дадому і патрабаваў вярнуць усе грошы. 15 мая 2003 года крэдытор прыйшоў на працу да свайго даўжніка. Апошні ахоўваў памяшканне былога дзіцячага садка на вуліцы Аэрадромнай. Там паміж імі разгарэлася сварка, якая перарасла ў бойку. Вартаўнік нанёс свайму госцю чатыры ўдары па галаве кухоннай сякерай. Пасля гэтага закапаў труп на тэрыторыі былога дзіцячага садка, а сляды крыві замазаў.

Паводле слоў Сяргея Балышава, на злачынцу ўдалося выйсці толькі летась. Ён цалкам прызнаў сваю віну, паказаў месца, дзе закапаў труп. Судовая калегія прыгаварыла яго да 6 гадоў і 6 месяцаў пазбаўлення волі. Падчас вынясення прысуду прыняты да ўвагі той факт, што забойца раскаяўся ў здзейсненым і дапамог у раскрыцці злачынства.

**Надзея ДРЫЛА.**

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество
«Сберегательный банк «Беларусбанк»,
расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 20 ОКТЯБРЯ 2009 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении Положения о службе ревизий.
3. О внесении дополнений и изменений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 17 октября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 20 октября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – 17 октября 2009 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 73.**

УНП 100325912.

Міністр культуры Павел ЛАТУШКА:

## «УЧОРА НА НОЧ ЧЫТАЎ ШЫЛЕРА Ў ПЕРАКЛАДЗЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ...»

*Першае вялікае інтэрв'ю на пасадзе міністра Павел Латушка даў «Звяздзе»*



**«У беларускай мове я лічу дзейсным ісці шляхам уласнага прыкладу: шанаваць слова, размаўляць на мове»**

**Павел Латушка быў прызначаны міністрам культуры чатыры месяцы таму. Журналісты ўжо паспелі назваць яго «першым беларускамоўным міністрам» і «самым маладым міністрам». На спадара Паўла сапраўды ўскладзена шмат спадзяванняў — што пры ім беларуская мова і культура зойме больш годнае месца ў жыцці грамадства, чым цяпер. Што іншыя чыноўнікі міністэрства возьмуць прыклад са спадара міністра — і загавораць па-беларуску...**

**Што-нішто з гэтага з Паўлам ЛАТУШКАМ абмеркаваў спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб ЛАБАДЗЕНКА напярэдадні Дня работнікаў культуры, які адзначаецца ў другую нядзелю кастрычніка.**

### «Неабходна пашырэнне прыватнай ініцыятывы ў сферы культуры»

— Дазвольце, пакуль вы не задалі пытанне, павіншаваць з надыходным Днём работнікаў культуры ўсіх работнікаў культуры і мастацтва нашай краіны за іх высакародную працу, духоўнасць, ідэі дабра і гуманізму, якімі яны напаўняюць свет, сэрцы і душы людзей. Шчырая ўдзячнасць гэтым светлым і самаадданым людзям, — пачаў нашую гутарку Павел Латушка.

***— Спадар Павел, ці лёгкае міністэрства дасталося вам у кіраванне?***

— Мяркуйце самі: так атрымліваецца, што сфера культуры — адна з найбольш шырокіх у грамадстве. Фактычна мы з вамі штодня сутыкаемся з культурай: ходзім у тэатры, глядзім кіно па тэлебачанні ці ў кінатэатрах, наведваем музеі, слухаем музыку па радыё, чытаем кнігі... Сфера культуры ў Беларусі — гэта дзейнасць дзясяткаў тысяч устаноў (дзяржаўных і недзяржаўных), грамадскіх аб'яднанняў, правядзенне розных мерапрыемстваў (міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных), творчасць кампазітараў, выканаўцаў, мастакоў, рэжысёраў, навукоўцаў... Культура — надзвычай жывы арганізм, які дынамічна развіваецца і, такім чынам, пастаянна нараджае рознага кшталту супярэчнасці. Культура — гэта душа чалавека, а працаваць, прабачце за гэта слова, з душой, укладаць у яе пачуцці, дабро і шчырасць, павагу і цеплыню, разуменне таго, што не хлебам адзіным жыве чалавек, — ці гэта лёгкая справа?

СТАР. 6

## У НАЦЫЯНАЛЬНЫМ МАСТАЦКІМ МУЗЕІ ВАЎКІ РАЗАДРАЛІ КАЗУЛЮ

*Выстава Сяргея Плыткевіча «Дзікае жыццё ў цэнтры Еўропы» перайначыць вашыя ўяўленні пра беларускую прыроду*

**У Нацыянальным мастацкім музеі — нашэсце дзікіх жывёлаў. Калі вам страшна глядзець, як ваўкі рвуць на часткі жывую казулю, як агромністая сава ляціць проста вам у твар ці як дзік прыцэльваецца, куды б лепш засадзіць вам свае іклы — не хадзіце туды. Усіх астатніх фатограф Сяргей Плыткевіч запрашае на выставу «Дзікае жыццё ў цэнтры Еўропы». Такой Беларусь мы яшчэ не бачылі.**

Прагледзеўшы выставу, я запытаўся ў кулуарах у спадара Сяргея:

***— Вам не падаецца правакацыйнай і двухсэнсоўнай назва выставы — «Дзікае жыццё ў цэнтры Еўропы»?***

— Не проста не падаецца, гэта зроблена спецыяльна — каб яна прыцягвала ўвагу да выставы і да аднайменнай кнігі, якая выйдзе літаральна праз тыдзень. Але гэта не проста назва. Так сталася, што свой цэнтр Еўропы ёсць у Беларусі, ёсць у Літве, ёсць у Польшчы, ёсць у Славакіі, ва Украіне, у Латвіі. І паўсюль вы знойдзеце пункты, якія так і пазначаныя: «Цэнтр Еўропы». Гэтыя краіны лічаць, што яны знаходзяцца ў цэнтры Еўропы. І мы, беларусы, лічым, што мы знаходзімся ў цэнтры Еўропы. Я лічу, што гэта нармальная абсалютна з'ява! Гэта ўжо дэталі, што вымяраліся гэтыя цэнтры па-рознаму: хто да падножжа Уральскіх гор мераў, хто да хрыбта, хтосьці ўлічваў мора, хтосьці толькі сушу... Тым не менш, сам факт, што такіх «цэнтраў» многа, сведчыць пра тое, што мы аднолькавыя. Што беларусы, літоўцы, палякі, украінцы — усе мы хочам быць у цэнтры. І гэта нармальна! А птушкі і жывёлы, якія жывуць у лясах і на балотах — яны не прызнаюць чалавечыя межы.

***— Часам даводзіцца чуць клішэ, што Беларусь — гэта «цуд некранутай прыроды». Ці моцна вам давялося напружыцца, каб знайсці ў нас сапраўды дзікую прыроду?***

— Якраз не. З аднаго боку, у нас, як і паўсюль, XXI стагоддзе — і дзейнасць чалавека зрабіла моцны ўплыў на прыроду. Тая ж меліярацыя Палесся змяніла тамтэйшую флору і фаўну да непазнавальнасці... З іншага боку, у нас можна плысці па рэчцы, спыніцца ў любым месцы, распаліць вогнішча, адпачыць. У той жа Польшчы ці Нямеччыне каля любога возера будзе абсталяваная спецыяльная пляцоўка для кемпінгу, стаяць прыбіральні, часам нават ёсць электраразеткі. Гэта файна, але сучасны гарадскі чалавек прагне сапраўднай, некранутай прыроды!..

СТАР. 6



белагропромбанк
традиции будущего

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2009 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 234 503,4 | 185 638,0 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 167 425,5 | 256 649,2 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | 590 950,0 | 399 510,2 |
| | для торговли | 11031 | 3 | – | – |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | 5,5 | 4,6 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | 590 944,5 | 399 505,6 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 91 431,8 | 97 477,8 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 16 891 365,4 | 10 854 943,8 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 55 575,3 | 16 905,6 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 446 726,9 | 320 560,9 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 124 240,8 | 48 987,1 |
| **10** | **ИТОГО активы** | **110** | | **18 602 219,1** | **12 180 672,6** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 2 779 402,3 | 985 023,6 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 3 159 109,1 | 1 848 069,5 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 7 849 289,1 | 6 671 145,7 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 178 453,9 | 235 651,9 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 161 156,3 | 97 288,7 |
| **17** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **14 127 410,7** | **9 837 179,4** |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 3 828 633,5 | 1 878 634,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | – | – |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 85 500,1 | 41 861,8 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 334 171,0 | 246 810,2 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 226 503,8 | 176 187,2 |
| **24** | **ВСЕГО капитал** | **121** | | **4 474 808,4** | **2 343 493,2** |
| **25** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **18 602 219,1** | **12 180 672,6** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 15 661 913,7 | 10 040 332,1 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 2 492 320,2 | 2 325 148,8 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2009 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 1 528 428,4 | 686 546,4 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 1 051 877,8 | 472 122,7 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 476 550,6 | 214 423,7 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 173 252,1 | 135 095,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 24 342,3 | 12 421,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 148 909,8 | 122 674,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | (-104 089,2) | 70 356,2 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | (-152,7) | 138,1 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 145,2 | 280,6 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 209 072,0 | 46 962,6 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 207 511,0 | 20 137,6 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 283 754,2 | 216 891,6 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 47 426,5 | 35 198,0 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 69 247,4 | 38 322,0 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 119 374,6 | 90 636,2 |

**Председатель Правления** — **С.Н. Румас**

**Главный бухгалтер** — **М.А. Шаповалова**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

*ОАО «Белагропромбанк».
Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 22.07.2009 г. № 2 УНП 100693551.*

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2009 г. (для б/н разлікаў)*

▲1 долар ЗША..................2 742,00
▼1 еўра..............................4 040,89
1 латвійскі лат ................5 694,11
1 літоўскі літ....................1 169,12
1 чэшская крона ................156,03
1 польскі злоты .................947,40
▲1 расійскі рубель.................92,61
1 украінская грыўня ..........332,06

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

USD................. 29,6090
UAH................. 35,6735
1000 BYR......... 10,7983
EUR................. 43,6052

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

## Сапраўдны мужчына ў 10 гадоў

У аднапакаёвай кватэры на першым паверсе шматкватэрнага дома ў Калінкавічах ноччу пачаўся пажар. Віноўнікам здарэння стаў дзядзька чатырох хлапчукоў, малодшаму з якіх 4 гады. Мужчына прыйшоў да сваякоў нападпітку. Як водзіцца, паліў цыгарэту і заснуў. Маці дзяцей у гэты момант дома не было. Старэйшы з хлапчукоў, 10-гадовы Коля Лазько, каля дзвюх гадзін ночы прачнуўся ад дымнага смуроду, разбудзіў дзядзьку, які адразу збег з месца здарэння. А хлапчук спачатку вывеў з памяшкання сваіх малодшых братоў, спрабаваў тушыць пажар сам, а потым пабег па паверхах будзіць суседзяў. Выратавальнікі эвакуявалі 30 жыхароў пад'езда, з іх 13 дзяцей.



**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Яблыкі забяруць. З задавальненнем і ў найбліжэйшыя дні

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Пытанне, якое задала па «гарачай лініі» жыхарка пасёлка Міханавічы Мінскага раёна Валянціна Аляксееўна Жуковіч, нас вельмі здзівіла. 70-гадовая жанчына заявіла, што ў іх у пасёлку не прымаюць... яблыкі. Маўляў, звярталася да нарыхтоўшчыка, ён некалькі разоў абяцаў забраць плады, ды нешта ўсё ў яго не атрымліваецца. На жаль, суразмоўніца не змагла дакладна сказаць, да каго ж канкрэтна звярталася са сваёй просьбай. А само пытанне здзівіла таму, што сёлета, як вядома, не вельмі спрыяльны год на плады, падавалася б, нарыхтоўшчыкі павінны «біцца» за кожнага здатчыка...**

— А ў мяне так званыя таварныя яблыкі, магла б здаць кілаграмаў 200—250. У сваццi таксама яблыкі ёсць, думаю, і яна прыкладна столькі ж магла б здаць, — даводзіла нам Валянціна Аляксееўна.

— Сёлета сапраўды такое пытанне нават паўстаць не магло: мы прымаем ад насельніцтва яблыкі без праблем. Іншая справа, што да нас, а ад таварыства ў пасёлку працуюць дзве крамы, ніхто з такой просьбай не звяртаўся. Нарыхтоўкамі ж займаемся не толькі мы, а, напрыклад, яшчэ індывідуальныя прадпрымальнікі, іншыя нарыхтоўчыя арганізацыі, — паведаміў рэдакцыі **старшыня праўлення Мінскага раённага спажывецкага таварыства Алег ВАЙЦЯНКОЎ.** — Двойчы на месяц мы размяшчаем аб'явы аб прыёмцы тых жа яблыкаў, даём наш нумар тэлефона, каб можна было дамовіцца наконт транспарту. Спецыяльна, вядома, выязджаць па невялікія партыі нявыгадна, але калі чалавек згодны пачакаць максімум два-тры дні, машына, што будзе ісці ў спадарожным кірунку, абавязкова забярэ тую колькасць яблыкаў, што гатовы здаць вясковец. На жаль, людзі, напэўна, не заўсёды заўважаюць такія абвесткі, адсюль і ўзнікаюць падобныя пытанні.

Як дадаў затым Алег Васільевіч, з нашай чытачкай праведзены перамовы, яна пацвердзіла, што можа здаць 150—200 кілаграмаў таварных яблыкаў. Літаральна на працягу найбліжэйшых некалькіх дзён па іх заедзе машына ад спажывецкага таварыства. Яблыкі прымуць па 1,5 тысячы рублёў за кілаграм.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АБАМА АТРЫМАЎ НОБЕЛЕЎСКУЮ ПРЭМІЮ МІРУ



**Прэзідэнт ЗША Барак Абама стаў лаўрэатам Нобелеўскай прэміі міру за 2009 год. Узнагарода прысуджаная яму з фармулёўкай «за велізарныя намаганні па ўмацаванні міжнароднай дыпламатыі і супрацоўніцтва паміж народамі».**

Барак Абама — 44-ы прэзідэнт ЗША і першы афраамерыканец на гэтай пасадзе. Узначаліўшы Злучаныя Штаты, ён паабяцаў адмовіцца ад ранейшай аднабаковай знешняй палітыкі і выказаў гатоўнасць клапаціцца аб інтарасах не толькі ЗША, але і ўсіх краін свету. Ён, акрамя таго, заявіў, што гатовы да перамоў з такімі краінамі, як Іран, з якім ЗША ўжо трыццаць гадоў не падтрымліваюць дыпламатычных адносінаў. Адным з найважнейшых пунктаў яго перадвыбарнай праграмы было завяршэнне ваеннай кампаніі ў Іраку.

### ЗОНД-КАМІКАДЗЭ ЎРЭЗАЎСЯ Ў МЕСЯЦ

**Апарат Амерыканскага касмічнага агенцтва NASA LCROSS разбіўся аб паверхню Месяца.**

Верхняя прыступка ракеты-носьбіта зонда Centaur стукнулася аб паверхню зямнога спадарожніка ўчора ў 14:31 па беларускім часе ў раёне кратара Кебеус. У выніку ўдару з кратара быў выкінуты пыл, які знаходзіўся ў жарале, і які цяпер даследуюць іншыя апараты. Вышыня слупа пылу склала дзевяць кіламетраў. Мэта даследаў — высветліць, ці ёсць (была) на Месяцы вада.

### АВІЯБОМБЫ Ў МЕТАЛАЛОМЕ

**У горадзе Чырванаградзе Львоўскай вобласці ў металаломе было знойдзена дзевяць авіябомбаў часоў Другой сусветнай вайны.**

Бомбы былі знойдзеныя падчас міліцэйскай праверкі мясцовага пункта металалому, размешчанага на тэрыторыі бетоннага завода. Знаходкі былі вывезеныя з горада. Як яны патрапілі ў пункт прыёму металалому, вызначыць не атрымалася.

### ПАМЁР «ЯПОНЧЫК»



**Вядомы «аўтарытэт» крымінальнага свету Вячаслаў Іванькоў («Япончык») памёр у прыватнай медыцынскай клініцы на Кашырскай шашы. Ён так і не змог акрыяць ад раненняў, атрыманых у выніку замаху.**

Замах на Іванькова быў здзейснены ўвечары 28 ліпеня, калі ён выходзіў з рэстарана. «Злодзей у законе» атрымаў раненне ў жывот са снайперскай вінтоўкі. Версій замаху было некалькі, самая верагодная тая, што замах на «Япончыка» стаў наступствам яго актыўнага ўдзелу ў канфлікце двух мафіёзных кланаў — «законнікаў» Тарыела Аніяні і Аслана Усаяна.

# «КРАІНЫ СНД ПАВІННЫ ЗНЯЦЬ УСЕ БАР'ЕРЫ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У сваю чаргу кіраўнік украінскай дзяржавы падкрэсліў, што Украіна выходзіць з той пазіцыі, што адносіны з Беларуссю — добрасуседскія, знакавыя. На яго думку, яны маюць патрэбу ў сур'ёзным развіцці і ўдасканаленні. Віктар Юшчанка таксама выказаў надзею, што падчас сённяшняй размовы бакі прыйдуць да ўзаемапрымальных рашэнняў.

Беларусь і Малдова могуць значна пашырыць эканамічнае супрацоўніцтва, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з часова выконваючым абавязкі Прэзідэнта Малдовы, старшынёй парламента Міхаем Гімпу.

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь і Малдова ў ранейшыя часы заклалі добрую аснову супрацоўніцтва, якую неабходна развіваць. Ён запэўніў, што ў дзвюх краін па самых адчувальных момантах супрацоўніцтва праблем не будзе. «Нашы эканомікі ўзаемадапаўняльныя і па самых вострых пытаннях не перасякаюцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў найбліжэйшы час будуць зняты праблемы з транспарціроўкай грузаў праз Украіну. Аб гэтым ішла размова на сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Украіны, якая адбылася ў Кішынёве пасля пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД. «Мы ўтрох зможам вырашыць любыя праблемы. Калі зняць усе пытанні, што знаходзяцца на парадку дня, мы зможам значна рушыць наперад у нашых адносінах», — упэўнены беларускі лідар.

У сваю чаргу Міхай Гімпу адзначыў вялікія перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва і развіцця эканамічных сувязяў.

Краіны СНД не павінны дапусціць сваёй раз'яднанасці. Аб гэтым заявіў у Кішынёве пасля завяршэння саміту СНД Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў беларускага лідара, усе ўдзельнікі саміту сышліся на думцы, што неабходна думаць аб тым, як краінам СНД жыць разам і не дапусціць раз'яднанасці. Аляксандр Лукашэнка таксама лічыць, што СНД павінен заставацца як пляцоўка для перагавораў. «Няхай дрэнна, няхай нешта не вырашаецца, няхай проста абмяркоўваем, але гэта пляцоўка для перагавораў, яна адзіная на постсавецкай прасторы, яе трэба захаваць», — упэўнены беларускі лідар. Ён дадаў, што «ніхто не выказваўся за спыненне супрацоўніцтва».

Падводзячы вынікі саміту, Прэзідэнт сказаў, што адбылася вострая, жорсткая размова. Цяжка фарміраваўся парадак дня саміту. Сітуацыю ратавала Беларусь, унёсшы пытанне аб сумесным пераадоленні наступстваў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. «Штыкі скрыжавалі на гэтым пытанні», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён нагадаў, што год таму ўрадам было даручана распрацаваць адпаведныя меры, аднак год прайшоў — і ніякага выніку. «Ужо, кажуць, крызіс завяршаецца, а мы ўсё вядзём размовы аб тым, як павысіць, вывучыць, інфармаваць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ён задаў пытанне міністру фінансаў РФ: чым канкрэтна Расія, у якой вялікія рэзервы, можа дапамагчы краінам СНД.

Аляксандр Лукашэнка сказаў таксама, што Расія апелюе тым, што выступае на баку Беларусі пры выдзяленні крэдытаў МВФ. «А атрымалася так, што МВФ сёння выдзяляе крэдыт з улікам таго, што нам выдзяляе Расія. А цяпер Расія публічна заяўляе, што $500 млн не дадзім. МВФ нам задае пытанне: як жа гэта, мы разлічвалі, што і Расія дасць», — адзначыў Прэзідэнт. «Вось такі момант жорсткай размовы. Думаю, я правільна засяродзіў увагу на гэтым пытанні», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў Прэзідэнта, для Беларусі не прынцыпова, ці прадаставіць Расія абяцаны крэдыт. «Калі дасць — добра, калі не — знойдзем іншыя магчымасці. Але гэта пытанне прынцыпу — калі паабяцалі, то трэба даваць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

На саміце было таксама закранута пытанне бар'ераў у гандлі і мераў пратэкцыянізму. «Упісваем пункт: ніякіх бар'ераў, ніякага пратэкцыянізму. Дык у нас з Расіяй бар'еры і пратэкцыянізм. Калі гэтыя пытанні будуць вырашаны?» — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што на саміце «моцна выступіў Віктар Юшчанка, яго аргументацыя была вельмі пераканаўчая». Паводле слоў беларускага лідара, галоўнай думкай выступлення Віктара Юшчанкі было тое, што ні Беларусі, ні Украіне не былі б патрэбны крэдыты, калі б была створана зона свабоднага гандлю. Краіны маглі б самастойна зарабіць неабходныя сродкі. У такім жа ключы выступілі Таджыкістан і Азербайджан.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ўдзельнікі саміту сышліся на думцы, што праблем ва ўсіх дзяржаў дастаткова, аднак калі краіны адзіныя, то павінны дзейнічаць у адным ключы.

**БЕЛТА.**

## ГАРЭЎ ВАГОН ЭЛЕКТРЫЧКІ

**Пасажырам электрычкі Пухавічы — Мінск у чацвер позна ўвечары давялося пакінуць электрацягнік з-за пажару ў адным з вагонаў.**

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Настасся Клебан, здарэнне было зафіксавана каля 23 гадзін непадалёк ад прыпыначнага пункту Вендзеж — за 700 метраў ад яго. У МНС паступіў трывожны сігнал ад дзяжурнай па станцыі Пухавічы, што загарэўся другі вагон электрычкі. Выратавальнікі, якія ў хуткім часе прыбылі на месца здарэння, сапраўды ўбачылі шчыльны дым у вагоне. Як высветлілася, гарэў уцяпляльнік на даху вагона. Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай загарання мог стаць падпал: так гэта ці не цяпер высвятляюць супрацоўнікі кампетэнтных службаў. У выніку гэтага здарэння быў затрыманы рух двух прыгарадных і аднаго міжгародняга цягнікоў.

**Ігар ГРЫШЫН.**


**РУП «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 20 октября 2009 г. в 11.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 состоится ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего ликвидируемому предприятию ОАО «Весоприбор», в составе следующих лотов:**

| | |
|---|---|
| Лот № 1 | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе:<br>- кап. строение с инв. № 710/С-58314 (здание цеха сварных конструкций) пл. 2039,1 кв.м, с сооруж.: забор (ж/бет) пл. 28 м², забор (ж/бет) пл. 113 м², забор (кирпич) пл. 87 м², ворота (метал) пл. 15 м², мощение (бетон) пл. 221 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54309 (здание склада ГСМ-2) общей площадью 12,4 кв.м;<br>- кап.строения с инв. № 710/С-54311 (канализационная сеть);<br>- кап.строение с инв. № 710/С-54310 (водопроводная сеть) протяженностью 23,1 м;<br>- в том числе: оборудование КТП 10/04-1 х 630 (инв № 1589), кран-балка г/п 3 т (инв № 752, 753, 782, 783), таль эл. г/п 2 т (инв № 1593), таль эл. г/п 3,2 т (инв № 1594), таль эл. г/п 5 т (инв № 1866, 1867). |
| Лот № 2 | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе:<br>- кап. строение с инв. № 710/С-58317 (здание заготовительно-штамповочного цеха) пл. 1148,9 кв.м, с сооруж.: забор (ж/бет) пл. 12 м², забор (кирп) пл. 135 м², забор (метал. сетка) пл. 92 м², ворота (метал) пл. 11 м², калитка (метал) пл. 2 м², мощение (асф/бет) пл. 326,75 м²; пути подкрановые;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-51530 (здание склада ГСМ) общей площадью 118,1 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54307 (здание склада) общ. пл. 81,6 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54308 (здание цеха голтовки) общ. пл. 111,7 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54306 (здание трансформаторной подстанции) общ. пл. 30,1 кв.м;<br>- в том числе: оборудование КТП 10/04-1 х 400 (инв № 62), кран-балка г/п 3 т (инв № 184а, 199, 191а), кран-балка г/п 5 т (инв № 485), таль эл. г/п 5 т (инв № 1222, 1223), кран-укосина г/п 0,5 т (инв № 1010). |
| Лот № 3 | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе:<br>- кап. строение с инв. № 710/С-51527 (здание межцехового склада) пл. 516 кв.м, с сооруж.: забор (кирп) пл. 38 м², мощение (асф/бет) пл. 327 м²;<br>в том числе: таль эл. г/п 5 т (инв № 1035). |
| Лот № 4 | Кап. строение с инв. № 710/С-41497 (здание склада материалов и оборуд.) пл. 1 959,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, с сооруж.: подкран. эстак. пл. 656 м², забор (кирп) пл. 187 м², мощение (асф/бет) пл. 654 м². |

| Общие сведения | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 | Лот № 4 |
|---|---|---|---|---|
| Организатор торгов | РУП «Белтехинвентаризация», г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, УНП 190305149 | | | |
| Начальная цена продажи, рублей без НДС | 718 574 050 | 560 911 658 | 169 582 573 | 505 812 426 |
| Размер задатка, рублей | 71 857 410 | 56 091 170 | 16 958 260 | 50 581 240 |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Весоприбор» – р/с 3012000002968 в филиале 703 ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700090810 | | | |
| Площадь земельного участка | 323/400 доли земельного участка площадью 0,5106 га – кадастровый № 741000000009001750, правовой режим – аренда | 0,3418 га, в т.ч.: 0,3365 га – кадастровый № 741000000009001751 и 0,0053 га – кадастровый № 741000000009001746, правовой режим – пост. пользование | 0,1051 га – кадастровый № 741000000009001752, правовой режим – пост. пользование | 0,2399 га – кадастровый № 741000000009001753, правовой режим – пост. пользование |
| Условия продажи | аукцион без условий | | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | | |
| Условия оплаты | определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи | | | |
| Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка | | | по 19 октября 2009 г. включительно | |

***Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» от 29 августа 2009 г.**

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**



**РУП «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 20 октября 2009 г. в 15.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 состоится ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего ликвидируемому предприятию ОАО «Весоприбор», в составе Лота № 1:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование имущества, входящего в состав лота, в т.ч.: капитальные строения (здания, сооружения) | кап. строение с инв. № 710/С-14162 (производственный корпус НМК) общ. пл. 5471,5 м² | - кап. строение с инв. № 710/С-53537 (цех НМК) общ.пл. 2386,2 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-56115 (главный производственный корпус) общ. пл. 3860,5 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-56122 (электросварочный цех) общ. пл. 2934,3 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-41496 (компрессорная станция) общ. пл. 204,8 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-53532 (цех голтовки) общ. пл. 86,3 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-53538 (цех порошковой металлургии) общ. пл. 345,8 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-53526 (гаражи) общ. пл. 166,2 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-56118 (здание электромеханического отделения) общ. пл. 179,5 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-53530 (пристройка к участку ТНП) общ. пл. 352,3 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-56117 (КПП) общ. пл. 28,6 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-56121 (водопроводная сеть) протяженность 567,9 м;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-56140 (канализационная сеть) протяженность 1493,5 м;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54302 (здание РБУ) пл. 55 м²;<br>- ограждение пл. 221 м², ограждение пл. 149 м², ограждение пл. 206 м², ограждение пл. 30 м², ворота механич., ворота пл. 8 м², ворота пл. 11 м², мощение пл. 8130 м², мощение пл. 115 м². | кап. строение с инв. № 710/С-56113 (трансформаторная подстанция) общ. пл. 253,7 м²; |
| Многолетние насаждения | яблоня – 30 единиц, груша, береза, каштан, алыча (инв. № 1320) | | |
| Оборудование | оборудование КТП 630/10 (инв. № 982), оборудование РУ-10Кв с КТП (инв. № 651), кран-балка г/п 1т (инв. № 1046, 1050), кран-балка г/п 3 т (инв. № 1007, 1008, 414), кран укосина г/п 0,5 т (инв. № 1358, 1481, 1482), таль эл. г/п 5 т (1573, 1574), таль эл. г/п 0,5 т (инв. № 1761), таль эл. г/п 0,25 т (инв. № 1515, 1568, 1569, 1571, 1572, 1570, 1274, 1273), пути подкрановые ГБВ 759000 (инв. № 17) протяженность 97 м, подвесной подкрановый путь (инв. № 55) протяженностью 24 м, пути подкрановые (инв. № 62) протяженностью 66 м, монорельсовые пути (инв. № 22) протяженность 12,4 м, монорельсовые пути (инв. № 1439) протяженностью 160 м, теплоприемный пункт (инв. № 33), бетоносмесители 0,75 м³ (инв. № 1810, 1809) | | |
| Адрес | г. Бобруйск, ул. Урицкого, 32 | г. Бобруйск, ул. Дзержинского, 14/1 | г. Бобруйск, ул. Дзержинского, 14 |
| Организатор торгов | РУП «Белтехинвентаризация», г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, УНП 190305149 | | |
| Начальная цена продажи, рублей без учета НДС | 3 378 043 946 | | |
| Размер задатка, руб. | 337 804 390 | | |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Весоприбор» – р/с 3012000002968 в филиале 703 ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700090810 | | |
| Площадь земельного участка, га | 0,3486 га. Кадастровый номер 741000000009001604 Правовой режим – право пост. пользования | 2,2522 га. Кадастровый номер 741000000009001696. Правовой режим – право постоянного пользования | 0,0169 га. Кадастровый номер 741000000006004981. Правовой режим – право пост. пользования |
| Условия продажи | аукцион без условий | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | | |
| Условия оплаты | по договоренности Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи | | |
| Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка | по 19 октября 2009 г. включительно | | |

***Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» от 29 августа 2009 г.**

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30**


## Абзац

◢ **Больш за 130 населеных пунктаў абясточаныя ў Беларусі з-за ветру і навальніцы ў чацвер. Хуткасць ветру дасягала 16 м/сек. Стыхія нанесла ўрон Бераставіцкаму, Гродзенскаму, Шчучынскаму, Вілейскаму і Мінскаму раёнам.**

◢ Жыхарка Баранавічаў выявіла ў сваёй талерцы ртуць, паведамілі БЕЛТА ў Брэсцкім абласным упраўленні МНС. Жанчына заўважыла серабрыстыя шарыкі на дне сваёй талеркі, калі разам з усёй сям'ёй ела суп. Яна звярнулася да выратавальнікаў. Тыя сабралі рэчыва, пацвердзілі, што гэта ртуць. Абставіны з'яўлення ртуці на стале сям'і высвятляе мясцовая міліцыя. Вермішэлевы суп, які людзі елі падчас абеду, быў прыгатаваны з канцэнтрату айчыннай вытворасці. Паўфабрыкат набылі ў адной з баранавіцкіх крамаў.

◢ **Непрацуючы жыхар Мінска ў адной са сталічных залаў гульнявых аўтаматаў прайграў больш за Br2 млн. Ад адчаю 28-гадовы жыхар сталіцы пачаў біць рукамі і нагамі сваіх «крыўдзіцеляў». Яго спынілі супрацоўнікі аддзела аховы, якія прыбылі на спрацоўванне кнопкі трывожнай сігналізацыі. Такім чынам, да сумы пройгрышу дабавіцца яшчэ амаль Br32 млн стратаў, нанесеных установе. Распачатая крымінальная справа.**

## Поўны абзац

◢ Супрацоўнікі службы па ахове жывёлаў амерыканскага штата Каліфорнія канфіскавалі з аднаго дома 77 катоў. Байцы спецназу, што ўварваліся ў адзін з дамоў горада Сакрамента, выявілі дзясяткі катоў у клетках, што былі састаўленыя ад падлогі да столі. Некаторыя жывёліны свабодна хадзілі па памяшканні, а падлога была засыпаная фекаліямі. Паліцыя наклала арышт на дом сямейнай пары, забрала 77 катоў. Раней улады дазволілі сужэнцам трымаць 7 катоў, як гэтага патрабуюць мясцовыя законы.

◢ **У Архангельску затрыманы мужчына, які скраў з аднаго з дамоў на вуліцы Набярэжная Паўночнай Дзвіны сем сцягаў. Затрыманы вярнуў трыкалоры і прызнаўся, што хацеў сшыць з іх коўдру. Сцягі былі скрадзеныя з будынка, дзе размяшчаецца офіс рэгіянальнага аддзялення партыі Справядлівая Расія. Сярод іх былі як дзяржаўныя, так і партыйныя сцягі. Адразу пасля інцыдэнту прадстаўнікі партыі звярнуліся ў міліцыю. Якое пакаранне панясе вінаваты, пакуль не ўдакладняецца.**

◢ П'яны расіянін спрабаваў задушыць міліцыянера ў Карэліі. Інспектар ДПС спыніў на дарозе матацыкліста, які парушыў правілы дарожнага руху. Малады чалавек быў добра «падшафэ» і не меў пры сабе дакументаў. Калі ж парушальнік апынуўся на заднім сядзенні патрульнага аўтамабіля, ён нечакана пачаў душыць інспектара, што сядзеў спераду. На выручку міліцыянеру падаспеў яго калега. Дэбашыра арыштавалі, распачалі крымінальную справу.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***


Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

**11 НОЯБРЯ 2009 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже обращенного в доход государства изолированного помещения (двухкомнатной квартиры), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Д. Сердича, д. 66, кв. 60 (четвертый этаж пятиэтажного жилого дома, общая площадь – 48,0 м², жилая площадь – 30,5 м²). Инвентарный номер – 500/D-241015.**

Начальная цена – 150 057 600 рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 15 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **11 ноября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **12 октября 2009 г. по 9 ноября 2009 г.** в рабочие дни с 9.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефон для справок: (017) 227 40 22. www.mgcn.by.**



**МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 22 ОКТЯБРЯ 2009 ГОДА ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В МИНСКОМ РАЙОНЕ**

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Хатежинский с/с, район деревень Хатежино – Новая Веска | Минский район, район деревень Дегтяревка, Таборы | Минский район, Новодворский с/с, 16 км МКАД | Минский район, Новодворский с/с, вблизи автодороги М-4 Минск-Могилев на 14 км (право) | Минский район, Мачулищанский с/с, г.п. Мачулищи | Минский район, Ждановичский с/с, п. Ратомка | Минский район, Петришковский с/с, д. Петришки | Минский район, Папернянский с/с, д. Семково |
| 2 | Кадастровый номер | 623687500001000100 | 623681700001000357 | 623600000001000154 | 623684300001000329 | 623655500001000303 | 623681708601002213 | 623685707601000618 | 623685500001000418 |
| 3 | Площадь земельного участка | 14,9999 га | 30,0012 га | 10,0000 га | 10,0000 га | 0,5004 га | 0,8501 га | 0,0235 га | 45,2011 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 51 | 51 | 49 | 49 | 51 | 40 | 99 | 99 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства логистического центра | Для строительства логистического центра с комплексом складских сооружений | Для строительства гипермаркета с многофункциональной направленностью | Для строительства гипермаркета с многофункциональной направленностью | Для строительства производственно-складских и технических сооружений для производства изделий медицинского назначения | Для строитель-ства физкультурно-оздоровительного комплекса | Для размещения торгового павильона | Для строительства спортивно-туристического комплекса с объектами соцкультбыта |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | 1 863 552 538 | 3 179 682 753 | 1 435 368 165 | 1 014 340 173 | 8 487 405 | – | – | 2 654 730 955 |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 6 449 085 | 4 006 284 | 4 061 088 | 3 623 656 | 1 827 820 | 2 151 045 | 1 778 727 | 5 887 558 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 359 028,60 доллара США возможно предоставление рассрочки | 718 090,71 доллара США возможно предоставление рассрочки | 1 052 744 доллара США возможно предоставление рассрочки | 1 052 744 доллара США возможно предоставление рассрочки | 35 851,36 доллара США | 33 676,20 доллара США | 803 доллара США | 10 315 381 доллар США возможно предоставление рассрочки |
| 9 | Задаток (рублей) | 60 000 000 | 120 000 000 | 180 000 000 | 180 000 000 | 10 150 000 | 9 540 000 | 200 000 | 2 900 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **22.10.2009 г. в 9.00.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов **16.10.2009 г. в 17.00.** Контактный телефон (8 025) 92 761 92.

Задаток перечисляется на р/с 3641200070048 в Октябрьское отд. в г. Минске ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, код 737, УНП 600068187, получатель Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается не состоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

# ПЛЕНЭР НА ЮРАВАЙ ГАРЫ



Малады жыхар Крэва Аляксей ПЛЁСКА ўстанаўлівае указальнік на пленэр.

У наступным годзе Беларусь адзначыць 625-годдзе Крэўскай уніі. Бадай, адзіны сведка тых далёкіх і гістарычных падзей — Крэўскі замак. З мэтай звярнуць увагу на вёску Крэва (а цяпер гэта яшчэ і аграгарадок) і яе лёсавызначальную ролю ў жыцці краіны ля сцен замка прайшоў першы пленэр фотамастакоў, арганізаваны беларускім грамадскім аб'яднаннем «Фотамастацтва», універсітэтам культуры і мастацтва і Смаргонскім райвыканкамам. Але ініцыятар і куратар праекта — студэнт 4 курса ўніверсітэта, крэўскі жыхар Сяргей Гапон. Пленэр атрымаў назву «Юрава гара» ў гонар старажытнага куточка крэўскай зямлі. Сярод удзельнікаў пленэра былі вядомыя ў краіне майстры святлапісу Віктар Сядых, Сяргей Плыткевіч, Віктар Суглоб, Андрэй Дубіцкі, Сяргей Качаргін і Віталь Раковіч. Нельга сказаць, каб надвор'е дужа спрыяла фатаграфаванню, але маляўнічыя краявіды і помнікі архітэктуры, твары жыхароў Крэва і выпадковых турыстаў — усё ў гэтым месцы набывае асаблівы каларыт і выгляд. І творцы з фотаапаратамі натхнёна стваралі непаўторныя крэўскія вобразы-творы, каб па выніках пленэра стварыць не менш цікавую фотавыставу і паказаць яе ў Беларусі, Літве і Германіі.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**


Крэўскі касцёл «Перамяненне Пана».


Малады мінскі фатограф-аматар Вікторыя ШЧАРБАКОВА.


Сімвал «Юравай гары».




Дудар-пацешнік вулічнага сярэднявяковага тэатра «ДыГрыза» Аляксей БУРНАСЕНКА.


Рэшткі Крэўскага замка.

Кропка на карце

# Сядзіба паміж Глыбокім і Гарэлкамі

Раптам дарога павярнула ўлева, і воку адкрыўся райскі куточак. На самым узгорачку — дом. Крыху паводдаль — сажалка, абапал — стары сад. Ад дома доўгая алея векавых дрэў вядзе, на першы погляд, у невялікі лясок. Але гэта не лес, а рэшткі былога парку, якія змяшаліся з дзікімі зараснікамі. Клёны, дубы, бяроза, елка, конскі каштан і аграмадныя гонкія лістоўніцы. Ніколі не думала, што ў Жабінкаўскім раёне можна сустрэць лістоўніцу. А тут задзярэш галаў — і вяршыні яе не відаць, здаецца, што галіны ідуць да самага неба. Калі прыгледзецца і разабрацца ў гэтым дрэвастоі, то лістоўніцы будуць акурат на ўзлеску — на мяжы двух палянаў. Становіцца зразумела: нехта ўсё тут разумна і абачліва спланаваў. А пасярод паляны раптам натрапляеш на сапраўдны цуд: клён і бяроза зрасліся ў адно, нібы выходзяць яны з агульнага кораня. І такая цішыня вакол на фоне кранутай жаўцізной лістоты, што падаецца, жыццё спынілася. Яно так і ёсць, асабліва для насельнікаў былой панскай сядзібы. Тут зараз знаходзіцца Глыбокаўская бальніца сястрынскага догляду. Але пра гэта крыху пазней.

Марыя Гаўрылаўна Сарока з суседніх Гарэлак кажа: «Паны ведалі, дзе будавацца. Ва ўсёй ваколіцы зямля ўрадлівая. А сядзіба ўзведзена і ўладжана ў такім месцы, што вось табе — гатовы курорт». У Марыі Сарокі і яе аднагодкаў-аднавяскоўцаў свой погляд на гэту сядзібу і свая праўда. Марыя Гаўрылаўна і яе муж Фёдар Пракопавіч нарадзіліся ў сярэдзіне 30-х гадоў. Мясцовага пана яны не памятаюць. І меркаванні наконт гаспадара сядзібы ў вяскоўцаў разыходзяцца. Так, Фёдар Сарока лічыць, што апошнім гаспадаром дома з млячарняй, стайняй і гаспадарчымі пабудовамі быў нехта Пржыбора, які пастаянна жыў у Варшаве, а гаспадарку вёў прызначаны аканом. Іншыя жыхары вёскі згадвалі прозвішчы Вярбіўскіх, Ротаў, Султанаў. Апошняе, дарэчы, значыцца і ў надзвычай скупых афіцыйных звестках. У кнізе Анатоля Федарука «Старадаўнія сядзібы Берасцейшчыны» пра Глыбокаўскі маёнтак сказана так: «Невялікая малавядомая сядзіба...»

Дык вось, Марыя Сарока згадала, што бацькі гаварылі пра гаспадара Глыбокага як пра зусім нядрэннага пана. Пасля верасня 1939 года сядзіба выкарыстоўвалася як школа. А перад нямецкай акупацыяй мясцовай уладай было прынята рашэнне знішчыць фальварак, каб не дастаўся ворагу. Спалілі стайню, абору, амаль усе гаспадарчыя пабудовы. Чаму застаўся дом, зараз ніхто не ўспомніць, мабыць, не паспелі знішчыць. Немцы спачатку абжылі панскія пакоі, але пазней перабраліся ў іншае месца, бо баяліся партызанаў з навакольных лясоў.


Марыя і Фёдар САРОКІ.

Пасля вызвалення ў маёнтку арганізавалі сельскую бальніцу. Тут былі раддом, зубная лякарня і некалькі лячэбных аддзяленняў. Медыцынская ўстанова абслугоўвала 15 вёсак. Цікава, што ў 50-х гадах бальніцу хацелі зачыніць, але людзі яе адстаялі. Пісалі ў Брэст, у Мінск. «Са сталіцы прыязджаў карэспандэнт, — успамінае Марыя Гаўрылаўна. — І бальніцу пакінулі». Праўда, сабралі тады сход, на якім вырашылі сваю лячэбную ўстанову рамантаваць усёй грамадой. Так і зрабілі. Пасля гэтага сельская бальніца верай і праўдай служыла вясковаму люду ледзь не паўстагоддзя. Ішлі гады, паступова скарачалася колькасць ложкаў, спачатку зачынілі раддом, затым — зубаўрачэбны кабінет. Але тэрапеўтычнае аддзяленне жыло доўга. У 70-х гадах памяшканне бальніцы прырасло аптэкай. Прыбудову зрабіў знаёмы нам Фёдар Сарока, вядомы на ўсё наваколле сталяр і цясляр. Як не без гонару заўважыла жонка: «Ён умее зрабіць усё, што толькі вочы бачаць». Дык вось доктар Юрый Цярэнцьевіч — прозвішча сужэнцы Сарокі не ўспомнілі — у знак удзячнасці за добрую прыбудову ўзяў Марыю Гаўрылаўну на працу санітаркай. Там яна працавала некалькі дзясяткаў гадоў. На яе памяці — многія і многія аднавяскоўцы, жыхары суседніх вёсак, якіх выратавалі, якім дапамаглі паправіць здароўе. І Марыя Гаўрылаўна перакананая, што бальніца для старых, нямоглых людзей, якімі спрэс становяцца жыхары невялікіх вёсак, тут мусіць быць. Яны, зараз хворыя, спрацаваныя на гэтай зямлі людзі, заслужылі яе — сваю бальніцу.



У цяперашніх пацыентаў установы — свая праўда. Для некаторых бальніца стала сапраўдным хоспісам, дзе пажылыя людзі дажываюць у чалавечых умовах. Як расказала медсястра бальніцы сястрынскага догляду Анжэла Хініч, у кожнага з чатырнаццаці пацыентаў свая жыццёвая гісторыя. Часцей за ўсё — невясёлая. Як і ў кожнага былога яе пацыента. Неяк прывезлі старога дзядка, што жыў у закінутым хлеўчуку. Спачатку ён праходзіў па дакументах як бомж. А як разабраліся супрацоўнікі міліцыі, то высветлілася, што дзядуля — удзельнік вайны з медалямі і ордэнамі, былі ў яго раней дом і сям'я... Але паміраць ветэрану давялося на бальнічным ложку, добра, што хоць не ў тым хлеўчуку, дзе жыў апошнія гады. Адна бабулька жыве тут шэсць гадоў і ўсе шэсць гадоў чакае, што па яе прыедзе сястра. Сваіх сваякоў яна не асуджае, а чакае і знаходзіць ім апраўданні: ну, пасля Вялікадня прыедуць, потым, калі агароды пасадзяць; ну, ужо як ураджай збяруць, недзе пад Каляды — дакладна, ат, навошта ўжо на зіму забіраць, лепей — вясной.

Такая бальніца, як паветра, патрэбна ў раёне. Пятнаццаць ложкаў бываюць занятыя заўсёды, здараецца, і чарга ўтвараецца, некаторым даводзіцца пэўны час чакаць накіравання.

Але праз некаторы час бальніца сястрынскага догляду пераедзе з Глыбокага. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў кіраўнік галіны аховы здароўя Жабінкаўскага раёна Анатоль Лаўрукевіч. Хоць апошнім часам у памяшканне правялі ваду і каналізацыю, але да ўмоў знаходжання, да стану памяшкання ў санітарных урачоў ды і супрацоўнікаў МНС ёсць пытанні. Новае памяшканне ўжо ў прынцыпе вызначана, пад бальніцу аддаюць будынак адной з зачыненых школ раёна. На думку персаналу, для пацыентаў будзе нават лепей у вёсцы, чым тут, наводшыбе. Там у бальніцу зойдзе нехта з вяскоўцаў, сюды ж найчасцей зазірае толькі мясцовы святар.

Што будзе далей з сядзібай, як яе выкарыстаць, у раёне, паводле слоў загадчыка аддзела культуры Васіля Чапялевіча, пакуль не вырашылі. Пабудаваны недзе ў канцы XIX стагоддзя дом патрабуе добрага рамонту і значных капіталаўкладанняў. Думаецца, што пры вырашэнні лёсу былога фальварка будзе ўлічана, што гэта адзіны сядзібны дом у раёне, які даіснаваў да нашых дзён амаль без зменаў.

Медсястра Анжэла Хініч расказала, што аднойчы ноччу ў двор бальніцы заблукаў дзік. Тут жа лясы навокал. А на павароце ў сядзібу мы сустрэлі цэлы збор паляўнічых у экіпіроўцы, адна з машын мела польскі нумар. Падумалася тады, што тут так і просіцца якая-небудзь аграсядзіба ці дом паляўнічага. Усё ж ёсць: старадаўні парк, немалая сажалка з рыбай, чысцюткае паветра. Быў нават вялікі цагляны склеп на некалькі пакояў. Уваход у яго ў 60-я ці 70-я гады тагачасны кіраўнік калгаса заваліў бульдозерам. Проста так — калі яму сказалі, што пабудаванае ім сховішча для агародніны нікуды не вартае, там усё псуецца, таму ёсць сэнс расчысціць панскі склеп, у якім некалі паспявалі сыры. Пра гэта згадала Марыя Сарока. Мажліва, яго можна рэстаўраваць, той склеп...

Па дарозе з Глыбокага, прыкладна ў кіламетры ад сядзібы, на краі лесу мы ўбачылі аленя — прыгожага, вялікага з вялізнымі рагамі. Вельмі хацелася спадзявацца, што не трапіцца лясны прыгажун паляўнічым.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Жабінкаўскі раён.*

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»**

**220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**
**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00 до 14.00,**
**тел.: 227 52 36, 226 03 01.**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, ул. Гаруна, д. 20, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-4 (жилой дом № 9)» в г. Минске.**

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Здание жилого дома запроектировано из четырех секций. Количество жилых помещений жилого дома – 135.

Начало строительства – сентябрь 2009 года.

Окончание строительства – август 2010 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке:

- государственную экспертизу от 01.07.2009 № 0940-8-2009.

Свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 29.09.2009 г. № 500/1035-957.

Земельный участок площадью 0,18 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на трехкомнатные квартиры стоимостью строительства 1 кв. метра общей площади без отделочных работ в текущих ценах – 2 446 017 руб.; с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на однокомнатные квартиры стоимостью строительства 1 кв. метра общей площади без отделочных работ в текущих ценах – 2 795 448 руб.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 22.09.2009 № 13с-09-2009.

Информацию о строительстве жилого дома и объектах долевого строительства можно получить в каб. 105, 311 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

**Генеральный директор Е.И. Вовна**

## Рызыкуюць за метал

Амаль што кожны дзень у Гомельскай вобласці міліцыянеры затрымліваюць грамадзян, якія робяць спробы вывезці вялікія партыі лому чорных і каляровых металаў за мяжу нашай краіны без усялякіх дакументаў. Часцей за ўсё перавозчыкаў ловяць уздоўж мяжы з Расійскай Федэрацыяй: у Добрушскім, Веткаўскім, Чачэрскім або Рагачоўскім раёнах. Вось апошні «ўлоў». Позна вечарам міліцыянеры з Чачэрска на аўтадарозе Буда-Кашалёва—Чачэрск затрымалі МАЗ, які належыць жыхару Бранскай вобласці і якім кіраваў непрацуючы жыхар вёскі Свяцілавічы Веткаўскага раёна. У машыне перавозілася 6,5 тоны лому чорнага металу без дакументаў. На світанку ў выселенай вёсцы Ачаса-Рудня Добрушскага раёна затрыманы КАМАЗ, у якім непрацуючы мазыранін спрабаваў вывезці 16 тон лому. Напярэдадні ноччу каля вёскі Пераразост таго ж раёна супрацоўнікі ўзвода па ахове тэрыторый радыеактыўнага забруджвання мясцовага РАУС затрымалі ЗІЛ, у якім непрацуючы жыхар вёскі Рогі Гомельскага раёна перавозіў 8 тон лому чорнага металу. У Чачэрскім раёне раніцай затрымана аўтамашына «ІФА-в50», у якой жыхар Рагачова, зразумела, без дакументаў, перавозіў каля 15 тон лому. 30 тон было ў грузавым аўтамабілі «МАН 26unl» з прычэпам, які належыць жыхару Навазыбкава Бранскай вобласці. Перавозчыкам каштоўнага грузу быў гамяльчанін: машыну затрымалі каля прапускнога пункта Селішча перад самай мяжой. Відаць, ёсць сэнс рызыкаваць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Рарытэтная стрэльба з Малькавічаў

**У Ганцавічах праводзіўся месячнік па добраахвотнай здачы зброі. Каб акцыя была больш эфектыўнай, былі надрукаваны нумары тэлефонаў, па якіх можна было паведаміць інфармацыю.**

Патэлефанаваў невядомы «добразычлівец» і сказаў, што ў Малькавічах у яго суседа ёсць незарэгістраваная паляўнічая стрэльба. Аператыўная група выехала на месца. Стрэльба канфіскаваная, а на гаспадара складзены пратакол. Міліцыянераў стрэльба здзівіла: яна амерыканскай вытворчасці 1901 года выпуску.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ТАКІ ГАСПАДАР

26-гадовы гаспадар стаў віноўнікам пажару, які хутка распаўсюдзіўся па ўсім яго хляве, дзе мужчына паліў цыгарэту. Вынік — знішчаны дах, пашкоджаны сцены, часткова — 5 тон назапашанага сена. Выратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, у вёску Грабава Жыткавіцкага раёна, паспелі вывесці з памяшкання 2 свінні, карову і цяля.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Камандзіроўка па пісьму

# ЯК ПЫЛ СКРОЗЬ ПАЛЬЦЫ

**У лісце, які быў дасланы ў «Звязду» з в. Сваятычы Ляхавіцкага раёна, гаварылася пра дамы, узведзеныя на цэнтральнай сядзібе СВК «Жарабковічы». «Будуюцца на балоце, праз год-два проста разбураюцца. Асядаюць падмуркі, падымаецца падлога, трэскаюцца сцены...», — сцвярджаў аўтар ад імя жыхароў вёскі Сваятычы.**

**Праблема вядомая і набалелая.**

У Жарабковічах пабудавалі цэлую вуліцу новых дамоў па дзяржаўнай праграме. За ўсё пабудаванае плаціць і яшчэ доўга будзе плаціць сельгаскааператыў — людзі, якія ў ім працуюць.

Заходжу ў першы дом злева і распытваю Ірыну Лук'янчык пра дом, які сям'я атрымала нейкі год таму.

— Дом, быццам бы, на першы погляд і добры быў, але нечакана праз колькі месяцаў пачала дыбіцца падлога і сталі асядаць сцены. Усё ўнутры дома паехала. На дзіця ўпала нават шафка і добра, што не пакалечыла. Будаўнікі ўсю падлогу затым узрывалі і ўсё нанава рабілі. А мы ў пакойчыку цэлы месяц туліліся... — гаварыла гаспадыня пра сваю бяду. Сям'я маладая — Ірына працуе ў школе кухарам, а яе муж Дзмітрый — механізатарам.

Насупраць Лук'янчыкаў дом намесніка старшыні гаспадаркі Антона Булатага.

І ён пералічвае тое ж самае, што я пачуў ад яго суседкі, ды яшчэ і дадае: «Шыфер паклалі без руберойду, зімой на гарышча снегу намяло і столь пацякла. Ганак таксама раз'ехаўся».

Выйшаў на вуліцу, а тут якраз пад'ехаў кіраўнік сельгаскааператыва Віталь Бусько.

Я пазнаёміў яго з лістом.

— Віталь Іванавіч, як такое магло здарыцца? Няўжо ў вас няма спецыяліста-будаўніка, які мог бы пракантраляваць будоўлю? За ўсё гаспадарка грошы плаціць!

— Грошы мы плацім, але давайце паглядзім на ўсё па парадку. Перад тым, як мы прыступілі да будоўлі, тут прыклалі руку геолагі, праектны інстытут, эксперты і мы ім плацілі, бо напэўна ж там працуюць спецыялісты. Затым прыйшлі будаўнікі, таксама нібыта не лыкам шытыя. А што датычыцца кантролю, то ім займаўся УКБ (упраўленне капітальнага будаўніцтва райвыканкама). У іх ёсць аддзел нагляду, і мы туды пералічвалі грошы — 2 працэнты ад агульнай сумы. Яны і абавязаны былі кантраляваць, — растлумачыў В. Бусько.

Так яно і павінна было быць — кожны адказвае за сваю працу. Але ж мы ведаем, якая адказнасць бывае іншым разам у нашага чалавека, і гэта яшчэ добра, калі ён спецыяліст, а здараецца, што працоўнае месца займае выпадковы чалавек. І калі б над будаўнікамі стаяў яшчэ і наглядчык з сельгаскааператыва, то гэта справе не пашкодзіла б. Усё аплачвае гаспадарка, і яе спецыялісты мелі поўнае права кантраляваць будоўлю. Праўда, у кіраўніка СВК «Жарабковічы» сваё меркаванне. Маўляў, кожны абавязаны сумленна працаваць на сваім працоўным месцы. Вось мы ўсе выстаўленыя рахункі аплачвалі ў тэрмін, і да нас прэтэнзій не было. І іншыя, хто завязаны на ўзвядзенні гэтых дамоў, абавязаны былі рабіць такім жа чынам.


Адзін са шматпакутных дамоў у Жарабковічах.

Так павінна быць. А што рабіць, калі гэтак не атрымліваецца?

Віталь Іванавіч падвёў мяне да дома Аляксандра Таўпекі, і паказаў на хлеў у глыбіні двара. Будынак даўжынёй метраў у 20 гаспадары ўзвялі самі.

— Во якія патрэбны людзям хлявы, а не тыя прыбіральні, што будуюцца па праекце, — заўважыў В. Бусько.

З дома выйшла гаспадыня, і я спытаў:

— Аксана Міхайлаўна, вось вы будаўнік па спецыяльнасці. А што рабілі б, каб тыя 150—200 мільёнаў крэдыту далі не сельгаскааператыву, а вам?

— Не ведаю, можа, за такія грошы мы б два дамы пабудавалі — сабе ды яшчэ і дачцэ, — усміхнулася жанчына, — але ведаю, што такога браку не было б.

* * *

У райвыканкаме мы не здолелі знайсці дырэктара УКБ, але з'явіўся яго намеснік Валерый Каваленка. І высветлілася, што нам цяжка прыйсці хоць да нейкага паразумення.

Намеснік дырэктара не ведаў, якія дамы давялося рамантаваць, гаварыў, што ім ужо па пяць гадоў і гарантыйны тэрмін у 2 гады скончыўся. Паведалі, што спецыялісты, якія кантралявалі будоўлю, ужо не працуюць...

Але на двух момантах, адзначаных В. Каваленкам, неабходна затрымаць увагу. Намеснік дырэктара зрабіў націск на тое, што сёлетні год няўдалы. Ішлі ўсё лета дажджы, грунтовая вада паднялася і нарабіла бяды ў дамах. Старшыня райсавета Яўген Юрлевіч, які прысутнічаў пры размове, спытаў, чаму ж тады нічога не здарылася ў дамах, якія гаспадары будавалі самі. Там поўны парадак — падлога не паднялася і перагародкі не абваліліся.

А вось сцвярджэнне, што ўсё рабілася ў адпаведнасці з праектам, заслугоўвае разважання.

Будаўнікі ў дамах усё выправілі ды адрамантавалі, і цяпер цяжка сказаць, як яно там было па праекце — пад падлогу не зазірнеш.


Ірына ЛУК'ЯНЧЫК з дачкой. Усё абышлося.

Але чаму перад тым, як на дах пакласці шыфер, яго не пакрылі руберойдам ці толем? А рабілася гэта дзеля эканоміі, каб зрабіць будаўніцтва больш танным (са слоў В. Каваленкі). З 200 мільёнаў зэканомілі на толі 200 тысяч рублёў. Эканомія дзеля эканоміі? Жыць у доме, на гарышчы якога гуляе вецер і ляжаць гурбы снегу, немагчыма.

На праекціроўшчыкаў нараканні вялікія, іншым разам узнікае ўражанне, што архітэктары ўсе гэтыя дамы ствараюць у сваёй галаве, адарваўшыся ад рэалій вясковага побыту, не ўлічваюць функцыянальнага прызначэння жылля, яго практычнасці і надзейнасці. На ўсё сёння патрэбен праект, і хоць тыя праекты часта тыпавыя, тым не менш за іх неабходна плаціць грошы, і не малыя. Эканоміць трэба, але, магчыма, найперш неабходна знізіць кошт праектаў? Пры разглядзе дзейнасці аднаго праектнага інстытута было выяўлена, што зарплата ў кіраўніка гэтай установы дасягае 8 мільёнаў рублёў. І сутнасць не ў той зарплаце, а ў дамах, якія гэты інстытут праектуе. Чаму даяркі, механізатары, як і ўсе працаўнікі вёскі, павінны «гарбаціцца» на зарплату дырэктару і няўтульна сябе адчуваць у дамах, якія спраектавала яго ўстанова? Па працы і зарплата!

На будаўніцтве ў Жарабковічах быў дапушчаны брак, на выпраўленне якога затрацілі вялікія грошы. За чый кошт рамантавалі дамы? Вядома ж, за дзяржаўныя, бо ПМК і будтрэст — арганізацыі не прыватныя. Чаму не было вызначана, хто дапусціў брак? Праекціроўшчыкі, будаўнікі, упраўленне капітальнага будаўніцтва райвыканкама? А можа, віна ў тым ёсць усіх?

Калі б брак ухілілі на грошы тых, хто яго дапусціў, то гэта паслужыла б для многіх урокам. Свае грошы ўмеюць лічыць, а дзяржаўныя праходзяць, як пыл, скрозь пальцы.

* * *

Адносна таго, чаму дамы найперш узводзяцца ў Жарабковічах, а не ў суседніх вёсках (пытанне ў лісце ўздымалася), старшыня СВК В. Бусько лічыць, што так будзе і надалей. На цэнтральнай сядзібе існуе неабходная інфраструктура: сярэдняя школа, дзіцячы сад, ФАП, сельсавет, крамы.....

Тут з кіраўніком гаспадаркі можна і не пагадзіцца, бо ў тых жа Сваятычах таксама жывуць людзі (300 чалавек), там ёсць Дом культуры, а тое, што ачаг культуры пустуе — няма моладзі, то гэта ўжо праблема. Можа, каб было жыллё ды праца, то і маладыя затрымліваліся б.

Насельніцтва нашых вёсак няўхільна скарачаецца. Але ці можна тут нешта змяніць?

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
*Ляхавіцкі раён.*

# ДАПАМОГА З ПРЭЙСКУРАНТАМ

**ПАШЫРЭННЕ практыкі аплаты за абслугоўванне пенсіянераў і інвалідаў дома ў пачатку гэтага дзесяцігоддзя прынесла даволі лагічны вынік — зніжэнне попыту на дапамогу сацыяльных работнікаў. Аднак затым той жа попыт стаў павышацца, і перш-наперш сярод жыхароў вёскі. Сёння «падтрымка за грошы» ўжо не ўспрымаецца як нешта незвычайнае. Пры гэтым апошнім часам тут з'явілася і новая прапанова — платныя аднаразовыя паслугі.**

### «Стандартны» варыянт — не кожнаму

Як па насельніцтве ў цэлым, так і па колькасці гараджан і жыхароў вёскі Асіповіцкі раён лічыцца адным з найбуйнейшых у краіне. Аднак не сакрэт: чым больш людзей, тым больш тых, каму патрэбная дапамога. Дастаткова сказаць, што ў раёне налічваецца больш за 14 тысяч пенсіянераў, а плюс да таго — звыш 3 тысяч інвалідаў.

— Калі чалавеку становіцца цяжка даглядаць сябе самастойна, мы прапануем яму надомнае абслугоўванне, — распавядае дырэктар раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ірына Асіпчук. — Сёння сацыяльныя работнікі наведваюць больш чым 400 чалавек. Прычым, як правіла, за грошы: калі пенсіянер ці інвалід жыве адзін і мае пенсію вышэй за бюджэт пражытковага мінімуму, то плаціць за два візіты ў тыдзень жыхарам гарадскіх кватэр трэба 8630, а жыхарам прыватных дамоў у горадзе і вёсках — 10 630 рублёў у месяц. Варта заўважыць, што гэта — для большасці — сумы «пад'ёмныя». Але нельга не адзначыць і іншае: пастаянныя візіты сацыяльных работнікаў падыходзяць не ўсім. І не ўсе згодныя за іх плаціць. Бо многім неабходна дапамога ў вырашэнні толькі якой-небудзь адной і часам даволі «нестандартнай» бытавой праблемы.

Аказанне аднаразовых паслуг у раёне пачалося ў пачатку мінулага года. Ці не галоўнай «стартавай умовай» стала наяўнасць тых жа сацыяльных работнікаў. А таксама грузапасажырскай «Газелі». У дадатак да яе купілі па сутнасці ўсяго адну рэч — бензакасілку.

— Магчымасць карыстацца аднаразовымі сацыяльнымі паслугамі маюць не толькі пенсіянеры і інваліды, але і ўсе жыхары раёна, якія апынуліся ў цяжкай сітуацыі — скажам, з прычыны хваробы, — працягвае Ірына Асіпчук. — Што ж непасрэдна да варыянтаў дапамогі, то пералік тут досыць вялікі.

### Што і колькі?

У адрозненне ад надомнага абслугоўвання, на аднаразовыя сацыяльныя паслугі не прадугледжваецца зніжак. Плаціць даводзіцца «па поўнай». Колькі? Гэта пытанне асобнае.

Скажам, у Асіповіцкім раёне мыццё 10 талерак ці каструль каштуе 920 руб., чыстка люстэрка — 150 руб. за метр квадратны, ачыстка 100 «квадратаў» падворка ад снегу — 960 руб., мыццё кілаграма бялізны — 2610 руб., прасаванне таго ж кілаграма бялізны — 1210 руб., узворванне соткі агарода — 700 руб., прапалка соткі бульбы — 2650 руб., мыццё вокнаў у стандартнай двухпакаёўцы — каля 4 тыс., колка прычэпу дроў — пад 40 тысяч рублёў, кансерваванне 10 кілаграмаў сліў (аказваецца, ёсць сярод прапаноў і такая) будзе каштаваць 5480, а 10 кілаграмаў агуркоў — крыху больш за 10 тысяч рублёў.

Дарэчы, практыка сведчыць, што кансерваванне садавіны і агародніны, мыццё бялізны, прыбіранне памяшканняў, фарбаванне падлогі, сцен і вокнаў — паслугі ці не самыя папулярныя. Як і грузаперавозкі. Карыстанне «Газеллю» ацэньваецца ў 4810 руб. за гадзіну, плюс да таго трэба даплаціць па 340 рублёў за кожны кіламетр «прабегу». І, да слова, збольшага «сацыяльны транспарт» замаўляюць з дзвюма мэтамі — каб перавезці мэблю або ўраджай агародніны з дачы.

### Права на выбар

Тарыфы на аднаразовыя сацыяльныя паслугі вызначаюцца з мінімальнай рэнтабельнасцю і да таго ж строга кантралююцца. Адсюль і не самыя высокія лічбы. Можна нават зазначыць: пры звароце да прыватнікаў раз-пораз за аднолькавую работу трэба плаціць у некалькі разоў больш. І ўсё ж толькі ў якасці канстатацыі: з пачатку года аб аднаразовых паслугах у раёне папрасілі ўсяго... 26 чалавек.

— Сапраўды, даходы пенсіянераў і інвалідаў высокімі назваць ні ў якім разе нельга, але я не думаю, што сутнасць тут выключна ў памерах пенсій, — заўважае намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Асіповіцкага райвыканкама Ніна Лапанік. — Хутчэй, асноўная прычына — псіхалогія. Яшчэ з савецкіх часоў мы прызвычаіліся, што ўсё павінна даць дзяржава. Але так ужо не будзе. Дзяржава павінна падтрымаць тых, каму найбольш цяжка. І забяспечыць права выбару. А ў тым, што пры наяўнасці такога выбару попыт на аднаразовыя сацыяльныя паслугі будзе ўзрастаць, сумнявацца не выпадае. Бо людзі, якія заплацілі па сацыяльных тарыфах за вырашэнне сваіх бытавых пытанняў аднойчы, потым прыходзяць ізноў.

Да таго ж у раёне зрабілі адно цікавае назіранне. Калі да пастаяннага надомнага абслугоўвання збольшага звяртаюцца цалкам адзінокія людзі ці людзі, сваякі якіх жывуць вельмі далёка, то аднаразовыя паслугі не абмінаюць увагай пенсіянеры, дзеці якіх знаходзяцца побач. Бо тыя ж дзеці добра разумеюць: калі-нікалі працяй даць бацькам «лішнія» 10 ці 50 тысяч рублёў. І не мець аніякага клопату.

### Дзяржава «падзеліцца» рынкам?

Як адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, сёння аднаразовую платную дапамогу прадастаўляюць усе тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. А ў сваю чаргу цэнтры працуюць у кожным раёне. Прычым дзе-нідзе ў рэгіёнах пайшлі далей і для вырашэння «бытавых» праблем пенсіянераў і інвалідаў стварылі спецыяльныя мабільныя брыгады. У цэлым жа статыстыка сведчыць: з пачатку года ў краіне неабароненая катэгорыя грамадзян ужо атрымала больш за 65 тысяч аднаразовых паслуг. Імі скарысталіся 22,5 тысячы чалавек.

— Не сакрэт, што сёння аказаннем аднаразовых паслуг пенсіянерам і інвалідам займаюцца ў асноўным тэрытарыяльныя цэнтры, але не выключана, што надалей сітуацыя зменіцца, — адзначае начальнік аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання міністэрства Таццяна Касцюковіч. — Ёсць прапанова прыцягнуць на гэты рынак грамадскія аб'яднанні і некамерцыйныя арганізацыі. Напрыклад, тут можа дзейнічаць наступная схема: грамадскія аб'яднанні і некамерцыйныя арганізацыі пачнуць вылучаць пэўныя ўласныя сацыяльныя праекты, затым будзе наладжвацца тэндар такіх праектаў, а пераможцы атрымаюць дзяржаўнае фінансаванне на выкананне. І ў тым ліку гаворка ідзе аб праектах па паслугах, зразумела, з адпаведным ліцэнзаваннем, кантролем за якасцю і цэнамі. Зрэшты, варта заўважыць, што пакуль казаць што-небудзь пэўнае тут нельга — гэта пытанне яшчэ трэба вывучаць.

**Сяргей ГРЫБ.**
*Мінск — Асіповічы.*

## ЗАДАЧА НАВУКІ — БЫЦЬ ЗАПАТРАБАВАНАЙ У ВЫТВОРЧАСЦІ

**500 млрд 60 млн рублёў бюджэтных грошай прадугледжана выдаткаваць на наступны год на беларускую навуку. Гэта крыху больш, чым было затрачана сёлета. Да 2015 года айчынныя навукоўцы плануюць выйсці на 65 працэнтаў пазабюджэтнага фінансавання. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік старшыні прэзідыума НАН Пётр ВІЦЯЗЬ.**

Ён расказаў аб новай стратэгіі навуковай дзейнасці на перыяд да 2015 года. Стратэгія скіравана на інавацыйнае развіццё нашай краіны і стварэнне навуковай прадукцыі, канкурэнтаздольнай на сусветных рынках. Сярод прыярытэтаў для эканомікі экспарту названыя энергетыка і энергазберажэнне, хімічныя тэхналогіі, біятэхналогіі, медыцына, інфармацыйныя і касмічныя тэхналогіі, інавацыі ў сельскай гаспадарцы — усяго 11 кірункаў. Для кожнага з іх вызначаны куратар — вядомы вучоны, спецыяліст у азначанай галіне.

«Разумны прадасць тавар, а не ідэю, — патлумачыў Пётр Віцязь, — бо тавар каштуе даражэй. Але там, дзе ідэю па нейкіх прычынах мы не можам рэалізаваць у сябе, — натуральна, будзем прадаваць. У нас створана база па развіцці навукі, па развіцці тэхнікі, а інавацыйная — каб сёння было прывабным атрыманне інвестыцый, спалучэнне прыватнага бізнэсу і дзяржаўнага, стварэнне карпарацый — недастатковая. Гэта таксама задача навукі».

**Інга МІНДАЛЁВА.**

## НОВЫ КАСЦЁЛ ПРАЗ 120 ГАДОЎ

**У Віцебску, у «спальным» раёне «Поўдзень - 7», створаным яшчэ ў 1990-я гады, дзе і цяпер шмат новабудоўляў, асвяцяць новы касцёл Езуса Міласэрнага. Цікава, што ў старажытным горадзе касцёлы не будаваліся, як кажуць, «з нуля», на працягу апошніх больш чым 120 гадоў. Той, што захаваўся, — Святой Барбары (пабудаваны ў 1884 годзе недалёка ад чыгуначнага вакзала), карпатліва і старанна адраджаўся.**

Урачыстае асвячэнне касцёла прызначана на раніцу 10 кастрычніка. Новы касцёл даволі вялікі і прыгожы — у форме крыжа. Яго вышыня 32 метры, даўжыня — 28 метраў і шырыня — 18 метраў. Новы касцёл па вуліцы Воінаў - інтэрнацыяналістаў, які пачалі ўзводзіць у 2000 годзе, асвяцяць у рамках святкавання 10-годдзя стварэння віцебскай дыяцэзіі.

Вернікі, ды і ўсе, хто любіць родны Віцебск, вельмі спадзяюцца на тое, што і ў самым цэнтры старога горада будзе касцёл. Тут, літаральна насупраць ратушы, стаяў касцёл Святога Антонія Падуанскага. Праваслаўны храм ля ратушы ўжо аднавілі. І былая Ратушная плошча цяпер вельмі гарманічная.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ФІНАНСАВАЯ АДУКАЦЫЯ МАЛАМАЁМАСНЫХ СЕМ'ЯЎ

**У рамках рэалізацыі сумеснага праекта Праграмы развіцця ААН і Нацыянальнага банка «Садзейнічанне развіццю мікрафінансавання ў Рэспубліцы Беларусь» пачынаецца міні-праект па фінансавай адукацыі для сем'яў з невысокім узроўнем прыбыткаў.**

Мэта міні-праекта — павышэнне фінансавай культуры насельніцтва і папулярызацыя мікрафінансавання. У краіне будзе адаптаваны і рэалізаваны спецыяльны курс «Плануй сваю будучыню», распрацаваны міжнародным цэнтрам мікрафінансавання для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і краін СНД. Гэтая вучэбная праграма прайшла паспяховую апрабацыю ў Польшчы, Расіі, ва Украіне, Казахстане, Узбекістане.

Мяркуецца навучыць і сертыфікаваць не меней за 20 прадстаўнікоў з не меней як 15 мясцовых партнёрскіх арганізацый для выкладання курсу, правесці заняткі па курсе «Плануй сваю будучыню» як мінімум для 500 маламаёмасных удзельнікаў.

Адной з галоўных вартасцяў міні-праекта, як лічаць эксперты, з'яўляецца тое, што ён не вучыць эканоміць на сабе, ён навучае правільнаму размеркаванню выдаткаў і прыбыткаў сям'і, павышае ўзровень і якасць ведаў аб фінансавых паслугах.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## «ЗВЯЗДАРЫНАЧКА»

**Працягваецца штотыднёвая віктарына. Як вы маглі ўжо заўважыць, ад гэтага нумара ў «Звяздарыначцы» адбыліся некаторыя змяненні. Па-першае, яна пачала выходзіць у суботніх нумарах, а, па-другое, па вашых просьбах тэрмін на адказы павялічыўся: цяпер вы можаце дасылаць іх на працягу двух тыдняў ад выхаду адпаведнага тура віктарыны. Варта сказаць, што тым, хто не паспеў паўдзельнічаць у першым альбо другім туры, няма чаго адчайвацца, бо ў вас яшчэ ёсць рэальная магчымасць для перамогі па суме балаў за ўсе туры.**

**А адказы на пытанні, нагадаем, вы можаце дасылаць у рэдакцыю двума шляхамі: традыцыйна, праз пошту з пазнакай «Звяздарыначка» на адрас рэдакцыі (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а) і на рэдакцыйную электронную скрыню (info@zvyazda.minsk.by). Удзельнічайце і перамагайце! Хочацца верыць, што вы ўпадабаеце гэтую новую інтэрактыўную інтэлект-рубрыку!**

**Вядучы рубрыкі Мікола ТАМАШЭВІЧ.**

### ТРЭЦІ ТУР ВІКТАРЫНЫ

**1.** Што з'яўляецца адначасова і традыцыйнай вадкай мучной стравай, і прозвішчам адзінай каханай вялікага беларускага паэта?

**2.** Які сапраўдны колер Белай вежы?

**3.** Як называецца беларускі фільм, які быў унесены ЮНЭСКА ў спіс 100 лепшых карцінаў пра Другую сусветную вайну?



**4.** У чым заключалася шчасце беларускага селяніна ў знакамітай паэме Някрасава «Каму на Русі жыць добра»?

**5.** У Брусeлі размяшчаецца штаб-кватэра Еўрасаюза. А што ў сталіцы Беларусі?

**6.** Паводле легенды, гэты князь нарадзіўся з ранай на ілбе, а таму валодаў магічнай сілай і мог ператварацца ў ваўкалака (здагадайцеся па малюнку).



**7.** Якая беларуская каманда перамагла ў чэмпіянаце СССР па футболе і калі гэта адбылося?

**8.** З імем якога палітычнага дзеяча звязаныя спробы эканамічных рэформаў напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай?

**9.** Дзе быў заснаваны першы беларускі ўніверсітэт? У якім годзе гэта адбылося?

**10.** Як звалі чараўніка, што на Свіслачы ў сваім млыне малаціў камяні?



**11.** Хоць, паводле Канстытуцыі 1791 года, у Рэчы Паспалітай дзяржаўнай рэлігіяй было аб'яўшчана каталіцтва, аднак прадстаўнікам іншых канфесій дазвалялася весці свае рэлігійныя абрады. А што забаранялася?

**12.** Колькі працэнтаў прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў пражывала ў Беларусі паводле перапісу 1999 года? Напішыце назвы чатырох самых вялікіх па колькасці прадстаўнікоў нацыянальнасцяў.

**13.** Што 600 гадоў таму Вітаўт зрабіў для Белавежскай пушчы?




г. ВИТЕБСК 12.11.2009

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| № лота | Наименование предмета аукциона<br>Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | **Неиспользуемые объекты военного городка № 102, расположенные по адресу: г. Витебск, ул. Базовая, 12Б, и право заключения договора аренды земельного участка**<br>Характеристика капитальных строений:<br>капитальное строение с инв. № 200/С-49369 – склад общего назначения с рампой и техподпольем, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 1670,3 кв.м, 1970 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная,<br>капитальное строение с инв. № 200/С-49367 – тарный склад, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 265,3 кв.м, 1982 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная,<br>капитальное строение с инв. № 200/С-49364 – свинарник с навесом и складом, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 382 кв.м, 1993 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная,<br>капитальное строение с инв. № 200/С-49362 – склад с двумя навесами, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 198 кв.м, 1970 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная,<br>капитальное строение с инв. № 200/С-49363 – тарный склад, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 189,6 кв.м, 1982 года постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные, крыша рулонная,<br>капитальное строение с инв. № 200/С-57665 – сооружение специализированное энергетики (электрическая сеть) протяженностью 516,3 кв.м;<br>покрытие асфальтобетонное площадью 5887 кв.м с бордюрным камнем 69 кв.м;<br>ограждение железобетонное с воротами протяженностью 121 м.<br>Земельный участок: с кадастровым номером 240100000002002702 площадью 1,9478 га для содержания и обслуживания строений, срок аренды – 30 лет. | 1240974236 | 124097423 |
| 2 | **Неиспользуемые здание с сараем и здание проходной, расположенные по адресу: г. Витебск, ул. Ленинградская, 96А, и право заключения договора аренды земельного участка**<br>Характеристика капитальных строений:<br>капитальное строение с инв. № 200/С-51044 – инвентарное здание с сараем, одноэтажное каркасно-засыпное, общей площадью 255,2 кв.м,1992 года постройки, фундамент бетонный, перекрытие деревянные, крыша шиферная;<br>капитальное строение с инв. № 200/С-51599 – проходная дощатая с воротами металлическими, общая площадь 7,4 кв.м, 2004 года постройки, фундамент – металлические столбы, перекрытие деревянное, крыша шиферная.<br>Земельный участок: с кадастровым номером 240100000002005258 площадью 0,6472 га, для содержания и обслуживания зданий, срок аренды – 35 лет. | 143520644 | 14352064 |
| 3 | **Здание трансформаторной подстанции, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Карла Маркса, в районе дома № 32, и право заключения договора аренды земельного участка**<br>Характеристика капитального строения:<br>капитальное строение с инв. № 200/С-57715 – здание специализированное энергетики, трансформаторная подстанция № 4-с, общей площадью 66,0 кв.м, одноэтажное кирпичное, 1939 года постройки, фундамент бетонный, перекрытие железобетонное, крыша рулонная.<br>Земельный участок с кадастровым номером 240100000002003011 площадью 0,0122 га, для содержания и обслуживания трансформаторной подстанции, сроком аренды 99 лет. Ограничения в использовании в связи с нахождением участка в охранной зоне магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных сооружений (ливневая канализация), водопровода, охранных зонах линии электропередач напряжением свыше 1000 В, теплотрассы. | 22832892 | 2283289 |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в г. Витебск: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ:

по лоту № 1: Государственное учреждение «Борисовское эксплутационное управление Вооруженных Сил», тел. (017) 773 33 49;

по лоту № 2: Строительное республиканское унитарное предприятие «Витебский домостроительный комбинат», тел. (0212) 48 77 22;

по лоту № 3: Транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги», тел. (0212) 37 88 87.

**Условие пользования земельными участками:**

- в случае изменения целевого назначения помещения (здания) получить в отделе архитектуры и строительства Витебского городского исполнительного комитета разрешительные документы на проектирование;

- заключение победителем аукциона с Витебским городским исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения Витебского городского исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**1. Аукцион состоится 12 ноября 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию, **без нотариального засвидетельствования;** индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования;** иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 11 ноября 2009 г. до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 12 ноября 2009 г. с 14.00 до 14.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.**

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

**6. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения Витебского горисполкома о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Витебским горисполкомом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллиона рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

## Вызначаны прэтэндэнты на атрыманне прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці ў 2009 годзе

Завяршыўся прыём замоў і дакументаў на ўдзел у адзінаццатым конкурсе на атрыманне Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці.

Паводле інфармацыі сакратарыята Камісіі па прысуджэнні Прэміі пры Дзяржстандарце Рэспублікі Беларусь, на ўдзел у конкурсе 2009 года падалі замовы 26 арганізацый рэспублікі, якія прадстаўляюць розныя галіны прамысловасці і сферы паслуг. Сярод іх:

1. СЗАТ «Белатміт».
2. РУВП «Беларускі аўтамабільны завод».
3. УП «Мінгаз».
4. ААТ «Бярозаўскі сыраробны камбінат».
5. ААТ «Інстытут «Мінскграмадзянпраект».
6. ААТ «Магілёўхімвалакно».
7. Філіял «Вагоннае дэпо Брэст «РУП «Брэсцкае аддзяленне Беларускай чыгункі».
8. ААТ « Брэсцкі мясакамбінат».
9. РУП «Гомельскі лікёра-гарэлачны завод».
10. РУВП «Брэстхлебпрам».
11. ААТ «Лідсельмаш».
12. ААТ «Брэсцкі цэнтральны ўнівермаг».
13. ААТ «Купалінка».
14. РУП «Віцебскі лікёра-гарэлачны завод».
15. ААТ «Кобрынаграмаш».
16. КУП «Віцебскі кандытарскі камбінат «Віцьба».
17. СТАА «Контэ Спа».
18. ТАА «Вегас».
19. ААТ «Лідааграпраммаш».
20. Дзяржаўнае прадпрыемства «Гомельскі завод ліцця і нармаляў».
21. Прыватнае прадпрыемства «ЛЭМТ».
22. СЗАТ «Сервалюкс» Філіял «Сервалюкс Агра».
23. СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы».
24. РУП «Нацыянальны аэрапорт Мінск».
25. ААТ «Магілёўскі мясакамбінат».
26. ААТ «Гатэль «Турыст».

Мадэль, па якой праводзіцца конкурс на атрыманне Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці, гарманізаваная з крытэрыямі Еўрапейскай прэміі па якасці і Прэміі Садружнасці Незалежных Дзяржаў за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг. Гэта дае магчымасць беларускім арганізацыям, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, ажыццяўляць сваю дзейнасць на прынцыпах, якімі кіруюцца замежныя партнёры, садзейнічае павышэнню канкурэнтаздольнасці айчынных прадпрыемстваў на знешніх рынках.

Усведамляючы гэта, беларускія арганізацыі імкнуцца праз удзел у конкурсе шляхам правядзення ацэнкі па вызначаных крытэрыях і выдзялення аспектаў для паляпшэння сваёй дзейнасці дабіцца больш высокіх вынікаў і павысіць якасць прадукцыі (паслуг), якую вырабляюць.

Адзначаецца актыўны ўдзел у конкурсе арганізацый сферы вытворчасці харчовых тавараў і сельскагаспадарчай прадукцыі, што сведчыць аб важнасці якасці для гэтага сектара эканомікі, павышэння экспартнага патэнцыялу айчынных прадпрыемстваў.

Цяпер пачынаецца другі этап конкурсу. Пасля разгляду групай экспертаў пададзеных арганізацыямі дакументаў ажыццяўляецца наведванне прэтэндэнтаў з мэтай ацэнкі фактычнага стану работ па якасці непасрэдна на месцах.

Імёны арганізацый, прызнаных лепшымі ў галіне якасці, будуць абвешчаны ў канцы года. Лаўрэатам будуць уручаны дыпломы і сімвалы Прэміі, а таксама дадзена права выкарыстання ў маркіроўцы прадукцыі, дакументацыі і ў рэкламных матэрыялах адлюстравання эмблемы Прэміі. Акрамя таго, спіс пераможцаў будзе размешчаны на інтэрнэт-сайце Дзяржстандарта Рэспублікі Беларусь (www.gosstandart.gov.by), апублікаваны ў навукова-практычным часопісе «Стандартызацыя» і ўключаны ў ілюстраваны каталог лаўрэатаў конкурсу, які выдаецца штогод. Каталог будзе перададзены ў прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь за мяжой.

## НОЧ. ПАЖАР. ЭВАКУАЦЫЯ

**У Полацку а дванаццатай гадзіне ночы ў доме № 2 па вуліцы Марыненкі пажарныя эвакуявалі жыльцоў пяціпавярховага панэльнага дома.**

Гаспадара кватэры 56-гадовага інваліда трэцяй групы і яго 43-гадовага знаёмага (беспрацоўнага) выратавалі з агню. Жыльцоў вышэйшых паверхаў (усяго 21 чалавек) давялося эвакуяваць. Мяркуецца, што прычынай пажару стала курэнне ў нецвярозым стане інваліда — гаспадара кватэры.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## КОМИССИЯ ПОСТАВСКОГО РАЙИСПОЛКОМА (ВИТЕБСКАЯ ОБЛАСТЬ) ПО ПРОВЕДЕНИЮ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

| | Лоты аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилых домов | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 | Лот № 4 | Лот № 5 | Лот № 6 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | В 10.00 13 ноября 2009 года г. Поставы, пл. Ленина, 25, III этаж, каб. 58 (Поставский райисполком, кабинет заместителя председателя райисполкома по экономике) | | | | | |
| **Продавец** | Лынтупский сельский исполнительный комитет | Лынтупский сельский исполнительный комитет | Воропаевский поселковый исполнительный комитет | Воропаевский поселковый исполнительный комитет | Волковский сельский исполнительный комитет | Яревский сельский исполнительный комитет |
| **Адрес участка** | Витебская область, Поставский район | | | | | |
| | Лынтупский сельсовет, д. Саранчаны, ул. Строителей, 15А | Лынтупский сельсовет, д. Саранчаны, ул. Строителей, 15Б | Воропаевский поссовет, д. Белое, ул. Озерная, 7А | Воропаевский поссовет, д. Белое, ул. Озерная, 7Б | Волковский сельсовет, д. Кривое-2, ул. Центральная, 1А | Яревский сельсовет, хутор Заготскот, ул. Полевая, 6 |
| **Кадастровый номер** | 224082824301000055 | 224082824301000057 | 224075401101000027 | 224075401101000026 | 224080809601000024 | 224085304101000004 |
| **Площадь участка, га** | 0.2103 | 0.2234 | 0.1319 | 0.1321 | 0.2499 | 0.2500 |
| **Наличие ограничений в использовании** | Водоохранная зона озера Саранчаны | Водоохранная зона озера Саранчаны | Водоохранная зона озера Белое | Водоохранная зона озера Белое | Водоохранная зона озера Кривое | Водоохранная зона озера Задевское |
| **Начальная цена продажи, руб.** | 3 000 000 | 3 000 000 | 3 000 000 | 3 000 000 | 3 000 000 | 3 000 000 |
| **Размер задатка за участие в аукционе, руб.** | 300 000 | 300 000 | 300 000 | 300 000 | 300 000 | 300 000 |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | счет Лынтупского сельсовета исполнительного комитета № 3641324000011 в филиале № 230 ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк» г. Поставы, код 649, УНН 300077196 | | счет Воропаевского поселкового исполнительного комитета № 3641324000138 в филиале № 230 ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк» г. Поставы, код 649, УНН 300085644 | | счет Волковского сельского исполнительного комитета № 3641324000170 в филиале № 230 ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк» г. Поставы, код 649, УНН 300085631 | счет Яревского сельского исполнительного комитета № 3641324000095 в филиале № 230 ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк» г. Поставы, код 649, УНН 300594330 |
| **Размер расходов на организацию и проведение аукциона, руб.** | 822280 | 831610 | 932070 | 900680 | 668030 | 975580 |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона** | внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах; возмещение организатору аукционов расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков; государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации. | | | | | |

Порядок ознакомления с земельно-кадастровой документацией и осмотра на местности земельных участков, которые выставляются на аукцион, прием заявлений на участие в аукционе, контактные телефоны комиссии – ежедневно со дня публикации извещения в рабочие дни с 8.00 до 17.00 до дня окончания приема заявлений включительно по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную и геодезическую службу Поставского района: г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, тел. (802155) 43180, 41132.

Прием заявлений на участие в аукционе прекращается за три дня до даты его проведения, указанной в извещении. Желающие участвовать в аукционе подают заявления лично или через уполномоченного представителя с нотариально удостоверенной доверенностью с приложением квитанции об уплате задатка на счет соответствующего исполнительного комитета и предъявлением общегражданского паспорта.

Парламенцкі дзённік

# ПРАТЭРМІНАВАНЫЯ І ШКОДНЫЯ ТАВАРЫ ПАВІННЫ ЗНІКНУЦЬ З ПРЫЛАЎКАЎ

**На пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў учора разглядаўся праект закона «Аб Камітэце дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і яго тэрытарыяльных органах».**

Як паведаміў **старшыня КДК Зянон ЛОМАЦЬ,** у адпаведнасці з законапраектам, органы і камітэты кантролю надзяляюцца новымі правамі: так, яны змогуць прыпыняць ці забараняць рэалізацыю тавараў, работ і паслуг, калі тыя прычыняюць альбо могуць прычыніць шкоду жыццю, здароўю, маёмасці спажыўцоў ці навакольнаму асяроддзю. Кантралюючым органам таксама дазваляецца забараняць вытворчасць і рэалізацыю тавараў, якія не маюць ліцэнзіі, тэрмінаў прыдатнасці, альбо паступаюць у продаж пратэрмінаванымі; спаганяць сродкі бюджэту, якія былі атрыманыя незаконна альбо выкарыстаныя не па мэтавым прызначэнні з парушэннем заканадаўства.

У законапраект уключаны новы артыкул, які прапісвае абавязкі работнікаў камітэта і яго тэрытарыяльных органаў, прапісана патрабаванне, згодна з якім работнікі камітэта не могуць з'яўляцца членамі палітычных партый ці грамадскіх арганізацый, якія маюць палітычныя мэты. У якасці мераў сацыяльнай абароны праект прадугледжвае такі пункт, што работнікі, якія здзяйсняюць ці непасрэдна забяспечваюць кантрольную дзейнасць, падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму страхаванню.

Як заўважыў Зянон Ломаць, прыняты праект закона будзе садзейнічаць далейшаму павышэнню эфектыўнасці працы камітэта ў забеспячэнні эканамічнай бяспекі дзяржавы, у папярэджванні правапарушэнняў: «Праверкі органаў камітэта стануць больш сістэмна накіраванымі, ахопяць цэлыя сферы эканамічнай дзейнасці дзяржавы».

Дарэчы, па словах старшыні Камітэта дзяржкантролю ва ўмовах крызісу ціск на суб'екты гаспадарання максімальна зніжаны: «Праверкі праводзяцца толькі пры наяўнасці дакладных звестак аб здзейсненых альбо здзяйсняльных адміністрацыйна-прававых парушэннях альбо злачынствах, што дазваляе не назаляць праверкамі прадпрыемствы, што стабільна працуюць. Па выніках 9 месяцаў гэтага года колькасць праверак скарацілася на 33 працэнты, пры гэтым іх выніковасць склала 100 працэнтаў. Работнікі камітэта імкнуцца працаваць аператыўна, каб не адрываць прадпрыемствы і іх работнікаў ад непасрэднай вытворчай ці гандлёвай дзейнасці. Агульны тэрмін правядзення праверкі не павінен перавышаць 10 працоўных дзён. Мы перасталі паўсюдна прымяняць максімальна высокія штрафы. Пры рашэнні пытанняў аб памеры штрафаў улічваем эканамічную сітуацыю на пэўным прадпрыемстве і магчымыя наступствы пасля нашых рашэнняў для вытворчасці і работнікаў. У межах кантрольных мерапрыемстваў сёлета ў бюджэт спагнана грашовых сродкаў больш чым 153 мільярды рублёў, што на 12,5 працэнта болей, чым летась, вернута ў даход дзяржавы матэрыяльных каштоўнасцяў на 10 мільярдаў рублёў».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## Хто што сказаў учора ...

**Алена ФІСЕНКА,** *загадчыца эпідэміялагічнага аддзела Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі* — **пра тое, ці можа ў час сезоннага грыпу свіны грып змяшацца з чалавечым і ці не будзе гэтая новая форма самай небяспечнай:**

— Калі такая верагоднасць і існуе, то яна мінімальная, бо мутацыі адбываюцца не з-за адначасовай цыркуляцыі некалькіх відаў вірусу. Мутацыі, як правіла, пачынаюцца не ў нашым рэгіёне планеты, а ў азіяцкім. Да нас прыходзяць вірусы, якія закончылі сваю цыркуляцыю ў паўднёвым паўшар'і, і мы загадзя бачым новыя варыянты вірусаў у выпадку іх з'яўлення. Як мяркуюць вучоныя, мутацыі свінога, птушынага вірусаў адбываюцца пры пераходзе праз відавы бар'ер. У гэтым выпадку вірус A/H1N1 хоць і носіць назву свінога, з'яўляецца абсалютна чалавечым.

**Міхаіл МІХАДЗЮК,** *намеснік міністра энергетыкі Беларусі* — **пра перавагі выкарыстання атамнай энергетыкі ў эканоміцы краіны:**

— Атамная энергетыка сёння — самая танная крыніца электраэнергіі, нягледзячы на больш высокія першапачатковыя капітальныя выдаткі. З пускам АЭС сабекошт электраэнергіі ў краіне ў цэлым па энергасістэме зменшыцца на 20—30 працэнтаў, у краіны з'явіцца магчымасць закупкі ядзернага паліва на некалькі гадоў наперад, а гадавы аб'ём закупак газу знізіцца на 4—5 млрд куб. м.

**Бернд ШТАНГЕ,** *галоўны трэнер зборнай Беларусі па футболе* — **пра сённяшнюю гульню з казахамі:**

— Рыхтуемся да таго, што гульня з Казахстанам у Брэсце будзе цяжкай. Здаецца, у Англіі на «Уэмблі» нам будзе лягчэй. Ніякай недаацэнкі ў дачыненні да каманды Казахстана з нашага боку няма, і перамога ў гэтай сустрэчы вельмі важная. Мы хочам набраць 13 ачкоў і адправіцца ў Англію, забяспечыўшы сабе мінімум 4-е месца ў нашай адборачнай групе. У нас у гэтым цыкле засталіся яшчэ два паядынкі, і хоць у турнірным плане яны мала што вырашаюць, мы хочам правесці іх добра і захаваць твар.


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**Министерство обороны Республики Беларусь проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности**

| № лота | Наименование объекта аренды, его характеристика (год постройки, общая площадь, коммунальные услуги при наличии) | Адрес объекта аренды, контактный тел. для осмотра объекта | Арендуемая площадь и срок договора аренды | Начальная цена права заключения договора аренды с НДС (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 71/482 – адм. здание,1968 г., 1393 м$^2$, тех. паспорта нет | г. Минск, ул. Рогачевская, 20, в/ч 29591, тел. (8017) 2665608 | 1393 м$^2$, 3 года | 4 314 820 | 400 000 |
| 2. | БУЦ – 153 – здание караульного помещения, 1988 г., 176 м$^2$, э/энергия | г. Борисов, в/г № 15, ул. Ватутина, в/ч 59884, тел. (80177) 753496 | 176 м$^2$, 3 года | 1 817 200 | 150 000 |
| 3. | 14/611 – спортзал 1971 г., 782 м$^2$, э/энергия | г. Борисов, в/г № 14, ул. Серебренникова, в/ч 22316, тел. (80177) 787147 (54 01) | 782 м$^2$, 3 года | 8 074 150 | 400 000 |
| 4. | 14/620 – учебный класс, 1971 г., 600 м$^2$, тех. паспорта нет | -//- | 600 м$^2$, 3 года | 6 195 000 | 300 000 |
| 5. | 14/621 – учебный класс, 1971 г., 281 м$^2$, тех. паспорта нет | -//- | 281 м$^2$, 3 года | 2 901 320 | 250 000 |
| 6. | 14/405 – учебный класс, 1960 г., 646 м$^2$, тех. паспорта нет | -//- | 646 м$^2$, 3 года | 6 669 950 | 350 000 |
| 7. | 14/482 – караульное помещение, 147 м$^2$, освещение, водоснабжение, отопление | -//- | 14,1 м$^2$, 3 года | 145 580 | 10 000 |
| 8. | -//- | -//- | 25,95 м$^2$, 3 года | 267 930 | 15 000 |
| 9. | -//- | -//- | 108,45 м$^2$, 3 года | 1 119 750 | 100 000 |
| 10. | 94/2 – здание командного пункта, до 1917 г., 336 м$^2$, э/энергия, канализация, водоснабж., отопление | г. Брест, в/г № 94, в/ч 48684 тел. (80162) 221185 | 336 м$^2$, 3 года | 3 469 200 | 250 000 |
| 11. | 108/70 – здание чайной, 1981 г., 442 м$^2$, э/энергия, водоснабжение, канализация, отопление | г. Брест, в/г «Красный двор», в/ч 97061, тел.(80162) 484463 | 442 м$^2$, 3 года | 4 563 650 | 300 000 |
| 12. | 3/108 – адм. здание, 1957 г., 96,4 м$^2$, э/энергия, канализация, водоснабжение, отопление (котел) | г. Барановичи, ГУ «Барановичское ЭУ ВС» тел. (80163) 412592 | 31 м$^2$, 3 года | 320 070 | 20 000 |
| 13. | 24/5А – адм. здание,1885/1956 г., 182 м$^2$, э/энергия, отопление | г. Витебск, ул. Мичурина, 5,в ГУ «Борисовское ЭУ ВС» тел. (80212) 369352 | 100 м$^2$, 3 года | 1 032 500 | 60 000 |
| 14. | 24/1 – здание конторы КЭЧ, 1887/1976 г., 669 м$^2$, э/энергия, отопление | -//- | 12,9 м$^2$, 3 года | 133 190 | 10 000 |
| 15. | 2/79 – штаб – клуб, 1960 г., 53,58 м$^2$ | г. Орша, ул. Московская, 1а в/ч 96027, тел. (80216) 291760 | 53,58 м$^2$, 3 года | 553 210 | 30 000 |
| 16. | 2/25 – здание КПП, 1968 г., 94,9 м$^2$ | -//- | 94,9 м$^2$, 3 года | 979 840 | 50 000 |
| 17. | 2/5 – здание пожарного депо, 1945 г., 278 м$^2$. | -//- | 278 м$^2$, 3 года | 2 870 350 | 150 000 |
| 18. | 15/7 – здание бани, до 1917 г., 274,7 м$^2$, 1-й этаж, водоснабжение, э/энергия, канализация, естественное освещение, тех. паспорт | г. Гродно, ул. Фолюш, д. 6, в/ч 05733, тел. (80152) 557776 | 59,7 м$^2$, 3 года | 616 400 | 50 000 |
| 19. | 15/5 – здание штаба, 1917 г., 234 м$^2$, водоснабжение, э/энергия, канализация, естественное освещение, центральное отопление, тех. паспорт | -//- | 234 м$^2$, 3 года | 2 416 050 | 150 000 |
| 20. | 15/51 – здание штаба, 1951/1979/1981 г., 1324 м$^2$, водоснабжение, э/энергия, канализация, естественное освещение, центральное отопление, тех. паспорт | -//- | 1324 м$^2$, 3 года | 4 101 090 | 400 000 |
| 21. | 15/22 – общежитие до 1917 г., 671 м$^2$, водоснабжение, э/энергия, канализация, естественное освещение, центральное отопление, тех. паспорт | -//- | 671 м$^2$, 3 года | 6 928 070 | 350 000 |
| 22. | 15/17 – общежитие 1916/1979 г., 562 м$^2$, водоснабжение, э/энергия, канализация, естественное освещение, центральное отопление, тех. паспорт | -//- | 453,7 м$^2$, 3 года | 4 684 450 | 300 000 |
| 23. | 15/12 – здание хирургического отделения 1917 г., 594,4 м$^2$, водоснабжение, э/энергия, канализация, центральное отопление, тех. паспорт | -//- | 453,5 м$^2$, 3 года | 4 682 390 | 300 000 |
| 24. | 15/19 – учебный корпус 1917 г., 581 м$^2$, водоснабжение, э/энергия, канализация, центральное отопление, естественное освещение, тех. паспорт | -//- | 581 м$^2$, 3 года | 5 998 830 | 350 000 |
| 25. | 15/3 – казарма, 1917/1980 г., 2477 м$^2$, водоснабжение, э/энергия, канализация, центральное отопление, естественное освещение, тех. паспорт | -//- | 2477 м$^2$, 3 года | 5 115 000 | 450 000 |
| 26. | 15/290 – здание КПП, 1981 г., 18 м$^2$, э/энергия, центральное отопление, тех. паспорт | -//- | 18 м$^2$, 3 года | 185 850 | 10 000 |
| 27. | 15/83 – здание штаба, 1953/1983 г., 1288 м$^2$, э/энергия, центральное отопление, водоснабжение, тех. паспорт | -//- | 1288 м$^2$, 3 года | 3 989 580 | 350 000 |
| 28. | 15/20 – кафе, 1917 г., 660,9 м$^2$, э/энергия, центральное отопление, водоснабжение, тех. паспорт | -//- | 528 м$^2$, 3 года | 5 451 600 | 300 000 |
| 29. | 15/82 – здание столовой, 1952/1979/1980 г., 1020,9 м$^2$, э/энергия, центральное отопление, водоснабжение, тех. паспорт | -//- | 214,4 м$^2$, 3 года | 2 213 680 | 200 000 |
| 30. | 15/301 – здание столовой, 1987 г., 1812 м$^2$, э/энергия, центральное отопление, водоснабжение, тех. паспорт | -//- | 1812 м$^2$, 3 года | 5 612 670 | 400 000 |
| 31. | 15/167 – бытовое помещение1958 г., 25,7 м$^2$, тех. паспорт | -//- | 25,7 м$^2$, 3 года | 265 350 | 20 000 |

Организатор аукциона – Министерство обороны Республики Беларусь, адрес: 220034, Ф-2, г. Минск, Коммунистическая, 1.

Аукцион состоится **18 ноября 2009 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Первомайская, д. 9, 4 (четвертый) этаж.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Юридические лица представляют необходимый пакет документов, установленный законодательством Республики Беларусь.

Порядок и сроки осмотра объекта аренды согласовывать с организаторами аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются со дня опубликования и до **17.00 11 ноября 2009 г.** включительно по адресу: г. Минск, ул. Первомайская, д. 9, 4 (четвертый) этаж, комната 401.

Время работы: понед. – пятн. 9.00–13.00, 14.00–18.00. Справки по тел. (017) 297 11 09, ф. 294 75 35, 297 19 96, 297 10 41. Наш адрес в интернете: www.voentorg.by.

Участник аукциона, выигравший аукцион, после окончания аукциона должен подписать протокол о результатах аукциона.

Право на заключение договора аренды возникает у победителя аукциона с момента перечисления им организатору аукциона определенной в ходе аукциона цены. Срок заключения договора аренды – 3 года.

Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет Министерства обороны Республики Беларусь 3632901501004 в специализированном управлении Национального банка Республики Беларусь МФА 153006024, ул. Калиновского, 72а, 220114, г. Минск. УНП 100864035. Физическое лицо перечисляет задаток со счета договора банковского вклада, открытого в любом отделении любого банка Республики Беларусь.

Победитель аукциона заключает договор на аренду зданий, сооружений и помещений в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. В случае уклонения или отказа от заключения договора аренды или уклонения или отказа от оплаты стоимости приобретенного права на заключение договора аренды задаток победителю аукциона не возвращается.

Оплата стоимости приобретенного права на заключение договора аренды осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 3 (трех) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем аукциона.


# «ПАВЫШЭННЕ ТАРЫФАЎ НЕАБХОДНА ЗВЯЗАЦЬ З ДАХОДАМІ НАСЕЛЬНІЦТВА»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Дарэчы, ранняе падключэнне ацяплення запатрабавала дадатковых затрат — каля 35 мільярдаў рублёў. Аднак, лічыць Сяргей Сушко, такія выдаткі апраўданыя, паколькі заўсёды неабходна забяспечваць належны камфорт жыхароў. Ацяпляльны сезон павінен прайсці без збояў — прынамсі, для гэтага зроблена ўсё неабходнае. Цяпер пашпарты гатоўнасці маюць практычна ўсе цеплакрыніцы сістэмы Мінжылкамгаса. Праўда, крыху адстаюць іншыя ведамствы, якія маюць на сваім балансе адпаведнае абсталяванне. Аднак яшчэ ёсць пэўны час, каб выправіць недахопы. Дарэчы, ацэнка падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона будзе дадзена на чарговым пасяджэнні Урада.

Створаны належны запас паліва на асенне-зімовы перыяд: мазуту — больш чым 36 тысяч тон і дроў — каля 1,2 мільёна «кубоў». Даволі паспяхова адбываецца замяшчэнне імпартуемых энергарэсурсаў мясцовымі відамі паліва. На іх долю ў сістэме прадпрыемстваў Мінжылкамгаса цяпер прыпадае 27,1 працэнта агульнага паліўна-энергетычнага балансу. Як перакананы Сяргей Сушко, па выніках года гэты паказчык павінен скласці не менш чым 31 %.

Гэта дазваляе пэўным чынам змяншаць выдаткі на аказанне жыхарам комплексу жыллёва-камунальных паслуг неабходнага аб'ёму і якасці. Паколькі надалей прагназуецца магчымае змяншэнне дзяржпадтрымкі сістэмы ЖКГ, то адпаведнае пытанне становіцца асабліва актуальным. Цяпер насельніцтва ў сярэднім вяртае толькі 29,8 працэнта сабекошту «кватэрных» паслуг (28,1 % падчас ацяпляльнага сезона і 31,4 — у летні перыяд). Па водазабеспячэнні гэты ўзровень дасягнуў 40 %, каналізацыі — 32, вывазе і абясшкоджванні цвёрдых бытавых адходаў — амаль 42, карыстанні ліфтам — 29,6, цеплазабеспячэнні — 25,5.

Як нагадаў Сяргей Сушко, у пачатку 2000-х гадоў адпаведны паказчык складаў 50 працэнтаў і зменшыўся з-за адчувальнага росту расцэнак на энерганосьбіты. Аднак, на думку спецыяліста, павышэнне тарыфаў неабходна звязаць з даходамі насельніцтва. Інакш магчыма значнае павелічэнне неплацяжоў за кватэру. Нават цяпер пратэрмінаваная запазычанасць жыхароў па аплаце за кватэру складае 36 мільярдаў рублёў.

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі выступіла з прапановай аб павелічэнні тарыфаў. Калі будзе прынятае адпаведнае рашэнне (гэта можа адбыцца нават у найбліжэйшы час), то плацяжы ўзрастуць нязначна — запэўніў Сяргей Сушко. Таксама вельмі ўзважанай мяркуе быць тарыфная палітыка і налета. «У любым выпадку заўсёды трэба адстойваць інтарэсы простых людзей — нашых кліентаў», — адзначыў намеснік міністра.

Зрэшты, нават калі і не будзе прынятае рашэнне аб павышэнні тарыфаў, ужо за кастрычнік мы будзем разлічвацца за кватэру па-іншаму. Маецца на ўвазе, што ў плацёжках з'явяцца разлікі за ацяпленне. Як паведаміў Сяргей Сушко, у сярэднім разліку за аднапакаёвую кватэру агульнай плошчай 32 кв. метры, дзе пражываюць два чалавекі, падчас ацяпляльнага сезона складуць 108 тысяч рублёў. За двухпакаёўку (48 кв. метраў, тры жыхары) неабходна будзе выкласці 162 тыс., а за трохпакаёўку (69 кв. м, 3 чалавекі) — 226 тыс. руб. Гэта на 38—82 тыс. рублёў больш, чым плацілі ўлетку, калі не разлічваліся за ацяпленне.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

# ДАЙЦЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ ЧАС ЗАРЫЕНТАВАЦЦА

**— З 1 па 7 кастрычніка доля запасаў гатовай прадукцыі, рэалізаванай суб'ектам малога прадпрымальніцтва, у агульным аб'ёме рэалізацыі па рэспубліцы склала 8,9 %, — паведаміў Аляксандр ЛІХАЧЭЎСКІ, дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Мінэканомікі на чарговай прэс-канферэнцыі на тэму стварэння ўмоў для экспарту беларускіх тавараў прадпрымальнікамі. — Для параўнання магу сказаць, што за апошні тыдзень верасня гэты паказчык быў 7,9 %, г.зн. мы назіраем паступальную стабільную дынаміку на працягу месяца. Найбольшую ўдзельную вагу рэалізаванай прадпрымальнікам прадукцыі маюць прадпрыемствы, падначаленыя Гродзенскаму аблвыканкаму (56 %) і Міністэрству гандлю (27,3 %), найменшую — канцэрну «Белнафтахім» (0,9 %) і Мінгарвыканкаму (1,5 %).**

Аляксандр Ліхачэўскі заўважыў, што пакуль прадпрымальнікі недастаткова ведаюць пра аптовы гандаль беларускімі таварамі.

**Віктар МАРГЕЛАЎ, старшыня СЮА «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва»,** бачыць дзве галоўныя задачы, што стаяць перад грамадскімі аб'яднаннямі прадпрымальнікаў: практычная дапамога пры рэалізацыі тавараў айчыннай вытворчасці на ўнутраным і знешнім рынках, і, вядома ж, змяненне нарматыўнай базы для стварэння спрыяльных умоў для такой рэалізацыі. Самымі важнымі пытаннямі змяненняў у заканадаўстве, над якімі цяпер бізнэсоўцы працуюць сумесна з органамі дзяржкіравання, на думку Віктара Ягоравіча, з'яўляюцца свабоднае цэнаўтварэнне, пытанні фарміравання сабекошту прадукцыі, стварэнне сур'ёзнага антыманапольнага органа і інш.

Нягледзячы на тую працу, што цяпер вядзецца па стварэнні льготных умоў для экспарту беларускіх тавараў прадпрымальнікамі, усе разумеюць, што гэта справа не аднаго дня.

— Нашы індывідуальныя прадпрымальнікі былі арыентаваныя ў зваротным напрамку, гэта значыць на імпарт прадукцыі. А сёння мы пашыраем магчымасці і для экспарту. Прадпрымальнікам трэба час, каб пераарыентавацца, знайсці партнёраў за мяжой, і таму разлічваць на тое, што яны ўсе адразу рынуцца — не даводзіцца, — лічыць **Вячаслаў ДРАГУН, намеснік міністра гандлю.** — Мы іх таксама разумеем, бо трэба мець нейкія сувязі, проста так, умоўна кажучы, узяць валізы і паехаць на рынак на Смаленшчыну, напэўна, бесперспектыўна. Прадпрымальнік павінен пралічыць сваю рызыку і адпаведным чынам падрыхтавацца да гэтага бізнэсу.

Такой жа думкі прытрымліваецца і Віктар Маргелаў:

— Ёсць дзве прычыны, чаму з гэтымі ці іншымі аптовымі складамі прадпрымальнікі будуць працаваць: адных, на жаль, жыццё прымусіць, а другіх прымусіць інтарэс. А насамрэч умовы вельмі цікавыя. Толькі дайце трохі часу, трэба правесці нейкую працу, расказаць пра нарматыўныя акты, як афармляць, як вывозіць, няхай нехта пробна з'ездзіць... Прынамсі, станоўчы досвед ад адзінкавых паездак ёсць, калі людзі заараблялі нядрэнныя грошы.

Аднак задумацца над новымі ўмовамі і магчымасцямі трэба не толькі прадпрымальнікам, але і айчынным вытворцам:

— Прадпрымальнікі не будуць купляць той тавар, які не карыстаецца попытам. Калі ў дзяржаўныя крамы прадпрыемствы пастаўляюць нейкую прадукцыю і яна там можа ляжаць, то прадпрымальнік будзе браць толькі тое, што карыстаецца попытам за мяжой — у той жа Літве, Маскве, Піцеры, Бранску, — лічыць **Тамара ЧАХОЎСКАЯ, генеральны дырэктар ГА «Беларускі саюз прадпрымальнікаў».** — Трэба рабіць зніжкі, калі вытворцы хочуць рэалізаваць свой тавар. Як за мяжой: умоўна кажучы, калі адна майка каштуе 5 тысяч, а тры майкі — 9 тысяч. Прадпрыемствам трэба глядзець: або іх тавар будзе ляжаць на складах, альбо прадавацца.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Замор'е

## МІКРАПІГІ — НОВАЕ ЗАХАПЛЕННЕ БРЫТАНЦАЎ

Малюсенькія мікрапігі сталі павальным захапленнем, якое ахапіла Вялікабрытанію. Дзіцяняты-мікрапігі памерам усяго з кубак для гарбаты, а дарослая асобіна — вышынёй не больш за 35 сантыметраў.



Джэйн Крофт займаецца гадоўляй гэтых свінак на ферме «Little Pig Farm» у Крыстчарчы, дзе яны прадаюцца па 700 фунтаў стэрлінгаў за штуку. Многія знакамітасці купляюць сабе такіх улюбёнцаў, напрыклад, акцёр Руперт Грынт купіў сабе такога. (Pig — англ., свіння.)

## П'ЯНЫ АБРАБУЕ — НЕ ЗАЎВАЖЫЦЬ

**Работнікі аднаго з амерыканскіх супермаркетаў аддалі грошы з касы п'янаму наведвальніку, якога яны прынялі за рабаўніка. Інцыдэнт адбыўся ў мястэчку Ватэрлоа ў штаце Аёва.**

Двое прадаўцоў за прылаўкам жудасна напалохаліся, калі ў краму, хістаючыся, зайшоў невядомы мужчына. Руку ён трымаў у кішэні, і работнікі вырашылі, што ён хавае там пісталет. Імкнучыся не рабіць рэзкіх рухаў, яны вынялі з-пад прылаўка мяшок з дзённай выручкай, які чакаў прыезду інкасатараў, і шпурнулі яго пад ногі наведвальніку. Той, зрэшты, на кінутыя ў яго грошы не адрэагаваў, павярнуўся і сышоў, а прадаўцы выклікалі паліцэйскіх, паведаміўшы аб спробе рабавання. Таямнічы наведвальнік быў затрыманы. Высветлілася, што ў краму ён зайшоў выпадкова, бо моцна перабраў піва. Нікога рабаваць ён не збіраўся, але яму пагражае штраф за знаходжанне ў стане алкагольнага ап'янення ў грамадскім месцы. Самі ж работнікі крамы растлумачылі, што да гэтага інцыдэнту іх рабавалі двойчы, таму любога падазронага наведвальніка яны цяпер прымаюць за злачынцу і зрабіць з сабой нічога не могуць.

## З РАЗУМНАЙ ЖОНКАЙ ДАЎЖЭЙ ПРАЖЫВЕШ

**Шведскія навукоўцы прыйшлі да высновы, што мужы разумных жанчын жывуць даўжэй. Таму мужчыну, які хацеў бы павялічыць працягласць жыцця, варта звязаць свой лёс з разумнай і адукаванай жанчынай, сцвярджаюць даследчыкі Стакгольмскага ўніверсітэта. Вывучыўшы 1,5 млн пар, навукоўцы прыйшлі да высновы, што працягласць жыцця залежыць, у першую чаргу, ад разумовых здольнасцяў і ступені адукаванасці жанчыны. Пры гэтым інтэлектуальны ўзровень мужчыны не мае такога важнага значэння.**

«Традыцыйна жанчына нясе значна большую частку адказнасці за дом, чым мужчына. У выніку адукацыйны ўзровень жанчыны мае важнейшае значэнне, бо менавіта яна прымае рашэнні адносна харчавання і ладу жыцця мужа і жонкі», — кажуць даследчыкі. Пры гэтым навукоўцы адзначаюць, што ёсць сфера, у якой уклад мужчыны мае таксама істотную ролю ў працягласці жыцця партнёраў. Гаворка ідзе аб памеры заробку. Чым больш мужчына прыносіць дадому грошай, тым больш высокіх стандартаў жыцця прытрымліваецца сям'я. Гэта датычыцца ўсіх бакоў жыцця, уключаючы паўнавартасны адпачынак, харчаванне, а таксама медыцынскае абслугоўванне.

## ГОЛЫ СНЯДАНАК

**У канцы верасня — пачатку кастрычніка ў Мельбурне, Аўстралія, традыцыйна праходзіць штогадовы фэст «Melbourne Fringe Festival», які ўключае ў сябе масу цікавых мерапрыемстваў. Адно з іх даволі нестандартнае. Гэта — «Голы сняданак», які адбыўся 6 кастрычніка ў мельбурнскай кавярні.**



У ім мог паўдзельнічаць любы ахвотны, гатовы без сарамлівасці скінуць адзежу і ў такім выглядзе паснедаць. Прадзюсар Наталля Бак *(на фота)* прызналася, што ідэя падобнага мерапрыемства прыйшла да яе падчас абеду на адкрытым паветры ў гарачы дзень. Тады ёй прыйшло ў галаву, што яна атрымала б ад трапезы большае задавальненне, калі б можна было зняць адзежу. Удзельнікі «Голага сняданку» гутараць і снедаюць у кавярні, размешчанай у раёне Мельбурна Fitzroy. Гэтая падзея была заснаваная на ідэі святкавання жыцця, як твору мастацтва і даніны павагі чалавечым формам.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

Падпіска-2009

# З ЛЁГКАЙ РУКІ — У НАДЗЕЙНЫЯ РУКІ

У папярэднім нумары газеты мы анансавалі розыгрыш штоквартальных прызоў па выніках падпіскі на 4 квартал 2009 года, што адбыўся ў сценах рэдакцыі. Відавочна, што многія нашы падпісчыкі, якія запоўнілі і даслалі купон у газету, зачакаліся спісаў шчаслівучыкаў. Таму з задавальненнем іх друкуем, спадзеючыся на тое, што пакрыўджаных на лёс не будзе.

***Вынікі розыгрышу рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» за 4-ы квартал 2009 года***

**Электрачайнік Adler AD 122**

Гурноўскі Аляксандр Сцяпанавіч, в. Моўчадзь, Баранавіцкі раён;

Яроцкая Ядзвіга Іванаўна, в. Слабодка, Браслаўскі раён;

Гардзейчык Валянціна Міхайлаўна, г. Хойнікі;

Ласіцкі Іван Іванавіч, в. Дворышчы, Лідскі раён;

Ганчароў Алесь Васільевіч, г. Магілёў;

Шалупенка Васіль Іванавіч, в. Мікулічы, Бярэзінскі раён;

Шуцько Алена Іосіфаўна, г. Мінск.

**Блэндар FF-5280**

Акуліч Міхаіл Вікенцьевіч, в. Уцёс, Баранавіцкі раён;

Атрахімовіч Глафіра Міхайлаўна, в. Іванаўка, Докшыцкі раён;

Попчанка Фёдар Фёдаравіч, в. Лукі, Калінкавіцкі раён;

Анісім Ніна Уладзіміраўна, г.п. Любча, Навагрудскі раён;

Новікава Вера Пятроўна, г. Магілёў;

Клокель Раіса Уладзіміраўна, в. Затур'е, Нясвіжскі раён;

Круглік Вольга Канстанцінаўна, г. Мінск.

**Каляровы тэлевізар «Віцязь»**

Гананайка Іна Аляксееўна, г. Ляхавічы;

Нажога Алена Станіславаўна, в. Абруб, Глыбоцкі раён;

Пронькіна Надзея Уладзіміраўна, г. Калінкавічы;

Гіль Марына Уладзіміраўна, г. Смаргонь;

Дзенісевіч Ларыса Міхайлаўна, в. Коўба, Клічаўскі раён;

Пасініцкі Яўген Адольфавіч, в. Трасцянец;

Захарэвіч Уладзімір Барысавіч, г. Мінск.

**Пыласос «Samsung»**

Булда Пётр Сцяпанавіч, в. Камянец.

**Халадзільнік «Атлант»**

Новікава Раіса Мікалаеўна, в. Слабада, Бабруйскі раён.

Яшчэ раз віншуем усіх пераможцаў з новымі прызамі!

Просім прабачэння ў тых падпісчыкаў, чые звесткі надрукаваныя недакладна, бо не ўсе купоны запоўненыя разборліва.

Свае прызы, паважаныя прыхільнікі «Звязды», можна атрымаць, пачынаючы з панядзелка, 12 кастрычніка, у рэдакцыі газеты. Пры сабе пажадана мець пашпарт і падпісную квітанцыю.

Суперпрызы — пыласос, тэлевізары і халадзільнік — супрацоўнікі рэдакцыі збіраюцца даставіць на месца кожнаму з пераможцаў у самы бліжэйшы час, калі пачнецца падпісная кампанія на 1-е паўгоддзе 2010 года, і ўручыць іх ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці супрацоўнікаў РУП «Белпошта» і кіраўніцтва мясцовай «вертыкалі».

Упэўнены, што ўдача яшчэ ўсміхнецца тым, каму цяпер не пашанцавала.

Заставайцеся з намі, гуляйце і выйгравайце!

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

## ЗАМЕСТ КАМЕНТАРЫЯ

...Мусіць, не трэба казаць, што кожны розыгрыш прызоў ператвараецца ў маленькае свята? Бо, па-першае, прыходзяць госці. І дарагія. Як правіла, нашы дзелавыя партнёры — прадстаўнікі пошты і «Белсаюздрука», якія займаюцца падпіскай і продажам газеты, нашы пастаянныя, адданыя чытачы. Як мы іх знаходзім? Тэлефануем тым з мінчан, што даслалі карткі, пытаемся, ці не хочуць прыняць удзел у розыгрышы, ці выпадае прыйсці? З дзесяці «апытаных» два, як правіла, згаджаюцца.

На гэты раз, як ужо паведамлялася, імі, гасцямі, незалежнымі прадстаўнікамі, сталі супрацоўніца акадэмічнага Інстытута мовы і літаратуры Алеся Іванаўна Шамякіна (так-так, дачка... Па-ранейшаму вядомага і любімага пісьменніка), дацэнт універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Іван Іванавіч Астроўскі (зноў жа той самы — у самым харошым сэнсе гэтага слова — вершаплёт, неаднаразовы пераможца конкурсу «Хто каго») і начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Жанна Васільеўна Шабека.

Ім мы і паведамілі, што, як кажуць, на кану: сем электрачайнікаў (па адным на кожную вобласць і горад Мінск), сем блэндараў, сем тэлевізараў «Віцязь», адзін пыласос (дадатковы прыз для Мінскай вобласці, дзе найбольш нашых падпісчыкаў) і адзін халадзільнік «Атлант». Вельмі хацелася, каб кожны з прызоў патрапіў у добрыя рукі. За асобных падпісчыкаў мы нават шчыра хварэлі...

Ды і як не хварэць, калі сярод іншых была, напрыклад, картка ад 80-гадовай Соф'і Рыгораўны Корык з Бярэзіншчыны, якая, як паведаміла, выпісвае «Звязду» ўсё свядомае жыццё, а да таго (і столькі ж!) гэту газету выпісваў бацька, за сужэнцаў Сарокаў са Стаўбцоўшчыны, якія маюць, лічы, такі ж стаж сяброўства з найстарэйшай беларускамоўнай і адзначаюць сёлета залатое вяселле, за сям'ю Савёнкаў з Глыбоччыны, за спадара Ляха з Дзятлава, за спадарыню Барысенку, маладую маму дваіх дзяцей і студэнтку з Мінска...

Але ж мы ведаем ужо, што хварэй не хварэй, а ўсё будзе, як будзе: некаму ляжа шчаслівая карта, некаму не...

Імёны першых ужо вядомыя, і рэакцыю на выйгрыш асобных з іх адзін з гасцей (не трэба казаць, хто канкрэтна?) нават ужо прадугледзеў:

Скача бабка ды заве
На падмогу дзеда:
Нешта выйграла ў «Звяздзе» —

Што такое — блэндар?

Таму патлумачым (раптам і ў дзеда цяжкасці ўзнікнуць?) — для гаспадыні, на кухні, гэта вельмі патрэбная рэч: з яе дапамогай можна здрабніць каву, гародніну для салаты, бульбу на клёцкі і дранікі, мяса... І месца не займае.

Іншыя прызы каментарыяў не патрабуюць. А вось іх адсутнасць...

Хтосьці выйграў блэндар,
Хтосьці — пыласос...
Толькі я не ведаў,
Што мне дуля ў нос.

Так, на гэты раз не пашчасціла ў латарэі (на жаль... І, хочацца верыць, пакуль...) і нашым гасцям, і вельмі многім з тых, хто спадзяваўся. Але яны, хочацца верыць, не пакрыўдзяцца. Бо латарэйных білетаў не куплялі, грошай не трацілі.

А за тыя, што аддалі на падпіску, пяць разоў на тыдзень будуць атрымліваць газету — сваю, найстарэйшую. І тым самым будуць падтрымліваць тое, што сапраўды ў тым мае патрэбу — нашу мову.

За што ўсім і кожнаму з падпісчыкаў асобны шчыры дзякуй.

**Вашы звяздоўцы.**




**Сёння, дарагія нашы чытачы, мы будзем з вамі гатаваць проста смачную ежу з простых прадуктаў. Не будзем развяжаць над тым, ці карысныя гэтыя стравы. Кажуць, калі гатаваць з добрым настроем і есці ў прыемнай кампаніі — то ўся ежа карысная! Так што асалоды вам.**

### ТВАРОЖНАЕ ПІРОЖНАЕ

*Яўны плюс гэтага ласунку — нічога не трэба выпякаць! Піроржнае атрымліваецца цудоўным, спалучае ў сабе два смакі — вельмі далікатнае тварожнае суфле зверху і салодкая духмяная хрусткая праслойка знізу.*

***На 4 пірожныя нам спатрэбіцца:*** *для асновы — 6 цукровых пячэнняў (кшталту «Юбілейнае»), каля 30 г сметанковага масла, 2 сталовыя лыжкі з горкай варанага згушчанага малака.* ***Для тварожнага суфле:*** *250 г тварагу, 100 г смятаны, 1/2 чайнай лыжкі жэлаціну, 5—7 чайных лыжак цукру, 0,5 чайнай лыжкі цэдры лімона.*

У мяне няма спецыяльных бляшаных формачак для пірожных, таму я брала паўлітровую пластыкавую бутэльку з-пад мінералкі, разразала яе на колцы вышынёй 4 см. (З адной бутэлькі атрымліваюцца 2 колцы). Важна, каб у бутэлькі былі роўныя сценкі — без звужэнняў і расшырэнняў. Цяпер пачнём гатаваць самі пірожныя.

Жэлацін замачыць у 50 мл халоднай гатаванай вады. Калі жэлацін разбухне і стане раўнамерна празрыстым, паставіць кубак з жэлацінам у міску з кіпенем і давесці да поўнага рассмоктвання жэлаціну. Тварог і смятану злёгку падагрэць. Пакласці ў блэндар. Туды ж усыпаць цукар, уліць разведзены жэлацін і пакласці лімонную цэдру. Узбіць да аднароднага стану. (Калі няма блэндара, можна выкарыстаць міксер ці венчык).

Пячэнне растаўчы ў буйную крупу (але не да стану мукі). Сметанковае масла давесці да пакаёвай тэмпературы. Варанае згушчанае малако крыху падагрэць. Змяшаць пячэнне, масла і згушчанае малако.

Плоскае блюда заслаць фольгай. На яго вылажыць нашы колцы-формачкі. Па колцах раскласці аснову — пячэнне са згушчонкай. Пальцамі разраўняць яе па дне. Зверху вылажыць тварожную масу. Верх разгладзіць нажом або лапаткай. Паставіць у халадзільнік мінімум на 1 гадзіну, а лепш на ноч.

З гатовых пірожных зняць колцы (я спачатку тоненькім ножыкам правяла па сценках колцаў, а пасля накрыла пірожнае кавалачкам п/э плёнкі і пальцамі выціснула пірожныя ўніз на блюда). Засталося толькі ўпрыгожыць нашы пірожныя. Зверху выкладваем па кавалачку садавіны ці ягад, што ёсць у доме, а збоку абсыпаем таркаваным шакаладам або арэхамі.

### ЯЛАВІЧЫНА З БАНАНАМІ

*Рэцэпт гэтай стравы вычытала ў інтэрнэце. Паставілася скептычна, але ўсё ж вырашыла паспрабаваць прыгатаваць. І ніяк не чакала, што страва атрымаецца настолькі смачнай! Я нават не паспела раскласці мяса па талерках — мае хатнія з'елі ўсё да кавалачка проста з бляхі.*

***Вазьміце:*** *700 г мякаці ялавічыны або цяляціны, 1 банан, 200 г сыру, 4—5 ст. лыжак маянэзу, соль і чорны перац на смак.*

Старанна зрэзаць з ялавічыны ўсе плёнкі. Нарэзаць тонкімі лустачкамі ўпоперак валокнаў і добра адбіць з абодвух бакоў. Вылажыць у глыбокую бляху адным слоем.

Выкладваючы мяса на патэльню, я стараюся яго не расцягваць, а «скамячыць», для таго, каб у час запякання пры «сцісканні» на патэльні на заставаліся пустыя месцы.

Мяса злёгку пасаліць і паперчыць. Банан парэзаць тонкімі (не больш за 2 мм таўшчынёй) долькамі і вылажыць у адзін слой на мяса. Зверху пасыпаць цёртым сырам. Сыр ушчыльніць вільготнай рукой і намазаць маянэзам. Запякаць у духоўцы 45—60 хвілін. Зверху можна выціснуць сок з долькі лімона — атрымліваецца наогул выдатна!

### ЯДОМЫ АНЕКДОТ

***Рэцэпты прыгатавання яек***

*Па-цыганску: скрадзіце 2 яйкі...*

*Па-яўрэйску: купіце 4 яйкі па цане двух, лішнія 2 прадайце.*

*Па-руску: купіце ў яўрэя 2 яйкі...*

*Па-нова-руску: купіце 2 яйкі па цане чатырох. Лепш браць у Фабержэ...*

*Па-ўкраінску: пазычце ў суседзяў 2 яйкі...*

*Па-савецку: займіце чаргу па яйкі...*

*Па-студэнцку: вазьміце ваду, у якой калісьці варылі яйкі...*

*Па-амерыканску: прадайце яўрэю оптам 4 яйкі па цане двух. На вырачаныя грошы схадзіце ў McDonalds.*

*Па-англійску: дачакайцеся сняданку...*

*Па-эстонску: вазьміце курыцу. Дачакайцеся, пакуль яна знясецца...*

*Па-афрыканску: вазьміце яйкі страуса...*

Міністр культуры Павел ЛАТУШКА:

# «УЧОРА НА НОЧ ЧЫТАЎ ШЫЛЕРА Ў ПЕРАКЛАДЗЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Вы на пасадзе міністра ўжо чатыры месяцы. Якія прыярытэты вызначылі для сябе за гэты час?***

— У нашай краіне створана сістэма падтрымкі развіцця сферы культуры ў розных кірунках. Падтрымку дзяржавы адчуваюць і навучальныя ўстановы ад сярэдніх да вышэйшых у сферы культуры, раённыя дамы і цэнтры культуры, бібліятэкі і музеі, вядучыя мастацкія ўстановы і калектывы нашай краіны. Склалася сістэма разнастайных мерапрыемстваў агульнарэспубліканскага і рэгіянальнага ўзроўню, якія вядомыя не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

Сістэма створана і вынікова працуе. Але зразумелым з`яўляецца тое, што час патрабуе з`яўлення новых ідэй і ініцыятыў, новых праектаў, калі хочаце адкрыцця новых талентаў, імёнаў у нашай культуры. І тут, на жаль, часта адбываецца невыкарыстанне магчымасцяў з'яўлення гэтага новага, наватарскага ў нашым асяроддзі.

Прыярытэт у тым, каб стварыць умовы для з'яўлення новых культурных праектаў і ідэяў, адкрыцця новых талентаў, імёнаў у нашай культуры. Прыярытэт — падтрымка таленавітай моладзі, якая ажыццяўляецца пад патранатам Прэзідэнта краіны. Важна стварыць дадатковыя магчымасці дзеля рэалізацыі таленту маладых, і ўжо з канца гэтага года мы пачынаем у раёнах краіны праводзіць Рэспубліканскі конкурс маладых талентаў «Зорка ўзышла над Беларуссю». Важна разумець і заўжды памятаць, што ў падмурку нашай культуры знаходзіцца праца ў раёнах, малых гарадах і вёсках. Неабходна і далей захоўваць і выконваць сацыяльныя стандарты дзяржавы ў сферы культуры — гэта даступнасць культуры. Яна складаецца з трох базавых элементаў. Найперш — даступнасць у атрыманні адукацыі ў сферы культуры. Другое — магчымасць рэалізаваць сябе ў сферы культуры (праз удзел у розных гуртках, аматарскіх калектывах, народнай самадзейнасці...). Трэці элемент даступнасці — гэта магчымасці наведваць установы культуры: тэатры, кіно, музеі...

> **Наша архітэктурная спадчына — гэта наш гонар, сведчанне прыналежнасці да агульнаеўрапейскай гісторыі і адначасова абавязак перад будучымі пакаленнямі.**

Прыярытэт таксама — узмацненне падтрымкі нацыянальнага мастацтва. У нас ёсць цудоўныя калектывы, тэатры, музеі... Яны патрабуюць далейшай увагі і падтрымкі з боку дзяржавы. У нас створана добрая сістэма фестывальных мерапрыемстваў, якіх штогод праходзіць больш за 50. Але надышоў час надаць некаторым з іх «новае аблічча». Міністэрства, напрыклад, працуе над новай канцэпцыяй «Славянскага базару». Неабходна пашырэнне прыватнай ініцыятывы ў сферы культуры, прадусім, што тычыцца спраў беларускай эстрады і кіно. Тут вельмі важным з'яўляецца далейшае развіццё прадзюсавання ў гэтых сферах. Патрэбна стварыць магчымасць для праяўлення новых ініцыятыў, з'яўлення новых праектаў у сферы культуры, у якіх часта праз нашую бюракратызаванасць няма шанцу прабіцца на свет. Вельмі важна больш шырока паказваць беларускую культуру ў свеце праз дні беларускай культуры, культурныя праекты, гастролі, бо культура — гэта таксама імідж краіны.

***— Спадар Павел, ці змянілася альбо зменіцца з вашым прыходам каманда міністра, ці з'явяцца новыя людзі?***

— Разумееце, не пачынаецца праца новага міністра з чыстага аркуша. Папярэднікі зрабілі шмат, і не карыстацца гэтым было б няслушна. Імкнуся зразумець, што трэба ўдасканаліць, а што захаваць і палепшыць, дзе рэалізаваць новую ініцыятыву, падыход. Змены, вядома, будуць адбывацца, але важна разглядаць гэта як натуральны лагічны эвалюцыйны працэс.

## «Мы павінны дайсці з культурай да кожнага чалавека»

***— Адным з галоўных нараканняў на Міністэрства культуры была недасканалая праца з грамадствам: абмеркаванні праблемных пытанняў праводзіліся рэдка, многія звароты грамадскасці заставаліся без адказаў. Ці будуць тут змены?***

— Дзейнасць Міністэрства культуры звязана перадусім з задавальненнем патрэбаў грамадства ў сферы культуры. Ці гэта магчыма — плённа працаваць без штодзённага дыялогу з тымі, для каго функцыянуе ўся сістэма сферы культуры? Важным падаецца актывізацыя ўзаемадзеяння з усімі творчымі саюзамі і аб'яднаннямі нашай краіны. Праз рады і саветы, якія дзейнічаюць пры міністэрстве, павінен удасканальвацца такі дыялог. Мы распачалі працу па стварэнні апякунскіх саветаў пры вядучых установах культуры нашай краіны, напрыклад, пры Вялікім тэатры оперы і балета, Купалаўскім тэатры і іншымі. Гэта еўрапейская практыка, існуе яна і ў нашых расійскіх суседзяў. Мы павінны дайсці з культурай да кожнага чалавека. Адным з новых спосабаў можа стаць праект «Культурная сталіца Беларусі», калі на цэлы год адзін з раёнаў, гарадоў Беларусі будзе актыўным цэнтрам культурных мерапрыемстваў, якія будуць праходзіць пры падтрымцы Міністэрства культуры.

Дыялог будзе пашырацца, але важнай справай з'яўляецца яго канструктыўны характар.



Правядзенне нарады па пытаннях рэстаўрацыі Мірскага замка і добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі. 11 ліпеня 2009 года

***— Балючае пытанне для многіх і для мяне асабіста — рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры. Многія ў занядбанні, іншыя рэстаўруюцца недасканала, некаторыя ўвогуле руйнуюцца. На вашу думку, з якога боку трэба падступацца да гэтай праблемы?***

— Давайце спачатку да гэтага падыходзіць без лішніх эмоцый і катэгарычных ацэнак, акрэсліваючы вельмі дакладна, што трэба рабіць у гэтай галіне сёння і заўтра. У краіне паступова адбываецца рэканструкцыя найважнейшых помнікаў нашай гісторыка-культурнай спадчыны, цяпер праз Дзяржаўную інвестыцыйную праграму па даручэнні Прэзідэнта ідзе падтрымка трынаццаці такіх аб'ектаў. І такі падыход у Рэспубліцы Беларусь раней не меў месца, нават у часы БССР, калі працы вяліся толькі ў Мірскім замку.

Зразумела, цяпер найбольш на слыху Палацава-паркавы ансамбль у Нясвіжы і Замкавы комплекс у Міры, дзе вядуцца вялікія работы. Зразумела, што калі ідзе праца, то могуць узнікаць і праблемныя моманты, рабочыя пытанні, якія трэба своечасова вырашаць. Будзе ўзмацняцца навуковы нагляд за рэстаўрацыяй, праца спецыяльна створанага дзеля гэтых мэтаў інструмента — навукова-метадычнай рады пры міністэрстве.

> **Будзе ўзмацняцца навуковы нагляд за рэстаўрацыяй, праца спецыяльна створанага дзеля гэтых мэтаў інструмента — навукова-метадычнай рады пры міністэрстве.**

Каб ведаць, што рабіць, для пачатку трэба ўсё ўпарадкаваць, даведацца пра дакладны стан аб'ектаў. Для гэтага наша міністэрства ўжо выдала Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, які налічвае больш за 4780 аб'ектаў. Наступны крок — пошук фінансавання. Зразумела, на гэта дзяржава выдаткоўвае рэсурсы з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Але зважаючы на колькасць помнікаў і іх стан, трэба шукаць альтэрнатыўныя дадатковыя фінансавыя крыніцы. Гэта могуць быць сродкі прыватных — як беларускіх, так і замежных — інвестараў. Мы гатовыя прапанаваць зацікаўленым набыццё маёнткаў, сядзібаў, але пры ўмове іх рэстаўрацыі пад навуковым наглядам Міністэрства культуры. Мы прапануем таксама нашчадкам славутых беларускіх родаў узяць чынны ўдзел у рэстаўрацыі родавых маёнткаў. Таксама да гэтай працы трэба прыцягваць грамадскасць. Міністэрства культуры з'яўляецца заснавальнікам грашова-рэчавай латарэі «Скарбніца». Грошы ад продажу білетаў будуць накіраваныя на рэканструкцыю аднаго з важнейшых аб'ектаў нашай гісторыі. На меркаванне грамадскасці прапануем разгледзець першачарговасць рэстаўрацыі на выбар — Наваградскага, Гальшанскага і Крэўскага замкаў.

Дарэчы, цяпер прапрацоўваецца магчымасць пачатку рэстаўрацыі з прыцягненнем дзяржаўных сродкаў палаца Валовічаў у Свяцку, што пад Гроднам, пра які шмат пісалася ў прэсе. Наша архітэктурная спадчына — гэта наш гонар, сведчанне прыналежнасці да агульнаеўрапейскай гісторыі, і адначасова абавязак перад будучымі пакаленнямі.




## «Князь Мацей Радзівіл у апошнім лісце напісаў мне...»

***— Спадар Павел, вы бралі чынны ўдзел у V З'ездзе беларусаў свету. Якія канкрэтныя вынікі з'езда можаце адзначыць? Якія планы міністэрства ў дачыненнях з дыяспарай?***

— Важна, што большасць удзельнікаў з'езда тыя, хто шчыра імкнуўся чуць і разумець адзін аднаго. І аб'ядноўвала нас агульнае жаданне супрацоўнічаць дзеля захавання, умацавання і далейшага развіцця беларускай нацыі, нашай культуры і мовы, і, зразумела, галоўнага — дзяржаўнасці. З кіраўніцтвам аб'яднання «Бацькаўшчына» мы сустракаліся і пасля з'езда ў верасні, змястоўна абмеркавалі нашы далейшыя стасункі. Мы гатовыя перайсці да рэалізацыі тых папярэдніх дамоўленасцяў, аб якіх ішла размова. Міністэрства культуры зацікаўлена супрацоўнічаць з беларусамі замежжа, ствараць культурныя цэнтры Беларусі ў краінах-суседзях, ствараць бібліятэкі беларускай літаратуры за мяжой. Адзін з важных кірункаў такой дзейнасці — супрацоўніцтва ў галіне вяртання беларускіх каштоўнасцяў на Радзіму. Супрацоўнічаў з беларусамі замежжа і маю свой, прабачце, уласны сантымент, бо з чатырнаццаці гадоў працы на дыпламатычнай службе вельмі шмат часу прысвячаў паглыбленню супрацоўніцтва з беларусамі Польшчы. Лічу важным працягваць гэту справу ў дачыненні да супрацоўніцтва ў галіне культуры з беларусамі замежжа ў розных краінах свету. У наступным годзе, напрыклад, адбудзецца шэраг мерапрыемстваў да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы.

***— І прыклады такога супрацоўніцтва мы ўжо бачым! Візіт князёў Радзівілаў, з якімі вы сустракаліся і абедалі ў Мінску, — які ёсць ад яго плён? Ці верагодная нейкая праца ў галіне наладжвання сувязяў і з іншымі нашчадкамі славутых беларускіх родаў?***

— Нашы кантакты з нашчадкамі Радзівілаў пачаліся некалькі гадоў таму — на пасадзе амбасадара Беларусі ў Польшчы пазнаёміўся са спадарамі Мацеем і Мікалаем Радзівіламі. Сёння можам канстатаваць сталы і ўзаемавыгадны характар гэтых стасункаў. Радзівілы, зразумела, зацікаўленыя ў аднаўленні, перадусім, палаца ў Нясвіжы і гатовы зрабіць свой унёсак у гэтую важную справу. Яны ўжо перадалі для музеефікацыі арыгінальныя гравюры XVI стагоддзя, копіі партрэтаў сваіх славутых продкаў. У ходзе апошняга візіту, які адбыўся 19—23 ліпеня, Радзівіламі перададзены Нацыянальнаму музею-запаведніку «Нясвіж» 162 копіі партрэтаў іх продкаў — гравюраў прыдворнага мастака Гершкі Ляйбовіча, якія захоўваліся ў прыватным архіве князёў. Днямі атрымаў чарговы ліст ад князя Мацея Радзівіла, дзе пан Мацей інфармуе аб падрыхтоўцы прафесійнай копіі абраза Божай Маці, якая знаходзілася ў замкавай капліцы. У канцы гэтага месяца самі Радзівілы прывязуць яе ў Нясвіж, каб перадаць музею-запаведніку «Нясвіж». Мы дамовіліся, што з асабістага архіва Радзівілаў зможам атрымаць і іншыя матэрыялы. Па запрашэнні князя ў Варшаву накіруецца супрацоўнік нашага музея, каб азнаёміцца з фамільнымі архіўнымі зборамі.

Але мы не будзем абмяжоўвацца толькі кантактамі з нашчадкамі роду Радзівілаў. У нашых планах сумесна з Міністэрствам замежных спраў Беларусі актывізаваць альбо наладзіць кантакты з прадстаўнікамі іншых славутых родаў, чые карані звязаныя з Беларуссю: Вішнявецкімі, Сапегамі, Міцкевічамі, Святаполк-Чацвярцінскімі, Агінскімі, Цеханавецкімі...

> *ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»*
> *Павел ЛАТУШКА нарадзіўся ў 1973 годзе ў Мінску. Вучыўся на гістфаку Белдзяржуніверсітэта, аднак скончыў юрыдычны факультэт БДУ са спецыялізацыяй па міжнародным праве (1995). Таксама ў 1996 годзе завочна скончыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. Займаў розныя пасады ў структуры Міністэрства замежных справаў. У 2000—2002 гады — прэс-сакратар МЗС. З 2002 па 2008 год быў амбасадарам Беларусі ў Польшчы — самым маладым на той час беларускім амбасадарам. Валодае польскай і англійскай мовамі.*

## «Маю беларускамоўнасць сфарміравалі бацька і консульская праца ў Беластоку»

***— Спадар Павел, вас ужо паспелі назваць «першым беларускамоўным міністрам». Якія захады плануюцца ў галіне пашырэння ўжывання грамадствам беларускай мовы?***

— Зразумела, немагчыма ўявіць перспектывы існавання і развіцця беларускай культуры без беларускай мовы. Таму самым натуральным асяроддзем для выкарыстання беларускай мовы з'яўляецца сфера культуры.

Нельга ўявіць беларускую культуру без слова Максіма Багдановіча і Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча і Васіля Быкава, іншых класікаў нашай літаратуры. Дарэчы, у гэтым годзе ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры будзе створана сталая экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці класіка беларускай і сусветнай літаратуры Васіля Быкава.

На мой асабісты светапогляд у дачыненні да мовы зрабілі ўплыў два галоўныя чыннікі. Мой бацька — а гэта нябачная эмацыйная генетычная сувязь з продкамі. А таксама дыпламатычная праца ў Беластоку, дзе я быў уражаны стаўленнем беларускай меншасці ў Польшчы да захавання і развіцця беларускай культуры непарыўна са словам. У беларускай мове лічу дзейсным ісці шляхам уласнага прыкладу: шанаваць слова, размаўляць на мове, каб беларускамоўная прастора пашыралася натуральным, а не гвалтоўным чынам. Каб не ствараць напружанне ў адносінах паміж людзьмі. Такія рэчы загадам не робяцца. Давайце разам ісці гэтым шляхам — і беларускае слова будзе гучаць часцей і шырэй.

> **Вельмі шмат чытаў у юнацтве. Захапляўся французскімі раманамі, тэмай Вялікай Айчыннай вайны.**

***— Які досвед, атрыманы на месцах ранейшай працы (консульская праца, прэс-сакратар МЗС, Амбасадар у Польшчы) дапамагае на сённяшняй пасадзе? Часта даводзіцца чуць, што вы вельмі актыўна прасоўвалі нашую культуру ў Польшчы падчас амбасадарскай кадэнцыі — у чым менавіта гэта выяўлялася?***

— Кожная з гэтых прац зрабіла важкі ўнёсак у маё асабістае жыццё, хаця ўсе яны аб'яднаныя адной назвай — дыпламатыя. Але кожная пасада мела сваю спецыфіку. Консульская праца — гэта дапамога грамадзянам сваёй краіны ў розных складаных сітуацыях: дарожна-транспартных здарэннях, аднаўленні страчаных дакументаў, арыштах і нават пагібелі грамадзянаў па-за межамі краіны. Прэс-сакратар МЗС працуе па забеспячэнні інфармацыйнай палітыкі МЗС, падаючы аператыўную інфармацыю аб знешняй палітыцы краіны, адказвае за аператыўнае інфармацыйнае забеспячэнне дыпламатычных устаноў нашай краіны, аб падзеях, якія адбываюцца на радзіме. Гэта праца па стварэнні іміджу знешняй палітыкі як унутры, так і па-за межамі Беларусі. Гэта быў выдатны досвед публічнай працы, працы з журналістамі. Праца амбасадара краіны — гэта фактычна вянец кар'еры дыпламата, бо няма больш пачэснай і адначасова адказнай місіі, чым быць прадстаўніком краіны, адстойваць яе інтарэсы за мяжой. Для мяне быў вялікі гонар прадстаўляць нашу Беларусь у суседняй Польшчы. Беларусь і Польшчу звязвае шмат у гісторыі і культуры, і таму праца на культурнай ніве была адным з прыярытэтаў у пасольскай дзейнасці. На мерапрыемствах, якія мы правялі, пабывалі сотні тысяч палякаў — і цяжка пераацаніць атрыманае задавальненне, стоячы ў Кангрэс-зале Палаца навукі і культуры ў Варшаве, калі чуеш 15-хвілінныя апладысменты ўдзячных гледачоў нашым артыстам Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Г. Цітовіча... Немагчыма пераацаніць ролю культуры ў стварэнні пазітыўнага іміджу Беларусі за мяжой.

## «Хацеў бы за год перагледзець усе спектаклі нашых мінскіх тэатраў...»

***— Якія густы спадара міністра: музычныя, літаратурныя, тэатральныя? Якую кнігу вы прачыталі апошнюю?***

— На жаль, чытаць даводзіцца збольшага службовыя паперы, якіх шмат праходзіць праз стол міністра. Вельмі шмат чытаў у юнацтве. Захапляўся французскімі раманамі, тэмай Вялікай Айчыннай вайны. Мама нават пыталася ў мяне: «Што ты ўсё пра вайну чытаеш, няўжо табе астатняе нецікава?!» Але перыяд вайны быў адным з самых цяжкіх у нашай гісторыі. І вельмі важна, каб мы і сёння выхоўвалі пашану і памяць аб тых людзях, дзякуючы якім мы будуем сённяшнюю Беларусь. Зараз вось чытаю сцэнары фільмаў, якія плануе стварыць кінастудыя «Беларусьфільм». Хоць дома другі месяц ляжыць распачатая п'еса Фрыдрыха Шылера «Марыя Сцюард» у перакладзе на беларускую мову.

> **У наступным годзе, напрыклад, адбудзецца шэраг мерапрыемстваў да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы.**

Музыку слухаю, зразумела, на канцэртах, арганізатарамі якіх з'яўляюцца Міністэрства культуры і ўстановы культуры. Стараюся паслухаць песні беларускіх аўтараў, якія атрымоўваю на новай пасадзе з просьбай выказаць меркаванне.

Вельмі люблю тэатр. Хацеў бы за год перагледзець усе спектаклі нашых мінскіх тэатраў. Але мара невыканальная!.. Быў пад уражаннем ад спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа «Крыж Ефрасінні», які коласаўцы прывозілі на гастролі ў Мінск. Заклікаю ўсіх хадзіць у тэатры, кіно, наведваць музеі!.. Калі вы апошні раз былі ў бібліятэцы?.. Пашырэнне культурнай адукаванасці вельмі важная справа як для кожнага чалавека, так і для краіны.

***— Ці ёсць у вас нейкае ўлюбёнае месца ў Беларусі, у свеце?***

— Вы ведаеце, так мала часу застаецца на адпачынак... А жаданне сутыкнуцца з прыродаю вялікае, усё больш і больш у думках вяртаюся да родных мясцінаў, адкуль мае бацькі. А гэта Смалявіцкі раён. Найбольшую духоўную асалоду ад сутыкнення з некранутай прыродай атрымліваю, калі наведваю Белавежскую пушчу, якая прыцягвае сваім духам гістарычнай глыбіні, нібы ўвабраўшы ў сябе гісторыю чалавецтва і беларускай зямлі. Якое месца прыцягвае ў свеце? На жаль, не вельмі буду адрозніваца ад іншых дыпламатаў. Наведаўшы аднойчы Вену, дзе ўпершыню пабачыў арыгіналы Ван Гога — гатовы вярнуцца туды і ў дзясяты раз.

**Гутарыў Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара, з архіва Міністэрства культуры.**

**Павел ЛАТУШКА вітае ў Мінску князёўну Эльжбету РАДЗІВІЛ.**



Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 30 (76)

# У НАЦЫЯНАЛЬНЫМ МАСТАЦКІМ МУЗЕІ ВАЎКІ РАЗАДРАЛІ КАЗУЛЮ

**Выстава Сяргея Плыткевіча «Дзікае жыццё ў цэнтры Еўропы» перайначыць вашыя ўяўленні пра беларускую прыроду**



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Колькі часу вам давялося правесці з фотаапаратам між кустоў і на дрэвах?***

— Вы мяркуеце слушна: кожны здымак патрабаваў шмат часу. Той жа арол-змеялоў — каб зрабіць яго фота, я тры дні праседзеў на дрэве. Аднак кадр атрымаўся ўнікальны — калі ён нясе вужа, завязанага на вузел!.. І нават здымкі, якія могуць падацца выпадковымі, — яны не выпадковыя, бо я сядзеў і чакаў.

***— Спадар Сяргей, вам удалося злавіць настолькі рэдкія моманты з жыцця дзікай прыроды, якія звычайны чалавек можа ніколі не пабачыць. Ці вымагала гэта нейкай адмысловай падрыхтоўкі — ведаў па заалогіі, арніталогіі?***

— Да журфака БДУ я скончыў Полацкі лясны тэхнікум, таму чужым сябе ў лесе не адчуваю. І ў школе ў нас быў адпаведны гурток, «Блакітны патруль» — рабілі шпакоўні, агароджвалі мурашнікі. Гэта маё жыццё. Да таго ж, большасць здымкаў зроблена з дапамогай маіх сяброў, аднакурснікаў, якія працуюць цяпер у нацыянальных парках, лясгасах, паляўнічых гаспадарках. Напрыклад, здымкі глушцоў з'явіліся дзякуючы майму сябру з Віцебска Уладзіміру Шарэпу. Ён назірае за глушцамі ўжо гадоў дваццаць. Кожны год ён будуе на такавішчы шалашы, адкуль можна рабіць шыкоўныя фота. Тых жа буслоў мы здымалі разам з Віктарам Казлоўскім. Увесну прыляцелі буслы на поле карміцца. Мы збудавалі шалашы, насыпалі ім пшаніцы. А яны не ядуць! Потым даўмеліся: а давай гароху! І яны завабіліся! Прыходзілі, елі — а мы здымалі. А ўначы перад гэтым выпаў снег. І вось уявіце: раніца, сонца, снег, жураўы ядуць гарох...

***— Якія яшчэ навыкі, апроч будавання шалашоў, вам спатрэбіліся?***

— Уменне не заблукаць у лесе. Са мной такое даўно не здаралася, але месяц таму па-сапраўднаму заблукаў у Белавежскай пушчы. Пайшоў за аленямі. У іх якраз перыяд гону, яны шукаюць самак альбо высвятляюць адносіны на рагах. І калі ты падкрадаешся і пад табой хруснула галінка — яны не ўцякаюць, а ідуць паглядзець: што там? А раптам — каханне? І я пайшоў следам, фатаграфуючы. Падкрадаўся так гадзінкі чатыры. І заблукаў!.. Агледзеўся: ёлкі-палкі, дзе ж гэта я!.. Бывала такое, што і фотаапарат у балоце тапіў...

***— А наколькі гэта небяспечна? Я бачыў у вас здымкі і ваўкоў, і дзікоў. Ды і той алень, калі вас упадабае — мала вам, напэўна, не будзе...***

— У лесе трэба быць гатовым да самых розных экстрэмальных сітуацый. Тая ж дзікая свіння, абараняючы парсючкоў, можа напасці на вас. Паранены дзік — страшнейшы за мядзьведзя!.. Што да ваўкоў, мядзьведзяў, ласёў, аленяў — часцей за ўсё яны ўцякаюць ад людзей. А вось ёсць птушкі, якія сапраўды абараняюць свае гнёзды. Аднойчы мы з сябрам Зміцерам Шамовічам здымалі соваў. Ён надзеў матацыклетны шлем са спецыяльнай абаронай — і палез на дрэва. Я думаў, кпіць з мяне, няявопытнага! Аднак не — як толькі ён наблізіўся, сава ўзляцела, бясшумна разагналася — і з ўсяго маху як дала яму дзюбай у шлем!..

***— І чым скончылася гэта дзя Зміцера?***

— Для Зміцера нармальна, бо ён быў падрыхтаваны да такога, толькі трохі лбом у дрэва даўся. А вось я ледзьве фотаапарат з рук не выпусціў, спужаўшыся за яго!

***— Што вам больш за ўсё запомнілася ў нашай дзікай прыродзе?***

— Коні Пржавальскага! Калі б я сам іх не фатаграфаваў, ніколі б не паверыў, што яны ў нас ёсць. Але выйшла вельмі цікава. У Палескі радыялагічны запаведнік нашыя навукоўцы засялілі зуброў, а ўкраінскія — коней Пржавальскага. Дзеля таго, каб даследаваць уплыў радыяцыі на іх. І ўкраінскія коні ўцяклі да нас, прыбіліся да звычайнага сялянскага табуна! Паслухмяныя беларускія коні пайшлі пасля дадому, а тыя — у лес...

Выстава «Дзікае жыццё ў цэнтры Еўропы» працуе ў Нацыянальным мастацкім музеі да 18 кастрычніка. Спяшайцеся!

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота з архіва Сяргея ПЛЫТКЕВІЧА.**



## ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51
**Центр клиентской поддержки ЗАО Банк ВТБ (Беларусь): (017) 306 26 62, (029) 610 04 33, (029) 500 56 56.**
**www.vtb-bank.by.**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 24 156,7 | 9 175,9 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 87 555,8 | 63 222,5 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 20 767,3 | 59 641,3 |
| | для торговли | 11031 | 8 175,0 | 46 346,8 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | – | 13 294,5 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 12 592,3 | – |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 481 339,1 | 227 752,6 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 974 590,5 | 849 487,0 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 470,7 | 450,7 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 56 083,5 | 34 804,1 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 14 273,2 | 8 040,9 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 1 659 236,8 | 1 252 575,0 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | – | 800,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 605 133,0 | 381 931,8 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 786 825,0 | 719 461,6 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 34 570,7 | 905,1 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 21 443,1 | 13 493,2 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1 447 971,8 | 1 116 591,7 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 84 370,2 | 40 005,6 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | 34 320,3 | 34 320,3 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 16 891,6 | 13 553,6 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 63 242,0 | 39 893,2 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 12 440,9 | 8 210,6 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 211 265,0 | 135 983,3 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 1 659 236,8 | 1 252 575,0 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 1 296 906,4 | 391 911,9 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 368 813,9 | 346 011,7 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 120 379,4 | 53 910,4 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 60 920,6 | 28 861,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 59 458,8 | 25 049,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 24 703,9 | 15 272,1 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 5 123,5 | 1 544,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 580,4 | 13 727,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 5 629,1 | 11 017,5 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 384,4 | 42,5 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 0,1 | 0,1 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 25 531,3 | (-633,0) |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 22 867,8 | 2 584,8 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 40 040,0 | 30 988,5 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 14 515,6 | 1 864,9 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 2 321,2 | 3 282,9 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 25 512,5 | 16 918,1 |

**Председатель Правления** **В.В. Иванов**

**Главный бухгалтер** **М.В. Дудко**

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.11.2007 г. № 23, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 101165625

Краіна здароўя
Выпуск № 41 (155)

## Сястрычка Валя



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Валянціна Цітова мае вялікі стаж і багаты вопыт працы ў медыцыне. Шмат гадоў яна працавала медыцынскай сястрой ва ўчастковай бальніцы ў вёсцы Язна Міёрскага раёна. Калі суседняя вёска Іст засталася без медыцынскай апекі, В. Цітова ўзначаліла ФАП гэтага населенага пункта. Яе часта можна ўбачыць сярод вясковых жыхароў.

Прафілактыка

# АТЫТ НЕБЯСПЕЧНЫ ЎСКЛАДНЕННЯМІ

Рэдка ў каго ніколі, нават у дзяцінстве, не балелі вушы. Вушны боль часам бывае не менш нясцерпным, чым зубны. Да таго ж вушы размешчаны побач з галаўным мозгам, а значыць, ён таксама можа быць уцягнуты ў працэс. Таму запаленне вуха трэба лячыць старанна і пад наглядам урача, каб пазбегнуць вялікіх непрыемнасцяў у будучыні.

Праблеме прафілактыкі ўскладненняў хранічнага атыту будзе прысвечана рэспубліканская акцыя, якая пройдзе сёлета 22—23 кастрычніка ў РНПЦ «Отарыналарынгалогія», у абласных кансультацыйных паліклініках, гарадскіх паліклініках абласных цэнтраў і г. Мінска.

Падчас акцыі спецыялісты запросяць людзей наведаць ЛОР-урача, які дапаможа выявіць паталогію вуха, горла, носа. А гэта ў сваю чаргу дазволіць своечасова пачаць лячэнне і пазбегнуць цяжкіх ускладненняў.

Праблема хранічнага сярэдняга атыту сёння з'яўляецца актуальнай з-за вельмі высокай распаўсюджанасці гэтага захворвання. Вось якія лічбы прыводзіць урач-сурдолаг сурдафаніатрычнага аддзялення для дарослых РНПЦ «Отарыналарынгалогія» Іван Гарнастай: у Рэспубліцы Беларусь за 2008 год на 100 000 насельніцтва зарэгістравана 209 выпадкаў захворванняў на хранічны сярэдні атыт, з іх 42,6 выпадка зарэгістраваныя ўпершыню. Хранічныя сярэднія атыты вядуць да часовай, а часам і да стойкай страты працаздольнасці і займаюць другое месца ў структуры оталарынгічнай захваральнасці.

Хранічныя сярэднія атыты з'яўляюцца асноўнай прычынай тугавухасці, пры якой людзям цяжка кантактаваць, абмяжоўваецца іх прафесійная дзейнасць.

Сярэдні востры атыт нярэдка ўзнікае на фоне рэспіраторных вірусных інфекцый і таму, як і гэтыя інфекцыі, часцей сустракаецца восенню, зімой і вясной. Сярэдні востры атыт можа перайсці ў хранічную стадыю па прычыне зацягнутага запалення сярэдняга вуха.

Захворванне пачынаецца раптоўна з моцных боляў у вуху і агульнага недамагання (дрыжыкі, павышэнне тэмпературы цела). З'яўляецца галаўны боль, пры націсканні на сасцападобны адростак за вушной ракавінай адчуваецца боль, на 4—5 суткі барабанная перапонка прарываецца — з вуха выцякае гной.

Хранічны сярэдні атыт вельмі небяспечны сваімі наступствамі. Ён можа быць прычынай такіх цяжкіх ускладненняў, як менінгіт, абсцэс мозгу, сэпсіс. Лятальнасць пры гэтых паталогіях складае ад 14 да 30 %.

У першы ж дзень вострага захворвання вуха неабходна звярнуцца да ўрача, у наступным пры лячэнні рэкамендуецца поўны спакой і пасцельны рэжым.

Прафілактыка хранічных атытаў павінна праводзіцца з дня нараджэння. Велізарнае значэнне мае правільнае грудное выкормліванне і своечасова наладжаны рэжым харчавання дзіцяці надалей. Як правіла, дзеці, што знаходзіліся на натуральным грудным выкормліванні, а потым мелі адпаведны харчовы рэжым, ужывалі багатую на вітаміны ежу, менш хварэюць на рэспіраторна-вірусныя хваробы, якія садзейнічаюць узнікненню вострага запалення сярэдняга вуха.

Неўспрымальнасці да прастудных фактараў спрыяе загартоўка. Пры ёй рэкамендуюцца халодныя нажныя ванны, прахалодныя абціранні, працяглае знаходжанне на свежым паветры, заняткі фізкультурай і спортам.

Трэба навучыць дзіця з самых ранніх гадоў правільнаму насаваму дыханню. На спецыяльных занятках у кабінеце лячэбнай фізкультуры метадыст можа расказаць аб фізічных прыёмах, якія садзейнічаюць фізіялагічнаму спосабу дыхання праз нос.

Важную ролю ў развіцці хранічных сярэдніх атытаў адыгрываюць адэнатанзілярная паталогія, скрыўленне перагародкі носа, гіпертрафія насавых ракавін, вазаматорныя рыніты. Таму эфектыўным сродкам прафілактыкі з'яўляюцца кансерватыўныя і хірургічныя метады лячэння, накіраваныя на санацыю хранічных і паталагічных станаў глоткі, носа і насаглоткі. Папярэдзіць паўторнае захворванне на вострыя сярэднія атыты дапаможа своечасовае выдаленне адэноідаў, паднябенных міндалінаў або планавае сістэматычнае кансерватыўнае лячэнне гэтай паталогіі. А шмат у якіх выпадках такія мерапрыемствы прывядуць за поўнага вылячэння ад запаленчага працэсу ў сярэднім вуху.

Пасля перанесенага вострага запалення сярэдняга вуха з наяўнасцю перфарацыі (адтуліны) у барабаннай перапонцы, нельга дапускаць таго, каб вада трапляла ў слыхавы праход. Калі вы прымаеце душ ці мыеце валасы, у слыхавы праход неабходна пакласці ватны тампон, прамочаны вазелінам. Перфарацыя, якая доўга захоўваецца пасля перанесенага вострага сярэдняга атыту, абавязкова лечыцца хірургічным шляхам у спецыялізаваных аддзяленнях стацыянараў.

**Вольга ШАЎКО.**

Інфарм-укол

## ШЫРОКАЯ ІМУНІЗАЦЫЯ

**Планавая імунізацыя дзяцей і дарослых прадугледжвае ўвядзенне вакцын у пэўнай паслядоўнасці ў вызначаныя тэрміны. Гэта і ёсць Нацыянальны каляндар прафілактычных прышчэпак. Бывае, што імунізацыю праводзяць і па індывідуальнай схеме.**

Азнаёміцца з названым календаром можна ў паліклініцы. Апраўданае з эпідэміялагічнага пункту гледжання прафілактычнае прышчэпліванне насельніцтва прадугледжвае вакцынацыю супраць вірусных гепатытаў А і В, туберкулёзу, дыфтэрыі, слупняку, коклюшу, хіб-інфекцыі, поліяміеліту, адру, эпідэмічнага паратыту, краснухі.

Паводле слоў **урача-педыятра 2-й мінскай гарадской дзіцячай паліклінікі Алены ЗВЯРУГІ**, адным з асноўных крытэрыяў ацэнкі якасці вакцынапрафілактыкі з'яўляецца бяспека імунізацыі. Так, напрыклад, кожны, каму павінна праводзіцца прафілактычная прышчэпка, аглядаецца ўрачом. Урач збірае анамнез для выяўлення захворванняў, у тым ліку хранічных, рэакцый або ўскладненняў на папярэдняе ўвядзенне прэпарата, алергічных рэакцый на лекавыя прэпараты і прадукты, а таксама выяўляе індывідуальныя асаблівасці арганізма — неданошанасць, родавая траўма, сутаргі. Удакладняецца, ці не мелі месца кантакты з інфекцыйнымі хворымі, тэрміны папярэдніх прышчэпак. Праводзіцца і вымярэнне тэмпературы. Усе вынікі фіксуюцца ў медыцынскіх дакументах. Перад правядзеннем прышчэпкі медработнік павінен папярэдзіць пацыента ці бацькоў дзіцяці аб магчымасці ўзнікнення мясцовых рэакцый, аб ускладненнях, даць рэкамендацыі па аказанні даўрачэбнай дапамогі ў выпадку іх узнікнення.

Пры правядзенні прафілактычных прышчэпак павінна забяспечвацца актыўнае медыцынскае назіранне ў пэўныя тэрміны:

— на працягу 3 сутак пасля імунізацыі супраць гепатыту В, дыфтэрыі, коклюшу, слупняку, гемафільнай інфекцыі;

— на 5-6-я і 10-11-я суткі — пры выкарыстанні жывых вакцын;

— праз 1, 3, 6, 9 і 12 месяцаў пасля імунізацыі супраць туберкулёзу.

## У ЯКІМ УЗРОСЦЕ ЧЫМ ЗАЙМАЦЦА?

Псіхолагі лічаць, што выбіраць занятак для дзяцей неабходна з улікам не толькі схільнасцяў, але і ўзросту.

**3 гады**

Заняткі па развіцці музычных здольнасцяў могуць адкрыць для малых рытм, гукі, песні, ігру на ўдарных інструментах і г.д. Некаторыя спецыялісты лічаць, што ў гэтым узросце можна пачынаць ігру на фартэпіяна або скрыпцы: пакуль дзіця не прыступіла да вывучэння «сур'ёзных прадметаў» у школе, яго свядомасць валодае большай гнуткасцю. Знаёміць дзіця з шэдэўрамі жывапісу — вадзіць у галерэі, музеі — можна з любога ўзросту, роўна як і займацца маляваннем дома. Наведванне выставы не павінна цягнуцца больш за гадзіну, інакш узнікне пачуццё перанасычанасці.

**6 гадоў**

Мастацкія школы і студыі прапануюць жывапіс, малюнак, кераміку, мадэляванне, скульптуру, мазаічнае мастацтва і г.д. Узрост удзельнікаў вызначаецца тэхнічнай складанасцю. Заняткі сальфеджыа ў музычных школах пачынаюцца з шасці гадоў, а прыём на навучанне ігры на інструменце — на год пазней. Заняткі акцёрскім майстэрствам і пантамімай можна прапанаваць шасцігодкам пры ўмове, што на першае месца ставіцца задавальненне ад гульні, а не рэпертуар. Тэатр можа навучыць быць у групе, вызначаныя правілы дазволяць кантраляваць сябе.

**7-8 гадоў**

Лепшы ўзрост для таго, каб пачаць заняткі спортам або танцамі.

**9-12 гадоў**

Фотасправа, відэастудыя, камп'ютарная графіка вельмі падабаюцца ў гэтым узросце. Як заціснутым, так і вельмі эмацыянальным падлеткам дапамогуць заняткі тэатрам і пластыкай: яны навучаць выяўляць сябе і знаходзіць кантакт з уласным целам.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

### Доктар адкажа

**На наступным тыдні на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць дзяжурыць:**

**12 кастрычніка** — галоўны ўрач 22-й дзіцячай паліклінікі г.Мінска Інеса Вячаславаўна САФРОНАВА.

**13 кастрычніка** — галоўны ўрач 18-й мінскай гарадской паліклінікі Сяргей Валянцінавіч БУГАЕЎ.

**14 кастрычніка** — галоўны ўрач 1-й мінскай дзіцячай паліклінікі Людміла Уладзіміраўна ГНЯДЗЬКО.

**15 кастрычніка** — галоўны ўрач гарадскога псіханеўралагічнага дыспансэра Аляксандр Іванавіч СТАРЦАЎ.

Жаночыя сакрэты

# ГРУДЗІ! ЗДАРОВЫМІ БУДЗЬЦЕ!

**ЖАНОЧЫЯ малочныя залозы прызначаныя не толькі для выкормлівання патомства. Гэта адна з найбольш важных складальнікаў жаночай сэксуальнасці, аб'ект захаплення і нават пакланення. «Шкада, але час бязлітасны, з ім не паспрачаешся», — так скажуць многія, і гэта праўда, але толькі часткова. Чым раней вы пачняце сачыць за здароўем грудзей, тым лягчэй будзе пазбегнуць «адбіткаў» часу.**

**ШТО ДЛЯ ГРУДЗЕЙ ДОБРА?**

Правільнае харчаванне — неад'емная ўмова добрай фігуры. Ад таго, што і ў якой колькасці мы ядзім, залежыць і стан малочных залозаў. Напрыклад, рэзкае пахудзенне можа сапсаваць іх знешні выгляд — грудзі проста павіснуць. Калі хочаце пазбегнуць праблем з малочнай залозай, асцерагайцеся і залішняй вагі. У большасці выпадкаў яна вядзе да парушэнняў у гарманальнай сферы (лішак эстрагенаў), якія вельмі хваравіта пераносяцца малочнымі залозамі.

Дарэчы, паводле апошніх даследаванняў, прадукты, якія ўтрымліваюць мецілксанціны (напрыклад, кава, кока-кола, шакалад і інш.), могуць узмацніць болі ў малочных залозах перад менструацыяй. Таму замена ранішняй кавы кубачкам зялёнай гарбаты зробіць вашы грудзі менш адчувальнымі. Абмяжуйце таксама ўжыванне кухоннай солі, вяндліны, каўбас, смажаных і кансерваваных прадуктаў.

**Фізічныя практыкаванні.** Прыгожыя грудзі непасрэдна звязаныя з вашай паставай: выпрастайце пазваночнік, распраўце плечы, уцягніце жывот — і вы ўбачыце, як прыўзнімецца ваш бюст. Таму — дзе б вы ні былі і што б вы ні рабілі — сачыце за сваёй пастаццю!

Грудзі знаходзяцца на своеасаблівай мышачнай падушцы, якую ўтвараюць малая і вялікая грудныя мышцы. Умацаваць іх і зрабіць грудзі хоць крыху большымі вельмі нават магчыма — уключыце ў хатнюю зарадку адцісканні ад падлогі або ад сцяны.

**Халодная вада.** Дзеля прыгажосці грудзей варта палюбіць кантрасны душ. Каб было лягчэй прывыкнуць, падумайце пра тое, што такі душ танізуе скуру, стымулюе кровазварот, а калі грудзі добра забяспечваюцца крывёю, яны становяцца ружовымі і пругкімі. Калі ў вас не хапае духу накіраваць на грудзі струмень халоднай вады, вазьміце кубікі лёду і працірайце імі скуру.

**Штодзённы догляд.** Вобласць дэкальтэ — выключна далікатная зона, і даглядаць яе трэба не менш старанна, чым скуру твару. Для штодзённага догляду падыдзе ўвільгатняльны гіпаалергенны крэм з утрыманнем выцяжак з раслін і такіх рэчываў, як калаген, эласцін, вітамін А, якія дапамагаюць утрымаць вільгаць у скуры, ад чаго яна становіцца больш пругкай. Што ж датычыцца крэмаў, прызначаных для «хуткага і эфектыўнага павелічэння памеру грудзей», іх бяспека пакуль што не даказана.

**Сподняя бялізна.** Бюстгальтар павінен дакладна адпавядаць памеру вашых грудзей і ні ў якім разе не павінен быць малым. Цесны бюстгальтар можа быць прычынай парушэння кровазвароту, што правакуе развіццё анкалагічных захворванняў. Тугая бялізна на металічных «костачках» выглядае вельмі прывабна, аднак сціскае грудзі і наносіць мікратраўмы. Таму калі ўжо з костачкамі, дык толькі з пластыкавымі.

Не насіце бюстгальтар больш як 12 гадзін у суткі і ніколі не спіце ў ім.

**Сэкс** і, у прыватнасці, любоўная прэлюдыя аказваюць дабратворнае ўздзеянне на грудзі жанчыны. Спалучэнне прыліву крыві, лёгкіх масажных дотыкаў і гарманальнага ўсплёску — натуральны спосаб падтрымання грудзей у тонусе.

**ШТО ДЛЯ ГРУДЗЕЙ ШКОДНА?**

**Аборты** для грудзей — проста катастрофа. Бо адразу пасля апладнення пачынаецца гарманальная перабудова, мэта якой — падрыхтаваць арганізм да родаў, а грудзі — да кармлення. Пасля механічнага выдалення аплодненай яйцаклеткі тканкі малочнай залозы вымушаны ў тэрміновым парадку вярнуцца ў «дацяжарны» стан. Не ва ўсіх і не заўсёды гэта праходзіць гладка. Некаторыя клеткі могуць збочыць на крывую дарожку пухліннага росту.

Таксама статыстыка сцвярджае, што жанчыны **з першай цяжарнасцю пасля 35 гадоў** часцей захворваюць на рак малочнай залозы. Верагодна, у такім узросце клеткі малочных залозаў страчваюць здольнасць адэкватна сустракаць гарманальныя змены, выкліканыя цяжарнасцю.

У большасці медыцынскіх даследаванняў зазначаецца, што аральныя кантрацэптывы не павялічваюць рызыку развіцця раку малочнай залозы, і ўсё ж працяглы (больш за 2—3 гады) прыём гэтых прэпаратаў можа справакаваць рост пухліны. Таму неабходна надаваць больш увагі іншым метадам кантрацэпцыі і не злоўжываць супрацьзачаткавымі таблеткамі.

**Любыя траўмы малочнай залозы** могуць мець непрадбачаныя наступствы: нават на месцы простага сіняка можа з'явіцца кіста (поласць, напоўненая вадкасцю).

**Запаленчыя працэсы ў жаночых палавых органах** могуць выклікаць гарманальны дысбаланс у арганізме, што нярэдка суправаджаецца развіццём мастапатыі. Садзейнічаюць гэтаму і інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам. Таму візіт да гінеколага і своечасова здадзеныя аналізы — не «дзяжурныя» рэкамендацыі, а жыццёвая неабходнасць.

**Лішак сонца** шкодны для грудзей, бо скура вобласці дэкальтэ вельмі адчувальная, а прамыя сонечныя прамяні садзейнічаюць хуткаму яе старэнню. Вакол сасоў утвараюцца маршчыны, а ў вобласці дэкальтэ з'яўляюцца пігментныя плямы. Таму перад выхадам на адкрытае сонца варта нанесці на гэту зону крэм з высокім сонцаахоўным фактарам і засцерагаць свае грудзі нават у салярыі.

**БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ!**

Рак малочнай залозы можна вылечыць — але пры адной умове: калі ён быў выяўлены на ранняй стадыі! На жаль, большасць захварэлых жанчын звяртаюцца да ўрача вельмі позна. Бо рак каварны і па першым часе нічым асаблівым сябе не праяўляе. А менавіта ранняе выяўленне пухліны і гарантуе паспяховае лячэнне. Вось і не стамляюцца заклікаць нас урачы: больш уважліва стаўцеся да сябе і рэгулярна наведвайце доктара, каб, калі што, — паспець!

Самы просты метад дыягностыкі — самаабследаванне грудзей. Яго трэба праводзіць раз на месяц! Строга з 6 па 12 дзень ад пачатку менструацыі, а жанчыны ў менапаўзе могуць праводзіць абследаванне ў любы дзень.

Калі вы выявілі змяненні формы або памераў грудзей, зацвярдзенне, вузельчык, пачырваненне скуры або ацёк, выдзяленні з саска — гэта прычына не для панікі, а для візіту да мамолага.

**Фактары, якія павялічваюць рызыку развіцця раку грудзей**

- шматлікія аборты;
- адмова ад кармлення грудзямі;
- ранні пачатак менструацыі (да 11 гадоў) і позні клімакс (пасля 55 гадоў);
- гінекалагічныя захворванні, якія суправаджаюцца парушэннем функцыі яечнікаў;
- парушэнне гарманальнага фону (залішняя вага, працяглы прыём супрацьзачаткавых таблетак, збоі ў рабоце эндакрынных органаў, у прыватнасці, шчытападобнай залозы і інш.);
- моцныя нервовыя ўзрушэнні, перанесеныя ў недалёкім мінулым (да 1 года);
- спадчыннасць (рак у маці, бабулі і г.д.).

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# КАВА: шкода або карысць

**Кожная раніца як дзве кроплі падобная на папярэднюю: неахвоця выпаўзаеш з цёплага кокана коўдры, ледзь перабіраючы непаслухмяныя пасля сну ногі, пляцешся ў ванную, цудам пазбягаючы сутыкнення з мэбляй. Водныя працэдуры не дапамагаюць — вочы ніяк не хочуць расплюшчвацца. Адна надзея — гэта кубак моцнай (лыжкі 2-3, не менш) кавы. І толькі атрымаўшы ранішнюю дозу кафеіну, пачынаеш адчуваць сябе чалавекам. Туман у галаве павольна знікае і (нарэшце!) у вас атрымліваецца расплюшчыць вочы больш чым на дзесяць секундаў...**

Вам знаёмая падобная сітуацыя? Думаю так, прынамсі, шматлікім з вас. Але кафеін можа прынесці або карысць, дапамагаючы здабыць бадзёрасць, калі больш за ўсё хочацца вярнуцца ў цёплую пасцель, або ж нанесці шкоду вашаму арганізму.

**УЗДЗЕЯННЕ НА НЕРВОВУЮ СІСТЭМУ**

Не сакрэт, што кава — эфектыўны стымулятар, які дзейнічае на цэнтральную нервовую сістэму, танізуе, паляпшае настрой і павышае працаздольнасць. Кава — гэта выратавальны круг для людзей, якія аддаюць перавагу паспаць даўжэй, але вымушаны рана ўставаць на працу. Эфект ад выпітага кубка працягваецца ад адной да сямі гадзін. Але чым больш ужываеш гэтага напою, тым большая доза патрабуецца з часам. Дзеянне доўжыцца не больш за гадзіну і пасля перыяду высокай працаздольнасці надыходзіць хуткі спад. Рэзкая адмова ад кафеіну прыводзіць да дрэннага настрою, санлівасці, і такі стан працягваецца крыху больш за суткі.

Людзям ураўнаважаным, якія рэдка выходзяць з сябе, неабходна выпіваць большую колькасць кавы, у параўнанні з нервовымі, лёгка ўзбудзімымі асобамі. Напэўна, усім вядома, што выпіты на ноч кубак кавы прыводзіць да бяссонніцы.

Тым, хто пакутуе ад павышанага крывянога ціску, у каго ёсць праблемы з сэрцам — ад гэтага напою лепш наогул адмовіцца. Рэгулярнае ўжыванне кафеіну ў вялікіх дозах можа прывесці да праблем з сэрцам, бо танізавальны эфект ад напою зніжаецца, і да таго ж расце таксічнасць.

Цікава, што даўні міф пра тое, што кава дапамагае людзям з нізкім крывяным ціскам, сапраўды міф.

Дапушчальнай нормай ужывання прынята лічыць 1-2 кубкі ў дзень, пажадана — у першай палове дня. Медыкі не раяць перавышаць гэтую норму, бо ў адваротным выпадку вы папросту атручваеце свой арганізм.

**КАВА І ЦЯЖАРНАСЦЬ**

Як жа дзейнічае кава на цяжарных жанчын? Многія медыкі сыходзяцца ў меркаванні, што цяжарным жанчынам лепш наогул устрымацца ад кавы. Іншыя ж называюць дапушчальную дозу — 2 кубкі ў дзень. Заўзятым каваманам можна параіць піць каву без кафеіну. Вядома, гэта ўжо не тое, але рызыка раптоўнага перапынення цяжарнасці зніжаецца. Дарэчы, у гарбаце ўтрыманне кафеіну больш (дзіўна, але факт!), так што калі вы хочаце нарадзіць здаровае дзіця, лепш забыцца пра сваю звычку на час цяжарнасці і кармлення грудзьмі.

Дарагія жанчыны, памятайце: калі вы выпіваеце каля васьмі кубкаў кавы ў дзень, гэта моцна зніжае магчымасць зацяжараць.

**КАВАВЫЯ ТРАДЫЦЫІ**

Французы, напрыклад, не ўяўляюць пачатак дня без кубачка моцнай, духмянай кавы з круасанамі, хоць аддаюць перавагу гэтаму напою з малаком. Кава па-французску рыхтуецца вельмі проста: у кубку рыхтуюць чорную каву, дадаюць крыху каньяку. Можна дадаць трошкі солі, а можна абмежавацца цукрам. Зверху пакласці вяршкі і крыху карыцы: усё па гусце. Можна дадаць трохі перцу.

У Вене вас уразіць колькасць і разнастайнасць кавярняў. Добра прыгатаваная кава па-венску — напой, які абавязкова трэба пакаштаваць. Рэцэпты прыгатавання адрозніваюцца адзін ад другога. Каву раяць падаваць астуджанай, але можна і гарачай. Самы просты рэцэпт: прыгатаваць кубак чорнай кавы, зверху дадаць узбітых вяршкоў (з карыцай або без) і цукру на смак. Можна пасыпаць здробненым шакаладам.

Турэцкая кава адрозніваецца сваёй моцнасцю і разнастайнымі традыцыямі і рытуаламі. Не кожнаму чалавеку спадабаецца горкі, церпкі напой. Каву па-турэцку трэба варыць у спецыяльнай ёмістасці — турцы. Адзін з рэцэптаў: у пасудзіну насыпаць каву і цукар, заліць вадой. Варыць да ўтварэння пенкі на маленькім агні. Можна таксама дадаць соль.

Рэцэптаў падрыхтоўкі гэтага старажытнага і высакароднага напою найвялікшае мноства. Напрыклад, у Вене вам прапануюць больш за 200 відаў кавы. Экспрэса, капучына і іншыя віды, што можна купіць у любым аўтамаце — гэта толькі вярхушка айсберга. Вы можаце піць яго з малаком, як любяць французы, або дадаваць узбітыя вяршкі і лёд — любімы спосаб прыгатавання ў Японіі. У розных краінах з ужываннем кавы звязаныя цэлыя рытуалы. І гэта толькі падкрэслівае яе значэнне ў нашым жыцці.

**КАСМЕТЫЧНЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ**

Жанчынам будзе прыемна даведацца, што любімы напой можна не толькі піць, але выкарыстаць як эфектыўны касметычны сродак. Калі вы ніколі не чулі і не ўжывалі гэты цудадзейны сродак — вы шмат згубілі, бо яго дзеянне відавочна і вынік, у літаральным і пераносным сэнсе, на твары.

Добры скраб для твару можна купіць, аддаўшы нямала грошай, а можна зрабіць яго дома, без лішніх выдаткаў, але з максімальнай карысцю для сябе. Асабліва прыдатны для тлустай скуры, пасля яго ваш тварык будзе выглядаць чыстым і свежым.

Рэцэпт просты як двойчы два: вазьміце кававую гушчу, якая засталася ў кававарцы або турцы. Для тлустай скуры можна дадаць адну сталовую лыжку ёгурту. Памыйце твар і раўнамерна нанясіце невялікую колькасць сродку, не закранаючы вобласці вачэй. Памасіруйце кругавымі рухамі, асабліва надайце ўвагу «праблемным зонам». Потым змыйце і атрымлівайце асалоду ад цудадзейнага эфекту. Для сухой скуры дадайце ў кававую гушчу трохі солі, цукру і расліннага алею.

Твар — не адзіная зона, дзе вы можаце паспяхова ўжываць «кававы раствор». Ён будзе карысны таксама і пры іншай, выключна жаночай праблеме. Маецца на ўвазе цэлюліт. Жанчыны ведаюць, колькі нязручнасцяў, больш маральных, прыносіць гэтая праблема. Цяпер вельмі папулярныя розныя сродкі, ізноў жа — даволі дарагія, з экстрактам кавы. Вы можаце сказаць — я заслугоўваю самага лепшага, але для звычайнай гаспадыні, якая раздзіраецца паміж працай, дзецьмі і мужам і адчайна спрабуе і выглядаць добра, і хоць бы трохі зэканоміць, можна парэкамендаваць добры хатні сродак, без вялікіх грашовых і часавых выдаткаў. Усё, што ад вас патрабуецца, гэта ўзяць кававую гушчу, дадаць трохі вады і нанесці на праблемную зону. Зверху наматайце спецыяльную тонкую плёнку, калі лянуецеся шукаць — цэлафанавы пакет. Пахадзіце так каля паўгадзіны і змыйце. Падчас працэдуры пажадана пабольш рухацца.

На жаль, многія з нас забыліся, як прыемна пасядзець з кубачкам гарачай кавы, чытаючы любімую кнігу. Або проста правесці час з сябрамі за няспешнай гутаркай. Раніцай мы на бягу выпіваем кубачак гарачага напою, перажоўваючы бутэрброд. Растваральная кава лепш, бо яе не трэба доўга гатаваць, бо галоўнае — узбадзёрыцца і адчуць сябе чалавекам, гатовым да працы і цяжкасцяў новага дня. Але якімі б занятымі вы ні былі, знайдзіце для сябе час, адчуйце асалоду ад смаку духмянай кавы. Эксперыментуйце, прыгатуйце нешта новенькае, раней не спазнанае. Можа, дадаць вяршкоў? Або лімон? Больш цукру, карыцы, каньяку... Але не забывайцеся, што ўсё добрае павінна быць у меру. І карыснае, і смачнае можа мець адваротны эфект і прынесці шкоду вашаму арганізму.

**Ірыны АНТОНАВА.**

# На «Пакроўскі кірмаш» — па ежу духоўную і зямную

**Па блаславенні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта ў Мінску ўчора адкрылася шостая духоўна-асветніцкая выстава-продаж «Пакроўскі кірмаш». Арганізатары выставы — Беларуская Праваслаўная Царква, Выставачнае таварыства «Экспафорум», ТАА «Экспасэрвіс». Экспазіцыя размясцілася ў Палацы мастацтваў па адрасе: Мінск, вуліца Казлова, 3. Кірмаш працуе штодня з 10 да 20 гадзін, у апошні дзень, 17 кастрычніка — да 18.00.**

Мінчане і госці сталіцы ўжо маюць добрае ўяўленне пра падобныя выставы. Тыя, хто на іх пабываў, звычайна чакаюць чарговую, бо ведаюць, што толькі тут можна знайсці альбо найбольш зручна купіць шмат якія рэчы. Разам з тым, на кожнай такой выстаўве абавязкова з'яўляецца і нешта новае. На гэты раз у «Пакроўскім кірмашы» возьмуць удзел больш за 80 манастыроў, праваслаўных прыходаў, выдавецтваў, майстэрняў з розных куткоў Беларусі, Расіі, Украіны, Грэцыі, Ізраіля.

Асаблівасць восеньскай выставы ў тым, што яна праходзіць у час святкавання Пакрова Прасвятой Багародзіцы, які ў Беларусі супадае з Днём Маці. Таму, акрамя шырокага выбару падарункаў для мацярок і хросных бацькоў — ікон, падсвечнікаў, свяцільняў, сувеніраў і вырабаў з лазы, бяросты, дрэва, гжэльскага фарфору, арэнбургскіх хустак, льнянога адзення, упрыгажэнняў з камянёў, — прапанавана будзе яшчэ багатая культурна-асветніцкая праграма, прысвечаная якраз мацярынству і дзецям. Зрэшты, вялікая частка гэтай праграмы мае досыць практычны характар.

Сёння а 15 гадзіне Паэтычны тэатр «Арт.С» і Сацыяльны аддзел Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы правядуць сентыментальную вечарыну на беларускай мове «Мама», у якой возьмуць удзел дзеці вядомых асобаў.

У панядзелак, 12 кастрычніка, а 13 гадзіне на выставе за круглым сталом збяруцца беларускія ўрачы, выкладчыкі, вучоныя і метадысты. Яны абмяркуюць пытанні духоўнай бяспекі сям'і, грамадства і дзяржавы. Размова пойдзе пра новыя формы маніпуляцый чалавекам, наступствы ўкаранення магіі і акультызму ў медыцыну, псіхалогію і педагогіку, пра маральнае і прававое тлумачэнне сучасных біяэтычных праблем, пра сацыяльна-псіхалагічныя наступствы алкагалізму, наркаманіі і рэабілітацыю, пра харчовую бяспеку.

Цэнтральнай падзеяй культурнай часткі напярэдадні свята 13 кастрычніка а 15 гадзіне стане цырымонія ўзнагароджання шматдзетных маці медалём Ефрасінні Полацкай, падрыхтаванай Беларускай Праваслаўнай Царквой і Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў». Увечары таго ж дня, 13 кастрычніка, клірык мінскага храма ў гонар іконы «Усіх тужлівых Радасць» протаіерэй Алег Шульгін правядзе гутарку «Пакроў Прасвятой Багародзіцы. Шанаванне Божай Маці і мацярынства».

У самы дзень Пакрова, 14 кастрычніка, адбудзецца акцыя «Падарунак маці». Яна распачнецца а палове першай прэзентацыяй кнігі матушкі Веранікі Сярдзюк «Нямарныя аповеды: адкрыта пра цяжарнасць, роды і першыя сорак дзён». Абмеркаваннем вострых пытанняў планавання сям'і і кантрацэптыўнага мыслення працягне тэму гэтага дня кандыдат багаслоўя, дырэктар фонду абароны жыцця і сям'і «Адкрытыя сэрцы» Уладзіслаў Валаховіч. У без чвэрці дзве распачнецца семінар і майстар-клас для матуль «Слінг: што гэта такое і навошта ён патрэбны?». На пачатку трэцяй гадзіны сертыфікаваны кансультант па грудным выкормліванні немаўлятак Наталля Разахацкая раскажа праўду і развянчае міфы пра выкормліванне дзяцей мацярынскім малаком. Потым цяжарным жанчынам будзе прапанавана бясплатная высокапрафесійная кансультацыя па падрыхтоўцы да родаў. Старажытным звычаям і сучаснай практыцы догляду парадзіхі і немаўлятка будзе прысвечана гутарка педыятра Вольгі Лойкі і псіхолага Юліі Яленскай, якая завершыць акцыю напачатку чацвёртай гадзіны.

Тэма мацярынства, сям'і, выхавання дзяцей — цэнтральная, але не адзіная на сёлетнім «Пакроўскім кірмашы». «Круглыя сталы», сустрэчы і гутаркі тут будуць прысвечаныя эканоміцы, экалогіі, медыцыне, нетрадыцыйнай рэлігійнасці і г.д.

Надзвычай багатая і цікавая запланавана канцэртная праграма кірмашу. Сярод найбольш яскравых падзей — музычная кампазіцыя «Любіць і даравацъ» кампазітара Уладзіміра Казбанава на вершы Валянціны Паліканінай з удзелам народнага артыста Беларусі Аляксандра Ціхановіча, Анастасіі Ціхановіч, Вольгі Патрый і інш. (14 кастрыніка, а 16 гадзіне), канцэрт-гутарка «Не пакінь мяне» (11 кастрычніка а 16 гадзіне) і святочны канцэрт «Багародзіца Дзева, радуйся!..» (14 кастрычніка а 18 гадзіне)...

Больш падрабязную інфармацыю аб выставе можна атрымаць па тэлефоне 185 і на сайце http://www.pravoslav-expo.by

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



# ВІРТУОЗЫ БАРНАЙ СТОЙКІ

## Не кожны жанглёр паўторыць трукі бармэна



**Дзевяць фіналістаў спаборніцтва бармэнаў па флейрынгу Planet Z — Flair Open Minsk 2009 вызначылі ў Мінску.**

Трэці этап спаборніцтва выявіў апошніх удзельнікаў фіналу. Гэта магіляўчанін Алег Ляжэнка, мінчане Генадзь Ніканчык і Андрэй Пятрэнка. Яны далучацца да шасці бармэнаў, якія 10 лістапада паспрачаюцца за званне лепшага бармэна-флеера ў Беларусі. Яркае шоу з элементамі жанглявання, віртуозным прыгатаваннем кактэйлю праходзіла ў мінскай кавярні Barberry.

За пяць хвілін кожнаму ўдзельніку неабходна было прыгатаваць тры кактэйлі. Прычым два з іх у тэхніцы працоўнага флейрынгу, а трэці — у тэхніцы паказальнага.

Журы ацэньвала выступленне бармэнаў па дзвюх пазіцыях: флеер і паказ. У флееры ацэньвалася колькасць выкарыстаных прадметаў, крэатыў (уласныя трукі), складанасць і зладжанасць праграмы. Крытэрыі паказу — уменне падаць кактэйль, збалансаванасць праграмы (кактэйль павінен гатавацца на працягу пяці хвілін), узаемадзеянне з музыкай і ўпэўненасць бармэна. Штрафныя балы налічваліся за падзенне, праліванне, разбіты посуд, няправільную працэдуру прыгатавання кактэйлю і інш. Каб ацаніць сапраўдны талент бармэна, смакавыя якасці кактэйляў не ацэньваліся, а ўдзельнікі выступалі ў аднолькавых майках.

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:**
**Флейрынг (англ.: талент, стыль)** — гэта прыгатаванне кактэйляў вольным стылем з выкарыстаннем элементаў жанглявання. Пачынальнікам флейрынгу лічаць Джэры Томаса, які жыў у Амерыцы ў другой палове XIX стагоддзя. Менавіта ён упершыню стаў падпальваць і пераліваць гарачыя кактэйлі з бакала ў бакал. Яго кніга «Bartender's Guide», напісаная ў 1862 годзе, да гэтага часу лічыцца настольнай кнігай бармэнаў. Папулярным флейрынг стаў пасля выхаду фільма «Кактэйль» у 1988 годзе з удзелам Тома Круза і Браяна Бруна.



Судзіць беларускіх бармэнаў прыехала спецыяльнае журы з Украіны. Гэта каманда цэнтра «Planet Z», якая з'яўляецца прадстаўніком WFA — сусветнай арганізацыі бармэнаў.

— Для бармэна ўдзел у такіх конкурсах — добрая магчымасць для прафесійнага росту. Бармэн, які валодае ў дасканаласці тэхнікай флейрынгу, робіць максімальныя продажы. І гэта добра ведаюць гаспадары бараў ці клубаў, — кажа вядучы Сяргей Хораў.

— Не кожны жанглёр можа паўтарыць тое, што робіць бармэн, — тлумачыць Сяргей Кадацкі, член журы, заснавальнік цэнтра «Planet Z». — Бутэлька з вадкасцю — не простая булава, якую выкарыстоўваюць у цырку. Яна сябе паводзіць зусім па-іншаму. Хачу адзначыць, што беларускія бармэны маюць вельмі добры патэнцыял. І цяпер яны могуць прэтэндаваць на ўдзел у сусветных конкурсах па флейрынгу. Дарэчы, адна з мэтаў конкурсу — спрыянне ўступленню Беларусі ў сусветную асацыяцыю бармэнаў.

Фінал, па словах арганізатараў, абяцае быць вельмі яркім і прыгожым.

**Настасся ЗАНЬКО.**

## ДЗЕЦЯМ — ГЛЯДЗЕЦЬ МУЛЬТФІЛЬМЫ, ДАРОСЛЫМ — КІДАЦЬ ПАЛІЦЬ

**Такое «меню» прапануе гледачам абноўленая праграма «Добрай раніцы, Беларусь!». З наступнага панядзелка, 12 кастрычніка, мы ўбачым у ёй новыя рубрыкі і праекты.**

Напрыклад, кожную раніцу вядучыя будуць атрымліваць самы свежы прагноз надвор'я па тэлефоне ў дзяжурнага сіноптыка Рэспубліканскага гідраметэацэнтра.

Самых маленькіх гледачоў у 7.10 парадуюць любімымі мультфільмамі — напрыклад, цяпер ужо ідуць выпускі «Ну, пачакай!, потым будуць паказаныя «Канікулы ў Прастаквашыне», «Віні-Пух», «Малы і Карлсан». А вось дарослым адрасаваны іншы, зусім сур'ёзны праект «Падары сям'ю дзіцяці», створаны сумесна з Нацыянальным цэнтрам усынаўлення Міністэрства адукацыі. Гісторыі дзяцей, якія мараць знайсці новую сям'ю, будуць паказвацца ў прамым эфіры кожную суботу.

У праграме пачынаюцца таксама міні-акцыі, прысвечаныя здароваму ладу жыцця. Першая з іх, «Кідай паліць!», аб'ядноўвае серыю відэасюжэтаў пра канкрэтныя метады барацьбы са шкоднай звычкай, выпрабаваныя курцамі са стажам.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Шчыра віншуем
з 80-годдзем дарагую
Ірыну Аляксандраўну
АНДРЭЕНКУ.
*Хай будзе шчасце і здароўе,*
*Віруюць хай крынічкі сілы!*
*І кожны дзень, пражыты Вамі,*
*Хай будзе радасным і мілым.*
З любоўю
дзеці, унукі,
праўнукі, г. Гомель.

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень



# Ільвам давядзецца разлічваць толькі на сябе, а Рыбам — шліфаваць прафесіяналізм

**АВЕН.** Добры тыдзень для павышэння энергетычнага патэнцыялу і ўмацавання здароўя. Цяпер у вас могуць раскрыцца здольнасці, яскрава і таленавіта праявіцца ваша творчая натура. Удача будзе спадарожнічаць шмат у чым. Адчуеце прыліў сілаў і актыўнасці — і таму справіцеся з усякай работай, за якую возьмецеся.

**ЦЯЛЕЦ.** Настае добры перыяд, можна нават сказаць — новы этап. У пачатку тыдня верагодны цікавыя сустрэчы. Для дасягнення станоўчых вынікаў на працы давядзецца праявіць вытрымку і настойлівасць — гэта крыху ўтомна, але ў вас атрымаецца. Паклапаціцеся пра сваіх блізкіх — ім так патрэбна ўвага.

**БЛІЗНЯТЫ.** Уменне аналізаваць і наводзіць парадак у думках будзе проста неабходна для поспеху. Варта ўважліва сачыць за дзеяннямі дзелавых партнёраў — яны могуць нарабіць шмат памылак, разграбаць якія давядзецца вам. Пастарайцеся менш гаварыць і больш дзейнічаць. Не прыспешвайце падзеі.

**РАК.** Найбольш значных вынікаў удасца дасягнуць у самаўдасканальванні. Калі няма ні часу, ні жадання ўдасканальвацца духоўна, займіцеся самаадукацыяй. Хоць бы па асноўным профілі дзейнасці. Пастарайцеся пазбегнуць спрэчак з роднымі, хоць гэта будзе і складана. Пазбегнуць многіх канфліктаў дапаможа мудрасць і памяркоўнасць. Праўда, па меркаванні зорак, вам наўрад ці ўдасца прымусіць сябе іх праявіць.

**ЛЕЎ.** Тыдзень будзе напоўнены рознымі падзеямі. Разлічвайце толькі на свае сілы, бо староннія разам з дапамогай могуць зрабіць «мядзведжую паслугу», якую потым цяжка будзе выправіць. На панядзелак можаце планаваць самыя розныя справы — ваш энергетычны патэнцыял будзе на высокім узроўні. У чацвер парадуюць пазітыўныя падзеі.

**ДЗЕВА.** Спрыяльна пройдуць сустрэчы і нарады. Атрымаеце ўпэўненасць у заўтрашнім дні і неабходную дапамогу з боку сяброў і знаёмых. Асцерагайцеся канкурэнтаў. Будзьце больш уважлівымі — магчымыя невялікія грашовыя страты. Верагоднае мімалётнае, але прыемнае знаёмства. У пятніцу будуць рызыкоўнымі фінансавыя ўкладанні. Імпульсіўнасць і ўпартасць могуць пасварыць з блізкімі людзьмі.

**ШАЛІ.** Можаце захапіцца ўспамінамі. Не варта паддавацца настрою і дазваляць мінуламу станавіцца тормазам прасоўванню наперад. Не саромейцеся выкарыстоўваць прывабнасць — яна адыграе не апошнюю ролю ў дасягненні поспеху. У сярэдзіне тыдня верагодна нечаканая праверка: загадзя падрыхтуйцеся да яе, бо вас не павінны заспець знянацку.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень спрыяльны для рэалізацыі творчых планаў і праектаў, якія заснаваны на энтузіязме. Займацца дакладнымі разлікамі не варта — будзеце схільны не заўважаць дробязяў, даволі важных, але на ваш погляд вельмі нудных, каб марнаваць на іх час. Магчымая ўдалая паездка, якая ўмацуе матэрыяльнае становішча. Абыходзьце бокам слізкія і авантурныя прапановы, калі хочаце пазбегнуць страт і расчаравання.

**СТРАЛЕЦ.** Могуць адкрыцца новыя магчымасці, а гэта, у сваю чаргу, спрыяльна для розных пачынанняў, заключэння здзелак і наладжвання неабходных і карысных кантактаў. У пятніцу скіньце з плячэй цяжар адказнасці, дадайце легкадумнасці і бесклапотнасці ў свае дзеянні, старайцеся больш кантактаваць і не звяртайце ўвагі на нязначныя праблемы. У пачатку тыдня магчымыя ашаламляльныя сустрэчы.

**КАЗЯРОГ.** У першай палове тыдня давядзецца спраўляцца са справай, якая пад сілу толькі вам. Шкада, бо няма ніякага шанцу перакласці гэту работу на чые-небудзь плечы. Усе непрыемнасці могуць прыйсці ад выпадковых знаёмых і ад нястрыманасці на язык. А закончыцца гэта можа не вельмі натхняльным кантактам з афіцыйнымі асобамі. Будзьце больш асцярожнымі з тым, што не павінна трапляцца на вочы навакольным.

**ВАДАЛЕЙ.** Стаўцеся да ўсяго прасцей і спакайней. Не бярыце на сябе вырашэнне ўсіх задач, якія так ці інакш перад вамі ўзнікаюць. Мары ажыццявяцца ў той момант, калі вы стоміцеся спадзявацца на цуд. Плануйце дзеянні да дробязяў — гэта дапаможа пазбегнуць непажаданых сітуацый. Падзеі серады могуць зрабіць значны ўплыў на найбліжэйшую будучыню.

**РЫБЫ.** Паспрабуйце сябе ў чымсьці новым, незнаёмым для вас, але нічога не кажыце іншым, пакуль цалкам не ўпэўніцеся ва ўласных сілах. Прыслухайцеся да заўвагаў і парадаў калег і сяброў, пастарайцеся выдзеліць галоўныя і прымяніце іх у сваёй працы. Неабходна шліфаваць свой прафесіяналізм — на лаўрах спачываць пакуль ранавата.

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (6 кастрычніка).** **Па гарызанталі:** Тэкстыль. Абоі. Клон. Лад. Шаль. Сасна. Клён. Яхта. Кіл. Талер. Раксана. Паз. Май. Прас. Навала. Дакар. Пястрак. Даяр. Гарбуз. Рана. Жако. Жакан. Шаша. Тратыл. Лука. Спонсар. Канцэрт. **Па вертыкалі:** Каленкор. Рада. Вёска. Ваяж. Акра. Капэла. Каштан. Афіна. Арго. Трал. Лаза. Шкала. Боль. Вярба. Тур. Крона. Штык. Дах. Пуга. Лак. Вяз. Сатрап. Рэтра. Салома. Рак. Астана. Бяроза. Рой. Кантракт.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

## Замест лекаў — прадукты

**Калі мы хварэем, зусім не абавязкова, ды і шкодна глытаць таблеткі цэлымі жменямі. Істотна сабе дапамагчы можна дзякуючы карысным прадуктам. Так вы засцеражаце сябе ад пабочнага дзеяння лекавых прэпаратаў. Якія ж прадукты могуць замяніць лякарствы?**



**СЛАБАЕ СЭРЦА**

Каб скараціць прыём таблетак, паспрабуйце ўключыць у свой рацыён бабовыя. Фасоля, гарох, сачавіца выводзяць з арганізма халестэрын. А лішак халестэрыну, як вядома, прыводзіць да інфарктаў. А каб пазбегнуць газаўтварэння, дыетолагі рэкамендуюць стравы з бабовых есці з часнаком.

Карысныя ў гэтым выпадку і буракі. Яны багатыя на мінералы, якія эфектыўна змагаюцца з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі і добрыя пры гіпертанічнай хваробе. Лепш за ўсё есці буракі сырымі, а калі гатаваць, то ў духоўцы, каб максімальна захаваць карысныя рэчывы. Не прапускайце моманту з'есці хоць бы адзін зубок часнаку. Аліцын, што змяшчаецца ў ім, паляпшае капілярны кровазварот і засцерагае ад інсульту.

**ПРАБЛЕМЫ СА СТРАЎНІКАМ**

Звярніце ўвагу на авёс. Аўсяны адвар нармалізуе работу кішэчніка, стабілізуе стан хворых пры язве страўніка, пры гастрытах, калітах, атручэннях. Аўсяны кісель карысны пры нізкай кіслотнасці страўнікавага соку, вялым страваванні. Аўсянка дапамагае і пры дыябеце, бо паніжае ўзровень цукру ў крыві. Ёгурт — таксама ваша ежа. Малочныя бактэрыі паляпшаюць стравававанне, нармалізуюць кішэчную мікрафлору. Пастарайцеся часцей есці карычневы рыс. У адрозненне ад белага ён захоўвае ўсе карысныя рэчывы, і ў першую чаргу клятчатку, якая паляпшае работу ўсяго страўнікава-кішачнага тракта.

**АСТЭАПАРОЗ**

Пасля сарака гадоў усім жанчынам рэкамендуецца есці пячонку траскі. Яна багатая на вітамін Д, без якога ў касцях перастае ўтрымлівацца кальцый. Асабліва ўжываць пячонку траскі неабходна ўвосень і ўзімку, калі недахоп сонечнага святла не дазваляе арганізму самому выпрацоўваць гэты вітамін.

**ДЛЯ ДОЎГАГА ЖЫЦЦЯ**

Варта ўключаць у рацыён марскую капусту. У марскіх водарасцях змяшчаецца шмат хларафілу, які валодае антыканцэрагенным эфектам, вітаміну С і караціноідаў, што перашкаджаюць злаякаснаму перараджэнню клетак. Дадавайце таксама ў стравы льняны алей. Усяго 1 сталовая лыжка свежага льнянога алею на дзень можа паменшыць пухліну, якая ўтварылася, аднак пры тэрмічнай апрацоўцы льняны алей губляе свае каштоўныя ўласцівасці.

### ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

## Чорныя пачынаюць і выйграюць

**Гэта толькі ў шахматах белыя заўсёды наперадзе. У іншых сферах жыцця чорныя бяруць пераканаўчы рэванш.**

- **Чорны шакалад**, адзіны з усіх, змяшчае тэабрамін — алкалоід, які павялічвае выпрацоўку гармону радасці. У ім шмат магнію — прыроднага сродку ад стрэсу — і сератаніну, які павялічвае працягласць жыцця на 15 працэнтаў.
- **Чорны вінаград** афарбоўваюць раслінныя пігменты антацыяны. А яны ў сваю чаргу з'яўляюцца «кансервантамі» маладосці.
- **Цёмны мёд** змяшчае максімальную колькасць антыаксідантаў, якія актыўна дапамагаюць нам справіцца з лішкам халестэрыну, абараняючы сэрца і сасуды.
- **Цёмны (ці карычневы) нерафінаваны цукар** не зведвае глыбокай перапрацоўкі, таму і захоўвае карысныя рэчывы: медзь, жалеза, вітаміны, а таксама лепш засвойваецца арганізмам.

-2607-

### САКРЭТЫ ДОБРЫХ ГАСПАДЫНЬ

## Посуд: які для чаго?

**Каб стравы і напоі атрымліваліся смачнымі і карыснымі, выкарыстоўвайце для іх прыгатавання толькі прыдатны посуд.**

- Алюмініевыя каструлі можна выкарыстоўваць толькі для прыгатавання ежы, але не для яе захоўвання. У алюмініевым посудзе нельга гатаваць кіслыя стравы, напрыклад, кіслую капусту, боршч, кісель з кіслых ягад.
- Для кіпячэння малака трэба мець асобную каструлю, бо гарачае малако паглынае розныя пахі. Малако не прыгарыць, калі яго кіпяціць у каструлі, якую вы папярэдне апаласнулі халоднай вадой.
- Агародніну лепш за ўсё адварваць у эмаліраваным посудзе. А вось для гатавання каш ён не прыдатны, бо кашы ў ім прыгараюць.

***Эмаліраваны посуд з эмаллю, якая адкалолася, для прыгатавання ежы выкарыстоўваць нельга!***

- Значна эканоміць час прыгатавання ежы скараварка — пасудзіна з накрыўкай, якая зачыняецца герметычна. У ёй можна варыць, тушыць і гатаваць ежу на пары і пры гэтым захоўваць вітаміны, смак, колер і пах прадуктаў. Напрыклад, мяса ў звычайнай каструлі гатуецца 1—3 гадзіны, а ў скараварцы — 20—30 хвілін, бульба ў звычайнай каструлі гатуецца 20—30 хвілін, а ў скараварцы 5—8 хвілін.
- Хутка можна прыгатаваць ежу і ў пасудзіне з патоўшчаным дном, дыяметр якога павінен быць крыху меншы, чым акружнасць канфоркі газавай ці электрычнай пліты.
- Масла і сала нельга захоўваць у гліняным посудзе, бо гэтыя прадукты набываюць спецыфічны пах посуду.
- Квасіць невялікую колькасць прадуктаў (5—10 кг) можна ў шкляных, фаянсавых і керамічных ёмістасцях, а таксама ў эмаліраваных каструлях з непашкоджанай эмаллю.
- Кампот, пасля таго, як ён зварыцца, варта пераліць у фарфоравую пасудзіну, і добра было б пакласці ў яго лімон, парэзаны тонкімі скрылёчкамі.
- Для такіх салодкіх страў, як жэле і крэмы, лепш прымяняць металічныя формы з тонкімі сценкамі, пажадана з адтулінай у сярэдзіне ў выглядзе трубкі. Тады змесціва ў форме застывае раўней.
- Для мучных і гарачых салодкіх страў тыпу пудынгаў, наадварот, форма павінна мець тоўстыя сценкі і дно, каб ежа прапякалася больш раўнамерна.

### РАІМ ПРЫГАТАВАЦЬ

## Мядовы пах

**Колькі добрых слоў сказана пра ўласцівасці мёду! Хочацца чаго-небудзь салодкага — з'ешце лыжачку мёду. І прыемна, і карысна. А што, калі дадаць мёду ў якую-небудзь страву? Можа атрымацца вельмі смачна.**

**ГАРБУЗ, ЗАПЕЧАНЫ З МЁДАМ І АПЕЛЬСІНАВЫМ СОКАМ**

*3 невялікія гарбузы, 2 ст. лыжкі мёду, 4 ст. лыжкі апельсінавага соку, 1 ст. лыжка сметанковага масла, крыху мускатнага арэха ці кары.*

Разагрэйце духоўку да 180 градусаў. Гарбузы разрэжце напалам, выдаліце насенне. У глыбокую бляху пакладзіце палавінкі гарбузоў разрэзам уверх. У невялікай ёмістасці злучыце мёд і апельсінавы сок. У кожную палавінку гарбузоў пакладзіце па паўлыжкі сметанковага масла. Накрыйце бляху фольгай і гатуйце гарбузы 30 хвілін. Цяпер дастаньце мякаць гарбузоў і перамяшайце з мядовай сумессю. Раскладзіце атрыманае гарбузовае пюрэ ў палавінкі гарбузоў і пячыце яшчэ каля 10 хвілін.



-2608-

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.28 | 18.24 | 10.56 |
| Віцебск — | 7.19 | 18.12 | 10.53 |
| Магілёў — | 7.18 | 18.14 | 10.56 |
| Гомель — | 7.13 | 18.13 | 11.00 |
| Гродна — | 7.43 | 18.40 | 10.57 |
| Брэст — | 7.41 | 18.42 | 11.01 |

**Месяц**
***Апошняя квадра 11 кастрычніка. Месяц у сузор'і Рака.***

**Імяніны**
***Пр.*** *Дзмітрыя, Ігната, Марка, Пятра.*
***К.*** *Марыны, Паўліны, Францішка.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 10 кастрычніка

**Дзве даты**

**1794 год** — войска Тадэвуша Касцюшкі было разбіта каля мястэчка Мацяёвіца на правым беразе Віслы. Сам Касцюшка быў цяжка паранены ў баі і захоплены ў палон. Яго змясцілі ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Паўстанне ў ВКЛ і Польшчы ўзначаліў генерал Томаш Ваўжэцкі.



**1698 год** — у Маскве, каля Крамля, па загадзе Пятра І адначасова было пакарана каля 800 стральцоў — удзельнікаў мяцяжу (гэтая падзея адлюстравана на карціне В. Сурыкава «Раніца стралецкага пакарання смерцю»).

**Цытата дня:**

***«Вечна і ўсюды маўчаць — невялікая ў гэтым заслуга. Але грэх гаварыць тое, аб чым неабходна маўчаць».***
**Педра Кальдэрон (1600-1681), іспанскі драматург.**

# РЭГЛАМЕНТАЦЫІ НА ПРАЦЯГУ ПАМІНАЛЬНАГА ГОДА

Свет і сусвет чалавека

**Пасля смерці чалавека сям'я ўключалася ў функцыянальнае поле шматлікіх рэгламентацый паводзінаў, абмежаванняў і прадпісанняў, забаронаў, выключэнняў з агульна прынятых паўсядзённа-бытавых і рытуальна-абрадавых правілаў. Аб тым, што гэты год будзе абсалютна іншым для сям'і памерлага, сведчыць цэлы шэраг абмежаванняў і прадпісанняў:**

- У першыя тры дні пасля смерці чалавека не выносьце з хаты ніякіх рэчаў.
- На 9 дзень пасля смерці сваякі ідуць у храм, заказваюць жалобнае набажэнства, дома наладжваюць другі жалобны стол.
- На 40 дзень пасля смерці чалавека ладзяць трэці жалобны стол — «саракавіны», на якім прысутнічае сям'я памерлага, сваякі, блізкія, сябры, калегі па працы. У царкве заказваюць Саракауст — сорак літургій.
- З дня пахавання і да 40 дня, узгадваючы імя памерлага, мы павінны сказаць формулу-абярэг для сябе і ўсіх жывых. Адначасова тыя ж словы з'яўляюцца сімвалічным пажаданнем для памерлага: *«Зямля яму пухам»*. Тым самым мы выказваем пажаданне, каб душа яго апынулася на нябёсах.
- Пасля 40 дня і на працягу трох наступных гадоў мы павінны выказваць іншую формулу-абярэг, якая гучыць як пажаданне: *«Царства яму небеснае»*. Тым самым мы жадаем памерламу пасляcмяротнага жыцця ў раі.
- На працягу наступнага пасля смерці чалавека года ні адзін з членаў сям'і не мае маральнага права прымаць удзел у якой-небудзь святочнай урачыстасці.
- Смерць каго-небудзь з бацькоў маладых, а таксама смерць каго-небудзь з іншых іх сваякоў вымушала адкласці вяселле на наступны за памінальным год.
- На працягу года пасля смерці ўсё ў хаце, дзе жыў памерлы, застаецца ў стане спакою і пастаянства: нельга рабіць рамонт, перасоўваць мэблю, нічога нельга аддаваць ці прадаваць з рэчаў памерлага.
- На працягу памінальнага года і ўсіх наступных гадоў на могілкі можна наведвацца толькі па суботах (акрамя 9 і 40 дня пасля смерці і царкоўных святаў ушанавання продкаў, такіх, як Радаўніца ці Восеньскія Дзяды). Гэта прызнаны царквой дзень ушанавання продкаў.
- Дні асаблівага ўшанавання памерлых на працягу года: Мясапусная субота — субота на дзявятым тыдні перад Вялікаднем; Усяленская бацькоўская субота — субота на другім тыдні Вялікага посту; Усяленская бацькоўская субота — субота на трэцім тыдні Вялікага посту; Усяленская бацькоўская субота — субота на чацвёртым тыдні Вялікага посту; Радаўніца — аўторак на другім тыдні пасля Вялікадня; Траецкая субота — субота на сёмым тыдні пасля Вялікадня; Змітраўская субота — субота напярэдадні 8 лістапада. Міхайлаўская субота — субота напярэдадні 21 лістапада.
- Роўна праз год пасля смерці ў сям'і памерлага наладжваюць «угодкі» — чацвёрты, заключны жалобны сямейна-родавы стол. Неабходна памятаць, што жывых нельга загадзя віншаваць з днём нараджэння, а заключны жалобны стол нельга рабіць пазней: ці роўна праз год (дзень у дзень), ці раней (на 1-3 дні).

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**Калі ты такі сумленны, дык чаго ж у цябе такі твар задаволены?**

☺

Дзве сяброўкі.
— Я нядаўна 10 кілаграмаў лішняй вагі скінула!
— Як?!
— Дачка хадзіць навучылася...

☺

**А я рэальна зразумела, што здаць экзамен у ДАІ — гэта нішто, а вось здаць экзамен па ваджэнні мужу, каб ён дазволіў машыну браць — гэта праблема!**
**Другі месяц пакутую.**

☺

Два студэнты.
— Будзеш у мяне рэпетытарам?
— Тут трэба ўдакладніць адну важную рэч. Можна проста дапамагчы падвучыць англійскую, а быць рэпетытарам — значыць браць за гэта плату.
— Пельмені.
— Згодны.




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5569. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Правярайце паданочнік